Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

ЛіМ

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ISSN 0024-4686

№ 47 (4438) 23 лістапада 2007 г.

У нумары:

Спалучаючы традыцыі

Не толькі мы шануем кераміку, вырабы з гліны хвалююць і японцаў.

Стар. 2

Айчынныя замкі — тэрыторыя абароны

Нашы замкі — бясцэнныя каштоўнасці — чакаюць свайго аднаўлення.

Стар. 4

Спрыяць росквіту краіны

Вяртаецца добрая традыцыя — сустрэчы пісьменнікаў з людзьмі, чыя праца ўмацоўвае наш дабрабыт.

Стар. 5

Дзіця кіно

Паказ асобных дакументальных стужак, створаных рэжысёрам А. Алаем, суправаджаўся даўжэзнымі чэргамі каля кінатэатраў.

Стар. 10

Падтэкст і кантэкст

Ды, урэшце, як: «рускамоўная» ці «руская» літаратура Беларусі?

Стар. 14

ІДЗЕ ПАДПІСКА НА І ПАЎГОДДЗЕ 2008 г.

Для індывідуальных падпісчыкаў:	*Ведамасная падпіска:*
1 месяц — 6400 руб.	1 месяц — 8300 руб.
Падпісны індэкс — 63856	Падпісны індэкс — 638562

Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў: 1 месяц — 4400 руб. Падпісны індэкс — 63815

Льготная падпіска: 1 месяц — 6500 руб. Падпісны індэкс — 63880

ПАДПІСАЦЦА НА ШТОТЫДНЁВІК «ЛіМ» МОЖНА З ЛЮБОГА МЕСЯЦА

У падарунак — шыкоўныя выданні

Як ужо вядома чытачам газеты "Літаратура і мастацтва", падведзены вынікі конкурсу "Сусвет слова: ад газеты да энцыклапедыі" сярод Цэнтралізаваных бібліятэчных сістэм Беларусі на лепшую арганізацыю падпіскі на штотыднёвік у IV квартале бягучага года. Пераможцамі ў гэтым спаборніцтве сталі Лагойская, Валожынская і Шклоўская ЦБС.

І вось, на мінулым тыдні супрацоўнікі рэдакцыйна-выдавецкай установы "Літаратура і Мастацтва" выправіліся ў Лагойск, каб перадаць тамтэйшай цэнтральнай раённай бібліятэцы, якая заняла першае месца, збор кніг — 100 экземпляраў энцыклапедычных і навукова-папулярных выданняў, даведачнай і мастацкай літаратуры...

Спачатку сталічныя госці наведаліся ў Лагойскі райвыканкам, дзе ва ўрачыстай абстаноўцы, на пасяджэнні ідэалагічнага актыву раёна, дырэктар РВУ "Літаратура і Мастацтва" Алесь Карлюкевіч уручыў грамату дырэктару цэнтральнай раённай бібліятэкі Ірыне Лабэцкай. Алесь Мікалаевіч выказаў падзяку бібліятэкарам за актыўны ўдзел у конкурсе, а кіраўніцтву раёна — за фінансавую падтрымку ўстаноў культуры.

Алесь Карлюкевіч распавёў пра аўтараў, рубрыкі і публікацыі, якія змяшчаюцца ў выданнях установы — часопісах "Полымя", "Маладосць", "Нёман", "Всемирная литература". У сваім выступленні ён падрабязна акрэсліў значны сегмент дзейнасці РВУ — кнігавыдавецкую справу, азнаёміў прысутных з кнігамі, якія выйшлі, рыхтуюцца і запланаваныя да друку ва ўстанове "Літаратура і Мастацтва".

Галоўны рэдактар "ЛіМа" Анатоль Казлоў зазначыў, што на старонках тыднёвіка "Літаратура і мастацтва" друкаваліся ўсе беларускія пісьменнікі, пачынаючы ад Янкі Купалы і Якуба Коласа, юбілеі якіх сёлета шырока адзначаюцца па ўсёй Беларусі. У сваю чаргу рэдакцыяй штотыднёвіка былі падрыхтаваныя тэматычныя нумары да дня народзін песняроў. А. Казлоў таксама павіншаваў пераможцаў і акцэнтаваў іх увагу на тым, што пачалася падпіска на тыднёвік "ЛіМ" на першае паўгоддзе 2008 года. І рэдакцыя газеты зноў-такі працягвае конкурс "Сусвет слова: ад газеты да энцыклапедыі" сярод Цэнтралізаваных бібліятэчных сістэм нашай краіны на лепшую арганізацыю падпіскі на газету творчай інтэлігенцыі Беларусі. Анатоль Казлоў шчыра зазначыў, што не здзівіцца, калі сярод пераможцаў наступнага года зноў апынецца Лагойская ЦБС.

Іван Магер, старшыня Лагойскага райвыканкама, распавёў гасцям пра некаторыя значныя падзеі з культурнага жыцця раёна. Пасля ў зацікаўленай размове, да якой далучыліся Ніна Пятроўская, начальнік аддзела культуры, і Яўгенія Арашкевіч, начальнік аддзела ідэалагічнай работы Лагойскага райвыканкама, прагучала прапанова, што з дапамогай РВУ "Літаратура і Мастацтва" было б няблага выдаць кнігу, прысвечаную роду Тышкевічаў, у прыватнасці знакамітым братам Канстанціну і Яўстафію Тышкевічам, якія ў 1842 годзе адкрылі ў Лагойску першы ў Беларусі гісторыка-археалагічны музей...

(Пачатак. Заканчэнне на стар 2.)

Спалучаючы традыцыі

У Нацыянальным мастацкім музеі нашай краіны адкрылася выстаўка сучаснай японскай керамікі, прымеркаваная да 15-годдзя ўсталявання дыпламатычных адносін паміж Беларуссю і Японіяй.

Выконваючы абавязкі Часовага Паверанага ў справах Японіі ў Рэспубліцы Беларусь Набуюкі Фукуда выказаў словы ўдзячнасці ўсім, дзякуючы каму стала магчымым правядзенне гэтай выстаўкі, і ў першую чаргу дырэктару Нацыянальнага мастацкага музея Уладзіміру Пракапцову. Спадар Фукуда адзначыў, што народы Беларусі і Японіі ганарацца культурай сваіх краін. Японія вельмі спачувае Беларусі, якая пацярпела ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС, як пацярпелі падчас Другой сусветнай вайны Хірасіма і Нагасакі. Прадстаўнік пасольства зазначыў, што дадзеная выстаўка дапаможа беларусам глыбей азнаёміцца з Японіяй.

Намеснік міністра культуры Валерый Гедройц у сваю чаргу выказаў удзячнасць Пасольству Японіі, якое вельмі актыўна супрацоўнічае з нашымі ўстановамі культуры.

Цяперашняя выстаўка стала лагічным працягам выстаўкі сучаснай японскай керамікі, якая ладзілася ў Нацыянальным мастацкім музеі тры гады таму. На той раз экспанаваліся работы майстроў, якія працуюць у рэчышчы традыцыйнага мастацтва. Дадзеная ж экспазіцыя знаёміць з авангардным кірункам у японскім мастацтве керамікі.

Куратар выстаўкі навуковы супрацоўнік аддзела замежнага мастацтва музея Наталля Шчукіна падкрэсліла, што аснову экспазіцыі складаюць работы мастакоў трох пакаленняў, якія прадаўжаюць традыцыі старэйшага пакалення майстроў з Кіёта — групы "Sodeisha". У асноўным гэта пасляваенныя мастакі, якія шукалі свой асабісты шлях, сваю ідэю ў мастацтве ды магчымасці самавыяўлення. У процівагу параднай, палацавай японскай кераміцы яны прадстаўлялі работы абстрактныя па форме і часцей неглазураваныя. Пакаленне ж больш маладых майстроў вышуквае новыя выразныя формы керамікі, якія дапамагаюць ствараць не толькі такія побытавыя рэчы, як чашка ці талерка, але і творы "высокага" мастацтва.

Стопрацэнтна ўсходняй выстаўку назваць немагчыма, таму што шмат керамістаў так ці іначай звязаныя з еўрапейскім мастацтвам, многія з іх навучаліся і працавалі ў ЗША. У некаторых працах прагледжваецца заходні падыход да формы, але застаецца японскі падыход да матэрыялу — павага самога матэрыялу. Так, японскія майстры ідуць да формы ад матэрыялу, ад яго пластыкі і асаблівасцей, а не наадварот.

У экспазіцыі — 42 работы 28 майстроў другой паловы мінулага стагоддзя: абстрактныя і фігуратыўныя кампазіцыі, геаметрычныя фігуры. Прысутнічае і чарнобыльская тэма: чатыры работы Койэ Родзі, аб'яднаныя ў "Белы аб'ект". А побач, незнарок ці наўмысна, месяцца "Старая Біблія" і сімвалічная "Біблія ў пяску" Аракі Такако, разгорнутая на Евангеллі ад Мацвея.

Ідэя "японскага" густу ўвасобілася ў "Знаёмстве з японскім стылем 3" Накамура Кімпэй і ў "Перасякаючы вецер" Янагіхара Муцуо. Сярод авангардных рэчаў ёсць работы больш звыклыя вачам простага абываеля, дзе, так бы мовіць, назва адпавядае форме, але гэта ніяк ні адбіваецца на майстэрстве выканання: "Талерка" і "Таз" Ёсікава Масамічы, у нечым сугучныя "Праца 75 — 16" Морыно Хіроакі і "Клятчастая квадратная ваза" Міясіта Дзэндзі.

Выштукаваная з японскай акуратнасцю глазураваная работа "Выстаўляючы мары ў рад" — аўтар Міянага Тодзан III — у пяшчотна бірузовым колеры вельмі дакладна акрэслівае назву. Другі яго твор "Сцяна на раздарожжы" выкананы ў такой жа колеравай гаме, але ў гэтым "раздарожжы" адчуваецца аптымістычны настрой.

Прыцягвае ўвагу адмысловы "Чайнік" Накамуры Кімпэй, "Сонечнае зацьменне" Міва Росаку, дзівосная "Любоў" Хаямі Сіро...

• Пабываўшы ў Францыі і Латвіі, у Беларусь выстаўка прывезена з Чэхіі (пасля Мінска экспазіцыя на два тыдні паедзе ў Гродзенскіх прыхільнікаў японскай творчасці). А з нашай краіны выправіцца ў Харватыю.

Сярод арганізатараў выстаўкі ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі — сама ўстанова, Японскі фонд, МЗС Японіі, Міністэрства культуры Беларусі і Пасольства Японіі ў нашай краіне. Трэба адзначыць, што Японскім фондам сфарміравана 20 выставак самага рознага кірунку. Яны вандруюць па ўсім свеце, прапагандуючы японскае мастацтва. Падчас прэс-канферэнцыі прагучала слушная думка, што было б нядрэнным стварыць падобны фонд у Беларусі і прапагандаваць культурныя набыткі нашай краіны.

• Скарыстаўшы добрую нагоду, карэспандэнт "ЛіМа" задаў некалькі пытанняў выконваючаму абавязкі Часовага Паверанага ў справах Японіі ў Рэспубліцы Беларусь Набуюкі Фукуда.

— Якія культурныя мерапрыемствы з японскага боку чакаць у бліжэйшы час?

— У бліжэйшы час плануецца правядзенне фестывалю японскіх фільмаў, а таксама іншых выставак. Спадзяёмся, што ў гэтым плане культурнае супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі будзе пашырацца.

— Можа, акрамя Мінска, і іншым гарадам Беларусі пашчасціць прыняць у сябе выстаўкі?

— Будзем імкнуцца праводзіць нашы мерапрыемствы не толькі ў Мінску, але і ў іншых гарадах вашай краіны. Прыкладам, у Магілёве адбыўся канцэрт японскага музычнага ансамбля "Хінокі-я", у Шклове і іншых населеных пунктах Беларусі ладзіліся выстаўкі японскай культуры.

— Ці плануецца правядзенне выставак або вечарын, прысвечаных японскай літаратуры?

— На сёння не існуе ў планах няма. Але таксама не існуе нічога немагчымага. Спадзяюся, і гэты кірунак дзейнасці можна будзе адлюстраваць у бліжэйшай будучыні.

Віктар КАВАЛЁЎ

Фота Кастуся Дробава

У падарунак — шыкоўныя выданні

(Заканчэнне. Пачатак на стар 1.)

Пасля прадстаўнікі рэдакцыйна-выдавецкай установы наведаліся ў Лагойскую цэнтральную раённую бібліятэку, якая месціцца ў дыхтоўным Цэнтры культуры. Гаспадыня бібліятэкі Ірына Лабэцкая правяла невялічкую экскурсію па ўстанове: паказала гасцям утульную чытальную залу, абанемент і сховішча, фонды якіх налічваюць больш як пяцьдзесят тысяч асобнікаў, цэнтр прававой інфармацыі з юрыдычнай літаратурай і электронным банкам дадзеных, дзе штомесяц праходзяць юрыдычныя кансультацыі...

Госці знаёміліся з бібліятэкай, супрацоўнікі, у сваю чаргу, — з прывезенымі кнігамі. Усе былі ў захапленні. Ірына Лабэцкая зазначыла, што зараз існуюць пэўныя фінансавыя цяжкасці з набыццём новай літаратуры і папаўненнем кніжных фондаў. А тут, у падораным зборы, — шыкоўныя энцыклапедыі і даведнікі, адметныя навукова-папулярныя выданні, падручнікі і мастацкая літаратура. Ірына Міхайлаўна і супрацоўнікі бібліятэкі былі вельмі ўдзячныя і запэўнілі прадстаўнікоў РВУ "Літаратура і Мастацтва", што з задавальненнем прадоўжаць свой удзел у новым конкурсе, бо вынік — атрыманыя выданні — значна перасягае тыя сродкі, якія выдаткоўваюцца на падпіску.

Віктар КАВАЛЁЎ

На здымках: Ірына Лабэцкая, дырэктар Лагойскай ЦБС — пераможцы конкурсу на лепшую арганізацыю падпіскі ў IV квартале на тыднёвік "ЛіМ" (стар.1); на сустрэчы са старшынёй Лагойскага райвыканкама І. Магерам.

Фота аўтара

Яшчэ раз пра «100 беларускіх паэтаў. XX век»

Пра гэтую своеасаблівую анталогію, складзеную паэтам і навукоўцам Віктарам Ярацам, у свой час шмат пісалі і гаварылі. Яна адразу займела шырокі розгалас, як толькі была апублікавана ў часопісе "Маладосць" за 2001 год.

Час не стаіць на месцы — усё знаходзіцца ў няспынным руху... З улікам гэтага рэдакцыя "Маладосці" звярнулася да Віктара Яраца з пытаннем: "Ці застаецца яго "Анталогія" нязменнай" — прайшло сем гадоў! І атрымала адказ у форме грунтоўнага і цікавага артыкула з новай рэдакцыяй "100 беларускіх паэтаў. XX век", дзе, хоць і невялікія, але ёсць свае карэкціроўкі.

Гэты артыкул з Анталогіяй "100 беларускіх паэтаў..." будзе друкавацца ў першым нумары "Маладосці" за 2008 год. Ён, несумненна, выкліча вялікую цікавасць не толькі ў пісьменніцкім асяродку, але і ў настаўнікаў ды шырокім коле чытачоў, хто любіць беларускую паэзію.

"Ці адбылася спрэчка?" — назваў свой артыкул Віктар Ярац. Адказам на гэтае пытанне можа стаць шырокая, зацікаўленая размова пра Паэтаў і нашу беларускую Паэзію, якая заўжды на ўздыме!..

Ад рэдакцыі "Маладосці"

Пад адной вокладкай

Даўняе сяброўства звязвае пісьменнікаў трох суседніх абласцей — Гомельскай, Бранскай і Чарнігаўскай. Нярэдка ладзілі яны сумесна літаратурныя святы. Сустракаліся літаратары трох братніх народаў і на старонках калектыўных зборнікаў. Як вось і на гэты раз. Дзякуючы адміністрацыі Чарнігаўскай вобласці і нязменнаму старшыні абласной арганізацыі Нацыянальнага саюза пісьменнікаў Украіны Станіславу Рэп'яху, нядаўна пабачыла свет на ўкраінскай мове кніга "Рукостискання". У ёй пад адной вокладкай сабраныя лепшыя творы пісьменнікаў трох абласцей.

Васіль ТКАЧОЎ

АБСЯГІ

Увосень — клопатаў восем!

Гомель. У спецыялізаванай славянскай бібліятэцы адбылося пасяджэнне школы-студыі маладых літаратараў, якім кіруе паэтэса Ніна Шклярава. На мерапрыемстве, якое вяла Лідзія Возісава, з прамовамі выступілі Васіль Ткачоў і Міхась Болсун. Гомельскія творцы шчыра распавядалі пра сваю дзейнасць і вынеслі на суд слухачоў новыя літаратурныя набыткі.

Старшыня Гомельскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Уладзімір Гаўрыловіч параіў студыйцам ствараць на пісьменніцкай ніве толькі ёмкія вобразы, шукаць свой стыль і старанна шліфаваць майстэрства. Уладзімір Мікалаевіч пазнаёміў прысутных з новым калектыўным зборнікам "Натхненне", дзе пад адной вокладкай змешчаны творы членаў СПБ і пераможцаў літконкурсу імя Кірылы Тураўскага. Такія зборнікі плануецца выпускаць штогод.

Пасля старшыня абласнога аддзялення пісьменнікаў павіншаваў з залатым юбілеем паэта і журналіста Міколу Ждановіча. Юбіляра таксама віталі маладыя літаратары з Добруша, дзе той у свой час працаваў галоўным рэдактарам газеты "Добрушскі край".

Ганна АТРОШЧАНКА

Краявіды Прынямоння

Ліда. Прадстаўнічая група з райцэнтра прыемна ўразіла гродзенцаў. І сапраўды, было чаму здзіўляцца. На адкрыццё выстаўкі вядомага мастака з Ліды Рычарда Грушы ў абласны цэнтр прыехалі яго сябры з літаб'яднання "Суквецце", што працуе пры "Лідскай газеце", і артысты народнага тэатра музыкі "Ліда-мюзікл". А яшчэ землякоў-лідчан падтрымаў кампазітар з Астраўца Аляксандр Якіменка, выхаванец Лідскага музвучылішча. Таму не сакрэт, што ўрачыстае адкрыццё выстаўкі ў абласной бібліятэцы імя Карскага атрымалася цікавым і змястоўным.

У ходзе мерапрыемства гаварылася пра самабытны талент майстра з Ліды, які вядомы як здольны мастак-скульптар і паэт. Выконваліся вершы Р. Грушы і напісаныя на яго словы песні. Непадробную цікавасць прысутных выклікалі карціны творцы (экспанавалася 52 работы), напісаныя ў бягучым годзе і аб'яднаныя агульнай тэмай "Краявіды роднага Прынямоння".

Добрыя пажаданні і цёплыя словы пра творчасць Рычарда Грушы выказалі начальнік управлення культуры аблвыканкама А. Лойка, консул Польшчы ў Гродне М. Малюхніц, лідскі паэт М. Мельнік, кіраўнік таварыства польскіх мастакоў пры Саюзе палякаў Беларусі С. Кічко і інш.

Алесь ЖАЛКОЎСКІ

Дапамога... з Люксембурга

Дзятлава. Нядаўна скаўцкая група з Люксембурга наведала мясцовы цэнтр карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі. Яе кіраўнік спадарыня Мадлен уручыла педкалектыву гэтай установы ключы ад спецыялізаванага аўтобуса, а дзецям — памятныя падарункі і ласункі.

Замежным гасцям вельмі ўдзячныя педагогі, выхаванцы і іх бацькі. Бо спецаўтобус, аналага якому няма на Гродзеншчыне, абсталяваны пад'ёмнікамі і рамянямі, зробіць магчымым аказваць дапамогу большай колькасці дзяцей з асаблівасцямі развіцця. Прыкладам, прывозіць на заняткі лячэбнай фізкультурай і для масажу інвалідаў-калясачнікаў.

Дабрачынная арганізацыя "Скаўты з Люксембурга і іх сябры" супрацоўнічае з Дзятлавам ужо 15 год. Спачатку яна курыравала мясцовую школу-інтэрнат, потым наладзіліся сувязі з раённай бальніцай, а цяпер — і з цэнтрам карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі.

Іосіф ЗАЯЦ

У сусветным кантэксце

На філалагічным факультэце Белдзяржуніверсітэта па ініцыятыве кафедры беларускай літаратуры і культуры адбылася VIII Міжнародная навуковая канферэнцыя "Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай", прысвечаная 125-годдзю Янкі Купалы і Якуба Коласа.

Сёння ў культурнай прасторы Беларусі востра агульнанацыянальнае значэнне набывае вяртанне гістарычнай духоўнай спадчыны ў шырокім разуменні гэтай праблемы. Адкрываючы канферэнцыю, загадчык кафедры беларускай літаратуры і культуры прафесар Т. Шамякіна падкрэсліла, што творчасць Янкі Купалы і Якуба Коласа заўсёды была арыентавана на трывалыя духоўныя асновы нацыянальна-сутнаснага існавання беларускага народа. Іх творчасць, адзначыла яна, адпавядае самім глыбінным задачам сённяшняга светаадчування і таму з'яўляецца важнейшай традыцыйнай апорай сучаснай літаратуры і культуры ў цэлым.

З прывітальным словам да гасцей і ўдзельнікаў канферэнцыі звярнуліся прарэктар БДУ, доктар эканамічных навук, прафесар У. Клюня, дэкан філалагічнага факультэта БДУ, доктар філалагічных навук, прафесар І. Роўда, намеснік дэкана філалагічнага факультэта, кандыдат філалагічных навук, дацэнт П. Навойчык, загадчык кафедры славянскіх літаратур філалагічнага факультэта БДУ, доктар філалагічных навук, прафесар, пісьменнік І. Чарота ды іншыя.

У сваіх выступленнях вядучыя навукоўцы звярнуліся да пытання фенаменальнасці беларускай літаратуры, якая за адносна кароткі тэрмін стала ўпоравень з перадавымі літаратурамі свету. На праблемах узаемадачыненняў старабеларускай літаратуры са славянскім светам у дакладзе "Славянская гісторыя і культура ў старабеларускай літаратуры" спыніў увагу удзельнікаў канферэнцыі кандыдат філалагічных навук, дацэнт У. Кароткі. Доктар філалагічных навук, прафесар Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта М. Мішчанчук звярнуўся да творчасці Янкі Купалы, на аснове новых падыходаў у літаратуразнаўстве прааналізаваў зборнік вершаў класіка беларускай літаратуры "Спадчына" як мастацкае цэлае.

Удзельнікі міжнароднай навуковай канферэнцыі наведалі кабінет-музей беларускай культуры, музей філалагічнага факультэта, усклалі кветкі да помнікаў Янку Купалу і Якубу Коласу. У рамках канферэнцыі адбыўся прагляд дакументальнай стужкі "Спадчына", прысвечанай 125-годдзю з дня нараджэння Песняроў.

Таццяна БЕЛЬСКАЯ

На здымку: удзельнікі канферэнцыі.

Заслужаны… «Апалон»

Заслужаных аматарскіх калектываў у нашай краіне паболела. Не так даўно за творчыя дасягненні ў развіцці аматарскай мастацкай творчасці, папулярызацыю нацыянальных культурных традыцый, высокае выканальніцкае майстэрства і актыўную выставачную дзейнасць Міністэрства культуры Беларусі надало званне "Заслужаны аматарскі калектыў" народнай дзіцяча-юнацкай студыі выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва "Апалон" Дома культуры г. Ляхавічы Брэсцкай вобласці.

Заснавальнікам і нязменным кіраўніком студыі з'яўляецца Віктар Чарнавокі, мастак-педагог вышэйшай катэгорыі, магістр педагагічных навук, "берасцейская зорка". За 17 год існавання гэтай установы да яе спрычынілася больш як 500 дзяцей. Студыйцы з'яўляюцца актыўнымі ўдзельнікамі і неаднаразовымі пераможцамі самых прэстыжных міжнародных выстаў і конкурсаў, геаграфія якіх па-сапраўднаму шырокая: 44 краіны Еўропы, Азіі, Амерыкі, Афрыкі.

У 2004 — 2005 гадах студыя "Апалон" пры падтрымцы Ляхавіцкага райвыканкама па праекце Віктара Чарнавокага арганізавала і паспяхова правяла I Міжнародны конкурс "Зямля і людзі: учора, сёння, заўтра". У 2006 годзе распрацаваны праект II Міжнароднага конкурсу, і ўжо аб'яўлена пра яго правядзенне. Вынікі будуць падведзены ў 2008-м годзе. Запланаваны і выпуск каталога пераможцаў. Увогуле да ўдзелу запрошаны 123 дзяржавы ўсіх кантынентаў.

Трэба адзначыць, што юных майстроў — выхаванцаў Віктара Францавіча — на творчасць натхняе гістарычная спадчына Ляхаўшчыны, якая знаходзіць сваё ўвасабленне ў трапяткіх работах з выявамі цэркваў, гістарычных помнікаў і старажытных мясцін. А побач раскрываецца свет фантазіі і летуценняў, што хвалюе дзіцячыя сэрцы. Знаходзіцца месца і стыхіі колеру, што, аднак, падпарадкавана дзіцячаму філасофскаму роздуму.

Безумоўна, пераацаніць творчую і навучальна-выхаваўчую дзейнасць Віктара Францавіча і яго студыі немагчыма. Наперадзе яшчэ шмат праектаў і задумак. Але галоўная высакародная мэта адна — развіваць у маладых душах гармонію з самім сабою і з навакольным светам.

Аксана КЛУНІНА,
вядучы метадыст
па рэпертуарна-выдавецкай
дзейнасці Брэсцкага абласнога
грамадска-культурнага цэнтра

Вачыма юных мастакоў

Падышоў да заканчэння рэспубліканскі тур беларуска-расійскага фестывалю юных мастакоў "Мая зямля", прысвечанага 125-годдзю з дня нараджэння народных паэтаў Беларусі Янкі Купалы і Якуба Коласа.

Тэматычная выстава, што ўвайшла ў міжнародны культурны праект "Свет без межаў", стала вынікам ініцыятывы Ігара Моціна, дырэктара Грамадскага аб'яднання "Радуга", аўтара і кіраўніка праекта, пры падтрымцы Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы, Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа, Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры, рэспубліканскіх грамадскіх арганізацый "Беларуская асацыяцыя клубаў ЮНЕСКА", "Беларускі фонд міру" і інш.

З 600 прац, прадстаўленых у арганізацыйны камітэт фестывалю пасля праведзеных рэгіянальных адборачных тураў, было адабрана 52 самыя лепшыя, якія ўвайшлі ў экспазіцыю "Мая зямля". За актыўны ўдзел адзначана 10 творчых калектываў Рэспублікі Беларусь. Ацэньвала працы на арыгінальнасць выканання, індывідуальнасць ідэі, выразнасць мастацкага пісьма журы ў складзе вядучых спецыялістаў музеяў, устаноў культуры і мастацтва, грамадскіх асоб, студэнтаў мастацкіх ВНУ на чале з М. Апіокам, членам Беларускага саюза мастакоў, заслужаным дзеячам мастацтваў Рэспублікі Беларусь, лаўрэатам прэміі Міністэрства абароны ў галіне культуры і мастацтва.

З чэрвеня па лістапад 2007 года выстава "Мая зямля" экспанавалася ў г. Бабруйску ў межах міжнароднага фестывалю мастацтваў "Вянок сяброўства". На VI Маскоўскім міжнародным маладзёжным конкурсе-фестывалі "Сонца свеціць усім", прысвечаным 860-годдзю горада, калекцыя атрымала другое месца сярод краін СНД у намінацыі "Юныя і маладыя мастакі". У лістападзе-снежні 2007 і студзені-сакавіку 2008-га з выставаю плануецца наведаць Мінск, Маскву і рэгіёны Беларусі ды Расіі.

Па словах І. Моціна, дзіцячыя малюнкі выклікалі вялікую цікавасць у наведвальнікаў. Прычым, для многіх у Расіі выстава "Мая зямля" стала сапраўдным адкрыццём класікаў беларускай літаратуры. Падчас экспазіцыі яны маглі пачуць цікавыя расповеды пра пісьменнікаў-юбіляраў, іх біяграфію, творчасць — пра тое, што адлюстроўваюць менавіта юныя мастакі.

Дасягненні выставы, актуальныя пытанні яе існавання і планы на будучыню былі абмеркаваныя на пасяджэнні аргкамітэта фестывалю, якое адбылося ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа. Членаў аргкамітэта цікавіла арганізацыя выніковай конкурснай выставы "Мая зямля" ў Мінску, якая адбудзецца на працягу другой паловы лістапада — першай паловы снежня ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры, і ўзнагароджанне пераможцаў напрыканцы года.

Дарэчы, грамадскае аб'яднанне "Радуга" — ініцыятар і арганізатар конкурсу — за ўласныя сродкі выпусціла ў свет відэакаталог "Мая зямля" з малюнкамі дыпламантаў конкурсу. Адзін з экземпляраў каталога будзе перададзены на захаванне сям'і Якуба Коласа.

Ганна КОТ

КОНКУРС

Да ўвагі кіраўнікоў Цэнтралізаваных бібліятэчных сістэм

Рэдакцыя тыднёвіка "Літаратура і мастацтва" працягвае конкурс "СУСВЕТ СЛОВА: ад газеты да энцыклапедыі" для Цэнтралізаваных бібліятэчных сістэм Рэспублікі Беларусь (ЦБС). Пераможцы будуць вызначацца паводле вынікаў падпіскі на "ЛіМ" на I паўгоддзе 2008 г. пасля 25 снежня бягучага года.

ЦБС — удзельнікі конкурсу, чые падпісныя кампаніі будуць найбольш плённымі, атрымаюць унікальныя зборы кніг, што ўключаюць прызначаную для рознаўзроставай аўдыторыі энцыклапедычную, даведачную, навукова-папулярную, ілюстрацыйна-дыдактычную і інш. літаратуру, выпуск якой ажыццяўляецца расійскімі і беларускімі выдавецтвамі.

У залежнасці ад вынікаў падпісной кампаніі пераможцы атрымаюць кнігазбор, які ўключае:

— для I месца —100 кніжных адзінак;
— для II месца — 70 кніжных адзінак;
— для III месца — 50 кніжных адзінак.

Запрашаем да ўдзелу ў конкурсе Цэнтралізаваныя бібліятэчныя сістэмы ўсёй Беларусі, з разлікам на зацікаўленасць не толькі бібліятэкараў, але і настаўнікаў, пісьменнікаў, навукоўцаў, вучняў, выкладчыкаў, студэнтаў, даўніх і новых прыхільнікаў тыднёвіка — усіх тых, хто рушыў ці толькі мяркуе разам з "ЛіМам" выправіцца ў вандроўку па бязмежным ды чароўна-непрадказальным сусвеце Слова.

●

Між тым, падведзены вынікі конкурсу сярод ЦБС краіны на лепшую арганізацыю падпіскі на газету творчай інтэлігенцыі Беларусі ў IV квартале 2007 г. Пераможцамі ў даволі няпростым спаборніцтве сталі ЦБС* Лагойскага, Валожынскага і Шклоўскага *раёнаў, якія ў гэтым месяцы атрымаюць ад рэдакцыі тыднёвіка зборы кніг навукова-папулярнай, мастацкай, даведачнай і інш. літаратуры.

"ЛіМ" шчыра віншуе пераможцаў, зычыць усім супрацоўнікам ЦБС рэспублікі прафесійнага ды жыццёвага натхнення, а таксама — новых перамог!

Вынікі летняй практыкі

У Маладзечанскай музычнай вучэльні імя Агінскага адкрылася выстаўка твораў летняй вучэбнай практыкі навучэнцаў аддзялення дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Практыкай, галоўнай задачай якой было ўбачыць у прыродзе вечнасць і зменлівасць адначасова і адлюстраваць яе, кіраваў вядомы ў горадзе мастак Генадзь Селядзец.

У выніку ў творах навучэнцаў адбіліся такія прыгожыя мясціны, як Гродна, Вязынка, Ракуцёўшчына... Таксама вучні працавалі ў Мінскім абласным краязнаўчым музеі горада Маладзечна, збіраючы матэрыял для пяці асноўных вучэбных тэм: "Чалавек", "Краявіды", "Расліны", "Птушкі", "Жывёлы". Усе прадстаўленыя работы вылучаюцца непаўторнасцю, яркасцю адметных вобразаў.

Яшчэ адзін народны

Званне "народнага" нададзена маладзёжнаму музычнаму тэатру, які існуе пры гарадской музычнай вучэльні імя Агінскага.

Гэты тэатр узнік у 2006 годзе па ініцыятыве дырэктара навучальнай установы, заслужанага дзеяча культуры Беларусі Рыгора Сарокі. У красавіку бягучага года адбылася прэм'ера оперы "Іяланта", якую паставіў маладзёжны музычны тэатр.

Такім чынам, колькасць народных калектываў на Маладзечаншчыне павялічылася за кошт гэтай прынцыпова новай маладзёжнай структуры.

Марта ЮРГЕВІЧ

«Восеньская ўсмешка»

Так называлася ўрачыстае мерапрыемства, якое прайшло ў Маладзечанскім Палацы культуры. Тут адбыўся канцэрт народнага клубнага аб'яднання ветэранаў вайны і працы "Адпачынак". Былі таксама госці з Мінска — клубныя аб'яднанні ветэранаў.

Канцэртная праграма вылучалася разнастайнасцю: эстрадныя песні, рамансы, фальклор... Асабліва вызначыліся сваімі вакальнымі дадзенымі прадстаўнікі ўкраінскай дыяспары Пётр Лысакабылка ды Іван Чарненка.

Юлія МОНІД

Адзначаныя медалямі

У ліку тых, каго Прэзідэнт Беларусі адзначыў нядаўна высокімі дзяржаўнымі ўзнагародамі, ёсць і прадстаўнікі сферы культуры.

Імёны гэтых людзей ведае ўся краіна, таму прадстаўляць іх нашаму чытачу няма патрэбы. Сёння мы без лішніх слоў віншуем галоўнага дырыжора Прэзідэнцкага аркестра Віктара Бабарыкіна, старшыню Віцебскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Тамару Гусачэнку, дырэктара Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа Зінаіду Камароўскую, мастацкага кіраўніка прадзюсерскага цэнтра унітарнага прыватнага гандлёва-вытворчага прадпрыемства "Спамаш" Уладзіміра Кандрусевіча, сакратара праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі Алеся Марціновіча, загадчыка кафедры беларускай літаратуры і культуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта Таццяну Шамякіну: кожны з іх узнагароджаны медалём Францыска Скарыны.

Я. КАРЛІМА

№ 47 23 лістапада 2007 г. ЛіМ

Беларусь, якая знаходзіцца ў геаграфічным цэнтры Еўропы, з боку той жа Еўропы, і не толькі яе, спакон вякоў падвяргалася нападам. Кожны імкнуўся адхапіць ад яе кавалак — палякі, расійцы, шведы, французы, немцы, розныя карлы, розныя налівайкі, нябабы, татары ды тэўтоны. Але сыходзілі яны адсюль не толькі з нарабаваным: цягнулі за сабою крывавы след ды і сваіх нябожчыкаў, беларускі пыл глыталі доўгія калоны ваеннапалонных. Беларусь заўсёды з'яўлялася абарончаю тэрыторыяй. Таму і забудавана наша зямля была спрэс магутнымі абарончымі збудаваннямі — замкамі.

Беларускія замкі — тэрыторыя абароны

Першыя замкі ў нас пачалі ўзводзіць з пачатку XII стагоддзя з рознай нагоды. Напрыклад, Слонімскія — каб засланіцца ад галіцкіх князёў ды татар. Сама назва горада, дарэчы, гучала першапачаткова як "Услонім". Лідскі, Навагарадоцкі, Крэўскі ды Троскі замкі— каб бараніцца ад тэўтонаў. Усе паспяхова выконвалі ўскладзеныя на іх функцыі. Але да таго часу, пакуль у справу не ўмешваліся палітыкі-інтрыганы. Ажэняць, напрыклад, палякі Ягайлу на сваёй "крулеўне", зробяць гэтага немаладога ўжо на той час жаніха каралём Рэчы Паспалітай, а землі беларускія аб'яднаюць са сваімі.

Сістэма абарончых комплексаў на Беларусі складалася з гарадскіх бастыённых умацаванняў, у якіх галоўным цэнтрам быў замак, абкружаны ірвамі, сценамі, вежамі — усім неабходным, каб вытрымаць доўгачасовую асаду. Першапачаткова, у XII—XIII стагоддзях, замкі рабілі драўлянымі, потым — мураванымі. У некаторых вышыня сцен дасягала трынаццаці метраў. У большасці замкаў былі агромністыя сутарэнні ў некалькі паверхаў, дзе захоўваўся правіянт на выпадак аблогі. А ў Крэўскім замку была нават свая падземная турма, дзе па загадзе Ягайлы задушылі Кейстута, бацьку Вітаўта.

З цягам часу беларускія дойліды набіраліся заходняга вопыту, фартыфікацыя замкаў удасканальвалася і яны вылучаліся з агульнаабарончай сістэмы гарадоў, рабіліся прыватнаўласніцкімі. Такімі былі Ляхавіцкі замак Хадкевіча, Любчанскі замак Радзівілаў, замак у Іказні дый многія іншыя. Але самым пікам дасягненняў у гэтай галіне стаў, канечне, Мірскі замак.

Не ўсё страчана для нас з тых гістарычных каштоўнасцяў. Цешыць беларусаў да прыкладу, Стары Гродзенскі замак. Яго яшчэ называюць Вітаўтавым, бо гэты беларуска-ліцвінскі князь трымаў тут сваю сталую рэзідэнцыю. Хутка адрамантуюць Нясвіжскі замак. Працуюць энтузіясты на адраджэнні Любчанскага замка. Возяць экскурсантаў у Крэва, дзе мог бы быць створаны гістарычны помнік па сваёй значнасці ды прыгажосці не меншы за Мірскі. Дзве вежы, Шчытоўка і Касцёльная, закансерваваны ў Навагрудскім замку. Пярлінамі беларускага палацава-замкавага дойлідства маглі б стаць Гальшанскі замак, палац Сапегі ў Ружанах і палац Прушынскіх у Косаве, але ўсё гэта пакуль што толькі мроі ды ўяўленні. Добра хаця б тое, што сёння пра гэтае беларускае багацце гавораць, што выдаюцца буклеты, маецца сайт "Нечаканая Беларусь",

ёсць гісторыкі і рэстаўратары, якія прыкладаюць вялікія намаганні, каб напомніць свету, што за каштоўнасці захоўвае наша зямля. Усё гэта дазваляе спадзявацца, што самыя чорныя часіны нас абмінулі, што, можа, у будучыні мы адновім нарэшце сваю спадчыну. Бо такімі прыгажунамі як Мірскі ды Нясвіжскі замкі ганарымся не толькі мы, а ўся Еўропа, нашы каштоўнасці прызнаны "сусветным скарбам", ЮНЕСКА выдзяляе сродкі на іх адраджэнне.

Ішоў час, мінула Сярэднявечча, змяніўся характар войнаў, замкі ўжо не маглі служыць схованкаю ды абаронаю ад воз разбурэннем яго хутка загіне і сама Польшча. Менавіта так і адбылося праз сто гадоў. У разбурэнні ВКЛ вінаватыя былі і ліцвінскія князькі: ваюючы паміж сабою за ўладу, яны ў той жа час цешыліся вялікімі амбіцыямі, прэтэндавалі на Ноўгарадскія землі, абаранялі Смаленск для палякаў, строілі інтрыгі супраць Масквы і нават "вырасцілі" на сваёй зямлі ажно двух Ілжэдзімітрыяў. Дапамаглі яны таксама палякам пасадзіць на маскоўскі прастол іхняга стаўленіка караля Уладзіслава. Не ўсё тут ясна гісторыкам да сённяшняга дня, толькі ўсе ўпэўнены, што "Маскоўскую

Змяніліся часы, будзем спадзявацца, што мы не ўбачым больш на Беларусі ні чужынцаў, ні іхніх гармат. Цяпер ваююць вытанчана, інфармацыйнымі тэхналогіямі, грашыма ды ўздзеяннем на мазгі несвядомых. І адказваць на падобныя захады трэба культурна, альбо, правільней сказаць, культуралагічна.

рагаў — яны пераўтварыліся ў панскія палацы. Але ж самі войны не зніклі, не спыніліся, яны па-ранейшаму спусташалі беларускую зямлю. Заўважым, што гэтыя войны былі чужыя: Вялікае княства Літоўскае да пачатку XVII стагоддзя, пасля Люблінскай уніі, калі і існавала, дык толькі намінальна. Калі пачалася вайна 1654—1667 гадоў палякі бараніць княства не змаглі і не захацелі. Тагачасная Варшава не разумела, што саюзнае ёй Вялікае княства Літоўскае — гэта магутны шчыт паміж Захадам і Усходам, што Смуту" арганізоўваў увесь тагачасны Захад, усё каталіцкае "закулісе". "Трынаццацігадовая вайна" была расплатаю за ўсе гэтыя авантуры. Многія аналітыкі лічаць, што Беларусь і па сённяшні дзень не да канца выкараскалася з той самай крывавай у яе гісторыі бойні.

Потым праз нашу тэрыторыю гарцавала "Паўночная вайна", якая доўжылася ажно 21 год. Байкі пра веліч і таленты цара Пятра I створаны не толькі для міфалагізацыі расійскай дзяржаўнасці, для ўнутранага ўжывання, але і для таго, каб схаваць некаторыя факты заходняга ўплыву на іхнюю гісторыю праз асобу цара, які з маладых гадоў быў выхаваны на Кукуі, у "Нямецкай" слабадзе, дзе з яго зрабілі прыхільніка галандскіх манер і ўсяго нярускага, заходняга. На Беларусі ж расійскі цар вызначыўся тым, што фактычна ўзарваў нашу святыню — Полацкую Сафію, нарабіў шмат іншых разбурэнняў. Зрэшты, руйнаванню беларускіх замкаў "спрыяла" тое, што беларускія землі пасля распаду ВКЛ улілі ў склад Расіі. Не магла ж цярпець "единая и неделимая" нават напаміну пра колішнюю магутнасць свайго сапернікa ды канкурэнта — Вялікага княства Літоўскага! Толькі ў XVIII стагоддзі расійцы разабралі і парасцягвалі Быхаўскія, Слонімскія і Слуцкія замкі.

Але беларускі народ усё перацярпеў і выжыў. Выцерпеў ён і французска-маскоўскую вайну, тую, падчас якой славуты Напалеон "На Бярозе рукавіцы ды шапку згубіў". Між іншым, гадоў пятнаццаць таму ва ўсходняй сцяне Мірскага замка яшчэ можна было ўбачыць вялікі пралом, зроблены ці то французскімі, ці то маскоўскімі гарматамі. Дарэчы, ад парыжскіх ваяк, што тысячамі, галодныя і занядбаныя, ашываліся па беларускіх вёсках, да гэтага часу засталося ў нашай мове цікавае слоўка "пранцы".

А падчас Першай сусветнай вайны на ацалелых яшчэ вежах Крэўскага замка і немцы і расійцы па чарзе ладзілі сабе назіральныя пункты і няшчадна лупілі па іх з цяжкіх гармат. Пра Другую сусветную ўсе добра ведаюць, але не ўсе разумеюць, што менавіта на Беларусі Гітлер згубіў час і тэмп: у бітвах пад Сянно, на Бярэзіне, на Дняпры, на Буйніцкім полі... Аперацыю "Баграціён" па сённяшні дзень вывучаюць ва ўсіх ваенных акадэміях свету. Не Сталінградскую бітву, а бітву за вызваленне Беларусі !

Усяго гэтага былі сведкамі і нашы святыя камяні, рэшткі абарончых замкаў, а больш "маладзейшая" Брэсцкая крэпасць дык і трымалася цэлы месяц, паклала каля сваіх сцен нямала наваяўленых "тэўтонаў".

Змяніліся часы, будзем спадзявацца, што мы не ўбачым больш на Беларусі ні чужынцаў, ні іхніх гармат. Цяпер ваююць вытанчана, інфармацыйнымі тэхналогіямі, грашыма ды ўздзеяннем на мазгі несвядомых. І адказваць на падобныя захады трэба культурна, альбо, правільней сказаць, культуралагічна. Калі прывялі ў прыстойны выгляд Мірскі замак (ім цяпер ганарыцца ўся Еўропа), дык першым наладзіў у ім свой фестываль разумнік (пішу гэта з павагаю, без усялякіх двукоссяў) Міхаіл Фінберг. Мірскі замак зрабіўся новым інтэлектуальным цэнтрам Беларусі, а хутка другім такім цэнтрам будзе Нясвіжскі. У Мірскім замку акрамя музыкантаў рабілі свае справаздачы дактары і кандыдаты навук, гісторыкі і філосафы, эліта нашага народа, самае лепшае з таго, што мае беларуская нацыя. А што будзе, калі такіх цэнтраў адродзіцца ажно шэсць!

Хіба цяжка ўявіць, што ў Гальшанскі замак-палац, пабудаваны некалі ў галандскім стылі, будуць наведвацца і ладзіць там свае імпрэзы лепшыя людзі з розных куткоў свету — з Галандыі, Кітая альбо Японіі. Дарэчы, не часта ўспамінаюць у нас, што першым чалавекам, які пазнаёміў рускіх з японскаю моваю, быў беларус Іосіф Антонавіч Гашкевіч, пахаваны ў Астравецкім раёне. Добра ведаюць пра гэта толькі самі японцы, яны рэгулярна наведваюць ягоную магілу, ускладаюць кветкі. Хіба ж арганізацыя сталага беларуска-японскага семінара імя Гашкевіча — не дадатковы канал сувязі, дый сяброўства з Японіяй, краінай унікальнага розуму і тэхнічных дасягненняў?

Не прайшло яшчэ і дваццаці гадоў, як Беларусь зрабілася незалежнаю дзяржаваю, многае ў нашай свядомасці яшчэ застаецца "савецкасаюзным", але многае і змянілася. Калі б сталаму чалавеку трыццаць гадоў таму сказалі, што з крэпасці можна страляць не гарматамі, а камп'ютэрнымі праграмамі, ён бы здзівіўся і, пэўна, пакруціў бы пальцам каля скроні. Упэўнены, што яшчэ гадоў праз трыццаць-сорак адноўленыя нашы каштоўнасці ў Крэве і ў Гальшанах, у Любчы ды ў Наваградку прынясуць нам карысці не менш, чым нашы грузавыя аўтамабілі, трактары, камбайны ды сеялкі. Беларусы ўжо сёння самі робяць свае касмічныя спадарожнікі. Хіба ж гэта не дзіва!

Беларуская нацыя ўжо немаладая. Карані беларускага фальклору спецыялісты прасочваюць аж у тысячагадовай даўніне. І ўвесь гэты працяглы час наш народ пакутаваў, цярпеў і нават выратавальнае выслоўе сабе вынайшаў: "Такая наша доля..." Ды не толькі гаротнасцю, але і магутнасцю сваёю ён выратоўваў іншыя народы ад таго чарнобыльскага, якое хвалямі пракочвалася з Захаду на Усход і ў адваротны бок. Нават у мірны час на нас абрынулася чужая чарнобыльская бяда, а мы, нібы выпрабавальны палігон, папярэдзілі ўвесь свет ад пагібелі, якая можа здарыцца зноў, калі людзі не ачомаюцца і не спыняць свае небяспечныя гульні.

Можа Гасподзь, справядлівы і ўсемагутны, нарэшце ўлічыць гэтую нашу ахвярнасць і пашле нам спакой і росквіт. На векі вякоў!

Ігар ВАЛАСЕВІЧ

Спрыяць росквіту краіны

"Зямля і людзі" — такі новы праект распачаў на сваіх старонках часопіс "Маладосць". У цэнтры яго ўвагі — выбітныя асобы, чыя праца ў родным краі мае найбольшы плён: для дзяржавы, грамадства, людзей. На думку галоўнага рэдактара часопіса пісьменніцы Раісы Баравіковай, сустрэчы з такімі людзьмі асабліва неабходныя літаратарам, творцам, хто вядзе ўдумлівы досвед сучаснага жыцця. У рамках праекта адбылася паездка пісьменнікаў і навукоўцаў у Мазырскі раён. Пасля знаёмства з саўгасам-камбінатам "Зара" і дырэктарам гэтай унікальнай гаспадаркі Уладзімірам Андрэевічам Дворнікам ("ЛіМ" № 41), наладзілася гаворка за "круглым сталом". У гутарцы, як і ў вандроўцы па гаспадарцы ўдзельнічалі першы намеснік РВУ «Літаратура і Мастацтва» Алесь Бадак, намеснік галоўнага рэдактара "Маладосці" Аляксей Чарота, рэдактар аддзела часопіса Віка Трэнас, доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры беларускага мовазнаўства Мазырскага універсітэта Васіль Шур, кандыдат філалагічных навук, паэт Анатоль Малюк, кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай літаратуры Павел Кошман, кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай літаратуры, паэтэса Галіна Дашкевіч, паэт з Берасцейшчыны Уладзімір Сітуха. Прапануем чытачам некаторыя фрагменты сустрэчы.

Р. БАРАВІКОВА: — Вось мы свой праект назвалі "Зямля і людзі" — тут чалавек працы, чалавек, які стаіць на зямлі, каб мы маглі будучым пакаленням праз літаратуру расказаць, а што ж такое ў нас адбывалася? А хто жыў на нашай зямлі? А чым жа мы жылі?

На вялікі жаль, у літаратуры людзей, якія для Беларусі зрабілі шмат, вельмі мала. Мы бачым бясконцыя шоу на тэлебачанні. Але ж у літаратуры, асабліва ў 60-я гады, былі выдатныя творцы і з гэтага краю: Іван Мележ (згадайма ягоныя "Людзі на балоце"), Іван Шамякін таксама з Гомельшчыны, Іван Навуменка, Барыс Сачанка — шмат нашых знаных пісьменнікаў выйшлі з гэтага краю. Былі станоўчыя, прыгожыя героі. З літаратурных старонак мы даведваліся пра людзей, з якіх можна браць прыклад моладзі. І не сорамна было нашы кнігі перакласці на іншыя мовы свету. Цяпер, дзякуй Богу, у нашай літаратуры таксама няма "чарнухі". Але няма, на маю думку і герояў сённяшнага дня, такіх, як Уладзімір Андрэевіч Дворнік. Вось мы ў скарачэнні друкавалі "Зялёныя змеі" Паўла Місько — пра чарнобыльскую зону. Паказаны духоўны чарнобыль — усё тое агіднае, што, на вялікі жаль, ёсць у жыцці. Але засяроджвацца на гэтым таксама кепска. Усё, што ёсць негатыўнага, трэба як мага хутчэй зжываць. Таму мне думаецца, калі ў нас з'яўляюцца героі, то пра іх трэба пісаць, пра іх трэба расказваць: на часопісных старонках і ў мастацкіх кнігах. Браць кагосьці за вобраз, вымалёўваць дэталі.

А. БАДАК: — Але калі гаварыць пра літаратуру, ёсць тут яшчэ адна праблема. На працягу дзесяцігоддзяў беларускую літаратуру называлі вясковай. Таму што яна пісала пра вёску. Можна бясконца пералічваць вельмі добрыя творы XX стагоддзя — мы ўсе іх ведаем. Ды вось у чым парадокс: прыносяць сёння ў рэдакцыі новыя творы пра вёску, і такое ўражанне, што гэта людзі ўсё таго ж XX стагоддзя, і тая вёска, якой даўно ўжо няма. Чаму так? Ці гэта няведанне новага жыцця?

А. МАЛЮК: — Бо трэба даследаваць жыццё. Я, калі першы раз пачуў пра тутэйшую гаспадарку, рашыў даведацца, які тут чалавек кіруе, якая атмасфера. Але нават сёння сам здзіўляюся: Уладзімір Андрэевіч гаворыць, што, да прыкладу, 9 магазінаў, некалькі чалавек выдаюць "на гара" два мільярды рублёў — мільён долараў, а райспажыўсаюз рэалізуе прадукцыі на суму ў чатыры разы меншую. Відавочна, героі сярод нас. Наша віна, што не знаходзім мы іх. Вядома, цяжка пісаць пра чалавека. Але трэба. Трэба самім ехаць да гэтых людзей. І, сапраўды, калі спрэс кроў, жахі, насілле, якое ідзе з экранаў, трэба паказваць, як людзі могуць жыць зусім па-іншаму. А чаму ж мы не бачылі, калі чалавеку было цяжка? Не адразу ж так ішло ўсё гладка. Чалавеку, можа, і перашкаджалі, і зайздросцілі. Чалавек, можа, і ночы не спаў. А як толькі ён узняўся — загаварылі. Цяпер далучаюць адсталыя калгасы. Я ведаю сельскую гаспадарку не па кніжках. У нас у сям'і было шасцёра дзяцей. Кожны меў заданне сваё. І бацька нешта падобнае рабіў: каб кароове было цёпла, каб чыста было. Але рознае здаралася. Вось гэта сялянская струнка праявілася ў чалавеку, у дырэктара. Дык гэта ж цудоўна!

А. БАДАК: — Раней паміж журналістыкай і літаратурай плаўны пераход быў. Пісалі нарысы многія выдатныя журналісты. Цяпер вельмі адчувальны падзел паміж журналістыкай і літаратурай, і нарыс, на якім трымалася рэальнае жыццё, проста выпаў з журналістыкі — ён непатрэбен сёння, і ён выпаў з літаратуры. Яго паступова замяняе эсэ. Але эсэ — гэта такі спецыфічны жанр, дзе ёсць рэальнасць і ёсць выдумка. І атрымалася так, што ні ў журналістыцы, ні ў літаратуры рэальнае жыццё дастаткова не адлюстроўваецца.

В. ШУР: — У добрыя савецкія часы чалавек працы быў у цэнтры ўвагі. На месцы выязджалі брыгады пісьменнікаў, былі і клеркі, якія іх суправаджалі — і рабіліся досыць грунтоўныя сустрэчы. Людзей працы заўважалі. І асоб выбітных знаходзілі. Мы цяпер вяртаемся да гэтага. Быццам вяртанне да былога, але на новай аснове. Хачу звярнуць увагу: мы жывём у вельмі маляўнічым і багатым кутку Палесся, якім захапляюцца не толькі нашы людзі: хто ні прыязджае — яны з замілаваннем прыгадваюць і раку Прыпяць, і горы Мазырскія, і нашыя далягляды. Выключна арыгінальна гэта прыкмеціў наш зямляк, выдатнейшы паэт Уладзімір Верамейчык— ён цудоўна пісаў пра кожную вёску Мазыршчыны. Ёсць тут вёска з мілагучнай назваю Барбароў. Тут нешта каталіцкае, але перагукаецца з словамі "бор", "між бароў"... Наша асацыятыўнасць такая. Барбара... Вёска, калі ўжо гаварыць далей, мела выключна багатую гісторыю. У Барбарове — самым вялікім маёнтку на ўсім Палессі — жыў пан Горвард. Ён заснаваў цукеркавую фабрыку ў Нароўлі. А рэзідэнцыя была ў Барбарове. У гэтых мясцінах нарадзіўся акадэмік Ракіцкі, які стварыў самую унікальную кнігу па інжынернай генетыцы. Акадэмік Мацэпура — таксама ўраджэнец Барбароў. Верамейчык пісаў, што ён "успароў сваім плугам бруха Палесся". У Барбарове нарадзіўся самы вялікі энтограф, які апісаў народы Поўначы — Эдуард Карлавіч Пекарскі. Ён вучыўся ў Мазырскай гімназіі, пасля ў інстытуце ў Харкаве, яго за рэвалюцыйную дзейнасць саслалі ў Сібір. Не маючы ніякай філалагічнай адукацыі, Эдуард Карлавіч стварыў самы унікальны слоўнік якуцкай мовы, у якім больш як сто тысяч слоў. Уявіце: "Словарь современного русского языка" мае 120 тысяч слоў — дык гэта ж тысячы людзей над ім працавалі. А тут адзін чалавек стварыў унікальны твор, а яшчэ напісаў серыю прац па гісторыі матэрыяльнай і духоўнай культуры Палесся. Яго, катаржаніна, у 1903 годзе паклікалі ў Санкт-Пецярбург і зрабілі правадзейным членам Расійскай акадэміі навук. Унікальны чалавек, у якога шматтомныя працы. Сп. Пекарскі быў правадзейным членам многіх еўрапейскіх акадэмій. Гэта чалавек з сусветным імем.

> **Раней паміж журналістыкай і літаратурай плаўны пераход быў. Пісалі нарысы многія выдатныя журналісты. Цяпер вельмі адчувальны падзел паміж журналістыкай і літаратурай, і нарыс, на якім трымалася рэальнае жыццё, проста выпаў з журналістыкі — ён непатрэбен сёння, і ён выпаў з літаратуры. Яго паступова замяняе эсэ. Але эсэ — гэта такі спецыфічны жанр, дзе ёсць рэальнасць і ёсць выдумка. І атрымалася так, што ні ў журналістыцы, ні ў літаратуры рэальнае жыццё дастаткова не адлюстроўваецца.**

Я член тапанімічнай камісіі па ўвекавечанні памяці асоб, якія праявілі сябе. Сёлета ў Мазыры прынята рашэнне аб некаторых вуліцах. Будзе вуліца ў гонар Міхаіла Барысава — мазыраніна, Героя Савецкага Саюза, які затапіў самы вялікі фашысцкі карабель, будзе вуліца ў гонар Івана Смоляра — былога першага сакратара Мазырскага райкама, які ў часы Чарнобыля зрабіў тут вельмі многае. Гэта быў чалавек, які паважаў і нацыянальную культуру...

А. МАЛЮК: — Я прыходзіў на заняткі па філалогіі, па беларускай мове — і студэнты, і выкладчыкі шануюць нашу мову. Трэба, каб у такіх гаспадарках былі шыльды на беларускай мове. І прадукцыю, было б вельмі прыемна, каб афармлялі па-беларуску. Гэта таксама частка нашай культуры.

В. ТРЭНАС: — Мне, як маладому літаратару, вельмі цікава было далучыцца да жыцця, зразумець, які тут высокі культурны і эканамічны ўзровень. Тэмпы развіцця што ў сталіцы, што ў гэтай гаспадарцы — мне падаецца, можна параўнаць, і яны будуць роўныя. Уразіў такі заходні рацыяналізм — у добрым плане. І падыход да працы, наколькі ўсё тэхналагічна пабудавана, як прадуманы самі будынкі — усё гэта выклікае захапленне.

Р. БАРАВІКОВА: — Як цяжка чалавеку саўладаць з уласнай псіхалогіяй. Колькі перашкод на шляху кіраўніка было. Таму і літаратура наша павінна выхоўваць пачуццё радасці і задавальнення за такіх людзей, як Уладзімір Андрэевіч Дворнік. Каб ім была нейкая падтрымка, каб людзі радаваліся такой з'яве і імкнуліся да такога ж. "Бытие определяет сознание". І чалавеку трэба даць магчымасць жыць так, як жывуць людзі тут і мець такую зарплату і да зарплаты, мець такія ўмовы... І трэба, каб пра такі прагрэс наша тэлебачанне гаварыла кожны дзень...

Г. ДАШКЕВІЧ: — Каб хоць трошкі балела душа за свой народ...

А. БАДАК: — Калі мяняюцца ўмовы, мяняецца псіхалогія, мяняецца сам чалавек.

Р. БАРАВІКОВА: — А чаму не пісаць пра лепшае з таго, што ёсць? Ёсць жа ўзор! Калісьці амерыканцы стварылі фабрыку "грёз" — сучасны Галівуд. Каб там ствараліся фільмы пра прыгожае жыццё, каб быў узор і гледзячы на яго людзі імкнуліся да прыгожага жыцця. Нам трэба паказваць тое, што ёсць у кожным куточку Беларусі. Каб людзі ведалі і бачылі, што ў нас з'яўляецца новага.

Наша мова лічылася адной з самых прыгожых моў у былым Савецкім Саюзе, наша літаратура лічылася адной з самых моцных літаратур, асабліва паэзія — дзякуючы мілагучнасці нашай мовы. Нас заўсёды запрашалі на розныя сустрэчы і фестывалі. Помню, у 1981 годзе прымала ўдзел у фестывалі, калі святкавалася 75-годдзе Шолахава, у Растове-на-Доне. Гэта гаворыць пра тое, што наша беларуская літаратура была ў пашане. Хоць у Чэхаславакіі, хоць у Югаславіі, Германіі — дзе заўгодна. Я думаю, што нас нейкім чынам апярэдзілі цяпер гаспадары зямлі, таму што яны змаглі зрабіць прыклады ўдалага гаспадарання. І гэта таксама трэба адлюстроўваць. Наша літаратурная моладзь вельмі ўпэўнена заяўляе пра сябе. Таму, магчыма, вось так, у спалучэнні, "Зямля і людзі", ды плюс наш творчы патэнцыял — і мастакі, і музыканты, і спевакі, і пісьменнікі паспрыяюць таму, што Беларусь наша зойме сваё пачэснае месца ў свеце.

Ірына ТУЛУПАВА

Фота аўтара

Кніга жыцця

Калі ў пісьменніка ці паэта выходзіць кніжка, гэта для яго, несумненна, вялікае свята. І чым радзей выходзяць кнігі, тым свята – большае. Міколу Купрэеву пашчасціла пры жыцці трымаць у руках толькі два свае зборнікі: "Непазбежнасць" і "Правінцыйныя фантазіі", часта яны служылі паэту "ахоўнымі граматамі" (як гэта сімвалічна – паказваць свае вершы замест пашпарта, як па-купрэеўску!). Сёння, калі выйшла трэцяя кніга Міколы Купрэева, мы маем магчымасць ідэнтыфікаваць па ёй сапраўдных беларусаў: калі я ўбачу чалавека, які чытае "Палескую элегію", далібог, мне захочацца з ім пазнаёміцца.

Кніга складаецца з пяці аўтабіяграфічных аповесцей, што да гэтага часу былі даступныя толькі малалікім, але ўдзячным чытачам слыннага часопіса "Крыніца". Мне пакуль невядома, якім чынам пазнаёміўся Леанід Галубовіч з Купрэевым, як ён "выцягваў" з яго гэтыя аповесці для друку? Увогуле, што падштурхнула "агасфера" Купрэева пачаць пісаць прозу? Мяркую, усё гэта ў той ці іншай ступені вытлумачыцца, калі пабачыць свет кніжка ўспамінаў пра паэта ды яго эпісталярнай спадчыны; такое выданне пакрыёма наспявае.

А мне чамусьці згадваецца сваё першае ўражанне ад Купрэева, і была гэта, дарэчы, менавіта проза: аповесць "Палеская элегія". Неяк знайшоў я на шафе добра зачытаную братам "Крыніцу", унурыўся ў яе — а ўсім вядома, які шчыры і ўдзячны 13-14-гадовы чытач — і, натрапіўшы на купрэеўскі твор, проста не паверыў, што можна **так** пісаць ды прычым пра такое роднае: нашае Палессе, бясконцыя дарогі праз лясы, вузенькія рэчкі, буслы і чаплі, што ходзяць па балацявінах, вышукваючы якое здабычы... А галоўнае — людзі, гэта ж нашы людзі! Ды з такой праўдзівасцю апісаныя, нічога не хаваючы, што застаецца толькі здзівіцца. І такая любоў да ўсяго гэтага... Адным подыхам прачыталася. Адгукнулася душа на нешта блізкае, адчулася ў гэтым нешта сваё, ды, хутчэй, не праз сюжэт, а праз саму манеру пісьма...

Увогуле, у кожнага творцы ёсць пэўны рытмічны малюнак, на які ён нанізвае сваю прозу ці паэзію. Юрый Казакоў, у далітаратурнай біяграфіі — кантрабасіст, называў гэта "танальнасцю". Пісьменнік ладзіць твор, як **музыка** — інструмент. Самае цудоўнае ў літаратуры, што інструменты ва ўсіх пісьменнікаў розныя, а калі і ёсць падобныя, то адзін з іх заўсёды гучыць тонка і пранізліва, а астатнія будуць толькі падрабляцца пад яго, дарэмна спрабуючы паўтарыць непаўторнае. І вось менавіта музыка купрэеўскай прозы і захапляе, не пакідае месца такому звыкламу сёння недаверу да твора. Ёсць у гэтых аповесцях глыбокая, палеская сцішанасць, не гарадская і не вясковая, а хутчэй — прыродная... Купрэеў заўсёды імкнуўся да цішыні і ці не таму ён увесь час сыходзіў, з'язджаў адусюль. Ён вельмі баяўся не быць сабой, як быццам помнячы запавет Уладзіміра Сакалова:

...Это страшно —
всю жизнь ускользать,
Убегать, уходить
от ответа.
Быть единственным,
а написать
Совершенно другого
поэта...

Дарэчы, пра ўцёкі. Віктар Карамазаў у сваім эсэ пра Міхася Стральцова пісаў, што той нездарма ў пэўны момант адышоў ад сваіх раўналеткаў-прыяцеляў, бо яны сталі на кніжны "канвеер", здрадзіўшы святому для Стральцова мастацтву слова. Яго душа пратэставала супроць несапраўднага, супроць фальшу, і сыход быў непазбежны. Зразумела, у Міколы Купрэева ўсё было інакш, аднак відавочна, што і Стральцоў, і Купрэеў жылі ў створанай імі самімі ідэальнай мадэлі свету і, сутыкаючыся з жорсткай рэальнасцю, заўсёды адступалі назад (бо, перш за ўсё, былі лірыкамі), шукалі нейкіх схованак-лёхаў, дзе можна было б спачатку забыцца на гэтую неадпаведнасць, а потым — вярнуцца ў свой свет.

Стральцоў, вядома, быў больш гарманічны, чым Купрэеў. Гэта бачна па прозе. У купрэеўскіх аповесцях можна лёгка знайсці "швы" — дзе пачаў пісаць, а дзе закончыў. Я не папракаю тут адсутнасцю "чысціні жанру" і астатнімі літаратуразнаўчымі анахранізмамі. Наадварот. Агульнавядома, што асоба пісьменніка выяўляецца ў яго мове і што структура твора — таксама элемент сэнсаўтваральны, а не фармальны. Такі ўжо ён быў, Купрэеў: праходзіў час і змяняўся аўтар, а за ім змяняліся, набывалі новае рэчышча словы твора. Ён не мог хлусіць чытачу, бо заўсёды быў сабой і толькі сабой (што праўда, трохі эгаістычная якасць).

Галоўнай жа асаблівасцю аповесцей Купрэева з'яўляецца пастаянны зварот да мінулага, паяднанне гістарычнага і псіхалагічнага, прыём рэтраспекцыі. Пісьменнік вельмі часта сутыкае розныя пласты часу, супастаўляючы іх. Ён як бы гаворыць нам, што толькі асэнсоўваючы нядаўняе мінулае Беларусі, можна зразумець яе сённяшняе; што толькі праз прызму лёсу аднаго чалавека, праз прызму часу, у якім ён знаходзіцца, можна зразумець і лёс усёй Беларусі на працягу гэтага часу.

Лірычны герой аповесцей Міколы Купрэева — Анатоль Хведаравіч Кухараў. Уся проза пісьменніка, ідучы ў парадку напісання кожнага твора, выбудоўвае цэласную карціну жыцця Кухарава. Дзяцінства ("Дзіцячыя гульні пасля вайны"), юнацтва ("Імгненне светлае"), сталасць ("На вуліцы Карла Маркса з Паэтам") і старасць ("Палеская элегія", "Рэчкаю плывём, плывём...", "Пастух у космасе", "Лісты з млына") героя..."Адысея Анатоля Кухарава" — такі падзагаловак хочацца даць гэтаму цыкла (менавіта цыкла!) аповесцей. Выбіваецца з цыклу, мабыць, толькі "Рэчкаю плывём, плывём...", дзе галоўны герой — маленькі хлопчык, што плыве ў чоўне разам з дзядзькамі пасвіць казу. Трэба толькі адшукаць для яе "чыстую" траву на забруджанай радыенуклідамі тэрыторыі (гэта, бадай што, метафара, за якой — само жыццё аўтара). Але і ў гэтым творы, які, здавалася б, супрацьпастаўлены астатнім, заўважаецца асноўная задума Купрэева — ўбачыць Беларусь вачыма некалькіх пакаленняў.

Апошнія дзве аповесці Міколы Купрэева —"Пастух у космасе" і "Лісты з млына" — таксама да цыкла можна аднесці толькі з пэўнымі агаворкамі. Творы з'яўляюцца спробамі (часам, не зусім удалымі) "пагуляць" з аўтабіяграфічным мастацкім матэрыялам. Менавіта таму, мяркую, яны і не ўвайшлі ў зборнік выбранага.

Гэта вельмі цэласная кніга. Напэўна, параўнаць яе можна адно з "Жоўтым колерам белага снегу" Алеся Асташонка, і параўнаць не толькі зместава...

Дзякаваць Богу і людзям, кніга выйшла — у прыгожым афармленні і прыстойным па сённяшнім часе тыражом (2500 асобнікаў). І нам застаецца толькі парадавацца за Міколу Сымонавіча Купрэева і па-добраму пазайздросціць тым людзям, якія адкрыюць для сябе яго цудоўную прозу!

Ціхан ЧАРНЯКЕВІЧ

Уціск і супраціў

Асоба Леаніда Маракова як энцыклапедыста і архівіста была параўнальна нядаўна асветленая ў "Кулуарах" Л. Галубовіча. Мы ж маем на мэце пагаварыць непасрэдна пра Маракова-празаіка – выйшла кніга ягоных навел і мініяцюр "Непамяркоўныя. Трэцяя спроба".

Для яснасці трэба, напэўна, зрабіць невялікі экскурс у гісторыю. У 2001 годзе пісьменнік выдае два зборнікі навел — "Непамяркоўныя-I" і "Непамяркоўныя-II". Тыя аповеды былі вельмі разнародныя паводле зместу, але аснова пераходзіла з твору ў твор: асоба ў "сітуацыі пасткі", напружанне ўсіх чалавечых магчымасцей і, адпаведна, перамога ці параза героя.

Трэцяя кніга "Непамяркоўных" – своеасаблівае выбранае Маракова-празаіка. Сюды ўваходзіць вялікая частка твораў з першых дзвюх кніг плюс дададзеныя некалькіх новых навел і маленькая аўтабіяграфічная аповесць. Чаму ж "своеасаблівае"? Справа ў тым, што "трэцяй спробай" Маракоў аб'ядноўвае ўсю сваю прозу, прысвечаную **ўціску** асобы з боку дзяржаўнай сістэмы, **супрацьстаянню** гэтай сістэме. Прэч, як непатрэбнае, адкідаюцца ранейшыя аповеды пра сутычкі з бандытамі і блатную рамантыку васьмідзесятых — першай паловы дзевяностых, гісторыі з жыцця камерсантаў. Адкідаюцца, на мой погляд, невыпадкова. Гэтым разам у Маракова зусім іншая мэта: не прадставіць "Непамяркоўнымі" сябе як празаіка, але актуалізаваць у свядомасці чытача *сваю* тэму. Гэта адно, калі чытаеш пра пакуты Валерыя Маракова, Міхася Зарэцкага, Уладзіслава Галубка, пра перыпетыі лёсу многіх іншых, зацюкнутых у абцугі Сістэмы... І зусім інакшае, калі тыя ж самыя мастацкія прыёмы выкарыстоўваюцца для абмалёўкі гісторый з "камерсанцкага" жыцця. Тут пахне ўжо масавай, "бандыцка-зэкаўскай" літаратурай, недахопу якой сёння, мусібыць, не адчувае ніхто.

Ганна Кісліцына акрэсліла стыль Маракова як "халодны". Мушу не пагадзіцца з гэтым тэзісам. Мала ў каго я сустракаў такую экспрэсіўнасць. Ствараецца ўражанне, што пісьменніку проста жыццёва неабходна падзяліцца з людзьмі, але не толькі думкамі, як звычайна, — праўдзівымі фактамі, якія старанна прыхоўваюцца і рэтушуюцца дзеля стабільнага грамадскага "здароўя". А гэтыя гістарычныя факты кожны беларус ведаць абавязаны! Дык ці можа быць халодным голас таго, хто кліча ў пустыні?

Асабліва яскрава такая экспрэсіўнасць выяўляецца ў мініяцюрах Маракова, што змешчаны напрыканцы кнігі. Выданне пазначана як зборнік апавяданняў (праўда, у большасці сваёй, гэта, бясспрэчна, навелы), тым больш, што мініяцюры не разбіваюць цэльнасці кнігі, а наадварот, вельмі гарманічна дапаўняюць яе. Пераважная большасць іх ужо была выдрукавана Мараковым у зборніку "100 мініяцюр" (Мінск, 2002). Усе яны таксама маюць сваім цэнтрам сталінскія рэпрэсіі 30-х і лёсы тагачасных беларускіх пісьменнікаў. Мяне асабіста вельмі ўразіла мініяцюра пра вёску Лукаша Калюгі. Нейкім дзівам ацалелая хата, дзе нарадзіўся пісьменнік, ператвораная ў бамжатнік! Як цяжка было гэта чытаць...

Леанід Маракоў не майстар псіхалагізму, апісання. Ён майстар ТЭМЫ, дзеля якой ахвяраваў практычна ўсім, што меў. І таму галоўная, на мой погляд, адзнака яго прозы — **гранічная шчырасць**. Што да творчай лабараторыі, то, мяркую, варта прывесці наастачу цытату з кнігі "100 мініяцюр":

"Для мяне апавяданне — гэта не столькі апісанне прыроды, колькі спроба захапіць чытача ў абдымкі хай сабе і прыдуманага, але галоўнае — жывога сюжэта. Загіпнатызаваць словам, зліць яго з сюжэтнымі падзеямі, зрабіць удзельнікам, адным з герояў. А ўжо добрым ці благім — няхай выбірае сам чытач-глядач. Так-так, я хачу, каб мой чытач над старонкамі твора ператвараўся і ў гледача. Бо калі чалавек пранік у сюжэт, ён робіцца адным з герояў: думае, перажывае, дзейнічае, жыве... А значыць, і бачыць.

Я — за жывы аповед".

Ц. Ч.

З палемічнай завостранасцю

Уладзімір Міхайлавіч Казбярук — вядомы даследчык нашай літаратуры. Найперш даўнейшай, той, што не надта вядомая была і даступная шырокаму колу чытачоў. А ён, як апантаны шукальнік, намагаўся і сам дайсці да вытокаў, да каранёў, і іншых захапіць гэтым. Каб поўна і панарамна бачылася наша літаратурнае жыццё — без белых плямаў і забытых постацяў ці твораў. Бо не бывае поўнай і аб'ектыўнай любая гісторыя, калі з яе свядома альбо несвядома вырываюцца ці проста губляюцца цэлыя старонкі.

У. Казбярук праз увесь свой даследчыцкі занятак не пазбягае і палемічнага пачатку, часам мо знарок завостранага позірку, ацэнкі, падыходу. Але гэта сведчыць пра свой погляд на рэчы, пра сваё меркаванне і бачанне іх у тым кантэксце, які даследчыку падаецца найбольш справядлівым, тым, што дае магчымасць найбольш поўна і дакладна выявіць усе, так бы мовіць, асацыятыўныя сувязі.

Але заўсёды даследчык стараецца рабіць свае высновы на грунце дакладных фактаў. Таму не цураецца палемізаваць з агульнавядомым і тым, што, здавалася б, усталявалася і ўжо набыло ледзь не хрэстаматыйную ацэнку. Свае нязгоды ён абгрунтоўвае меркаваннямі, якія заснаваны на канкрэтных фактах і доказах. А гэта, ў сваю чаргу, інтрыгуе чытача, змушае прачытаць не толькі напісанае У. Казберуком, а і іншымі даследчыкамі. Такім чынам, Уладзімір Міхайлавіч заклікае чытача да развагі, палемікі, скіроўвае да думання.

На гэткія разважанні падштурхнула мяне новая кніга Уладзіміра Казберука "Нашы вытокі", якая зусім нядаўна ўбачыла свет у выдавецтве "Мастацкая літаратура". Кніга мае падзагаловак "Пошукі гісторыка-літаратурнай праўды". У яе ўключаны эсэ, разважанні, палемічныя артыкулы. Як бачым, аўтар адразу дае чытачу магчымасць беспамылкова вызначыць змест і сэнс выкладзенага ў кнізе. У ёй сабраны ранейшыя публікацыі Уладзіміра Міхайлавіча па праблемах даўняй беларускай літаратуры. Напісаны яны напрыканцы мінулага і ў пачатку цяперашняга стагоддзяў.

Для мяне было асабліва цікавым прачытаць гэта ўсё разам, у сукупнасці, бо гэта надае большую панарамнасць, дазваляе больш грунтоўна ўвайсці ў даследчыцкі свет вучонага. Ён не вядзе спрэчку проста дзеля спрэчкі, яму надзвычай важна знайсці праўду, адказаць на загадкавыя пытанні такім чынам, каб яны сталі больш зразумелымі, але пры гэтым ён не выстаўляе напаказ сваю ўласную бездакорнасць і непагрэшнасць.

Часам У. Казбярук знарок абвастрае пытанне, настойліва, нават упарта імкнецца дакапацца да ісціны, каб прасвятліць цьмяныя мясціны. Так, напрыклад, ён паступае, калі хоча разгадаць некаторыя "загадкі гісторыі літаратуры" — так называецца адна з публікацый кнігі. У прыватнасці, ён звяртаецца да аналізу цьмяных месц у "Слове аб палку Ігаравым". Многія вучоныя-літаратуразнаўцы дагэтуль спрачаюцца, што меў на ўвазе аўтар "Слова...", калі пісаў, што па дрэве расцякаецца "мысль". У. Казбярук падае розныя погляды даследчыкаў на гэты конт, ён спрачаецца нават з такім прызнаным аўтарытэтам, як акадэмік Дзмітрый Ліхачоў. Наш даследчык прытрымліваецца думкі, што гаворка ў "Слове..." ідзе не пра "мысль", а пра "вавёрку", і прыводзіць шмат недакладнасцяў з аргументацый іншых даследчыкаў. Падаецца, што робіць свае высновы У. Казбярук слушна, разглядаючы тое ці іншае слова альбо выраз не адасоблена, а ў кантэксце ўсяго твора і тагачаснай лексікі. Часам падобныя разважанні нагадваюць сапраўды дэтэктыўны сюжэт, пазначаны сапраўднай займальнасцю.

У кнізе шмат цытат з летапісаў, якія перакладае сам аўтар, спасылак на дакументы тых далёкіх часоў. Ужо само па сабе гэта дадае кнізе вартасці, бо ў навуковы ўжытак уводзіцца шмат цікавага, здараецца, зусім новага матэрыялу. Часам ажно здзіўляешся нечаканым высновам даследчыка, такімі супярэчлівымі ў адносінах да вядомага яны ўяўляюцца.

Вось адзін прыклад: "Сёння многія нашы даследчыкі даўніны паўтараюць як нешта ўсім і зусім вядомае і бясспрэчнае, што Гедымін быў братам Віценя. Такая версія ўзаконена і ў некаторых энцыклапедычных выданнях. Аднак жа летапісы, пра якія тут (у кнізе. — ***А.Б.***) ішла гаворка, называюць Гедыміна сынам Віценя, які, такім чынам, стаў заснавальнікам славутай дынастыі вялікіх князёў літоўскіх". Як вам такая выснова? Смела? Нечакана?

Альбо іншае: "Паход Суворава прынёс нашай зямлі разбурэнні, смерць людзей, захаванне прыгоннага прыгнёту ў непарушным выглядзе на некалькі дзесяцігоддзяў. Але перамога паўстання Касцюшкі раз і назаўсёды пахавала б беларушчыну як такую, паставіла б крыж на ідэі нашага нацыянальнага адраджэння..."

Такіх смелых, нечаканых і палемічных высноў у кнізе "Нашы вытокі" нямала. Але робіцца гэта, як на мой погляд, не дзеля дэманстрацыі сваёй нязгоднасці, а з адной мэтай: дакапацца да ісціны, нават у дробязях, у дэталях.

І няхай часам некаторыя ягоныя сцвярджэнні могуць падацца занадта катэгарычнымі, гэта ніякім чынам не абвяргае дасведчанасці аўтара, ягонай эрудыцыі і сумленнага жадання разабрацца ва ўсім грунтоўна і дасканала. Пры гэтым ён імкнецца пазбягаць "свабоднага абыходжання і з дэталямі, і з такімі падзеямі, якія мелі вырашальнае значэнне для лёсу нашага народа".

Мяркую, нехта не палічыць доказы і высновы У. Казберука бездакорнымі і цалкам пераканаўчымі. Хай сабе і так. Бо ўжо ад таго ёсць карысць, што кніга "Нашы вытокі" не пакіне абыякавым, прымусіць думаць, аналізаваць самому, шукаць свае аргументы, спрачацца. А ў спрэчцы, як вядома, і нараджаецца ісціна.

Анатоль БУТЭВІЧ

Ліра і муза



З наёмства з новай кнігай паэзіі "Осень молодая" Тамары Красновай-Гусачэнкі, што зусім нядаўна выйшла ў выдавецтве "Мастацкая літаратура", падштурхнула мяне да разважанняў не толькі пра яе, а і пра сучасную паэзію ўвогуле. Паэтаў сёння, як вядома, удосталь, аднак вершаў, на якія можна было б пісаць музыку, каб гук клаўся арганічна, а затым прасіўся ў тваю душу, каб новая песня адразу пайшла ў народ — такіх паэтаў і вершаў, на жаль, мала. Дый, праўдзівей кажучы, іх катастрафічна не стае. Таму святое месца, як кажуць, пустым не бывае, яно запаўняецца слоўнай "абракадабрай".

А нам сёння гэтак не стае прыроды пачуцця і сапраўднай духоўнай узнёсласці. Тым больш прыемна, што гэта знаходзіш у кнізе "Осень молодая", якая складаецца як з новых твораў вядомай паэтэсы, так і напісаных ёю раней — лепшых, што ўвайшлі ў папярэднія сем паэтычных зборнікаў Т. Красновай-Гусачэнкі.

У тым, што кніга гэтая атрымалася, паспела ўжо, вобразна кажучы, прагучаць, канечне, найперш заслуга самога аўтара, паэтэсы па прызванні, талент якой па сутнасці здатны тварыць сапраўдны цуд. Аднак, разам з тым, нельга не сказаць ухвальнае слова і ў адрас выдавецтва "Мастацкая літаратура", што даўно вядомае сваёй высокай патрабавальнасцю да пісьменніцкіх тэкстаў.

Вершы Т. Красновай-Гусачэнкі ў сукупнасці ўяўляюць сабой букет палявых, здзіўляльных у сваёй прастаце і натуральнай прыроднай прыгажосці, кветак. Чытаеш праможленае паэтэсай у хвіліны яе найвышэйшага творчага ўзлёту ці засяроджанага роздуму, і быццам нанава адкрываеш нешта добра табе вядомае, але гэтым разам усё адбываецца неяк інакш, бо думкі і развагі лірычнай гераіні, яе пачуцці, яе ўспрыманне свету і людзей у гэтым свеце нязменна нясуць тое, да чаго нельга ставіцца абыякава:

Кто же мы?
Все пытаюсь постичь.
Но слова просто
меркнут
от боли.
Все стреляем
невинную дичь...
Что в ней проку-то:
крылья,
да крови,
Вольной крови
горячей глоток...
И зачем в нее нужно
стрелять?
Палец медлит...
Но сладок курок.
И — смертельная тяга —
нажать.

Як быццам верш аб прыродзе, пра боль за яе. А ў сапраўднасці ёсць і іншы падтэкст — гэта радкі аб юным чалавечым лёсе. Як вядома, аб лірыцы, як і аб лірыцы кахання, у прыватнасці, спрачаліся ва ўсе часы, але ацэнка даецца аўтару залежна ад таго, наколькі свежае пачуццё ў лірычнага героя. Т. Краснова-Гусачэнка — паэтэса лірычная, якая жыве натуральным словам, выклікае ў чытача давер сваёй адкрытасцю і непасрэднасцю:

Я поеду, поеду домой
этим летом,
Поеду в деревню,
которой уж нет.
И мне в душу заглянет
зрачком пистолета
Печная труба
через крыши скелет...
...Это я, как тот горький.
Пропащий Герасим,
А хата все смотрит
глазами щенка,
Даже с камнем на шее —
не гаснет...

Тут не толькі лірыка і ўсплёск душы. Тут само жыццё, яго плынь і пакута, але галоўнае — народная аснова душы. Адлюстраванне шчырага імкнення знайсці сваё, назваўшы стрэхі пакінутых, апусцелых хат «скелетами», убачыць дом, у якім некалі віравала жыццё, у выглядзе шчаняці «с камнем на шее»...

Т. Краснова-Гусачэнка, несумненна, спавядае ў паэзіі класічную рускую традыцыю:

Сколько лежит
на ветвях твоих зим,
Дуб мой могучий
и древний?
Сколько ты соков
корнями испил,
Чтобы шуметь
над деревней!

Размова з дрэвам, якое прымае на сябе ўсе беды і клопаты, усю памяць таго, што адбылося... Сапраўдны аўтар — заўсёды мысляр і філосаф, ён "пераплаўляе" свой лёс у паэзію. Менавіта такі пераліў адчуваецца ў вершах "1 апреля 1948 года», «Памяти сына», «Одиночество» ды іншых, дзе чуйнае вуха заўважае ўжо знаёмыя матывы, што аб'ядноўваюць лёсы нашага пакалення, у якога падобнае маленства, адны і тыя кнігі, казкі, гульні — адзіны духоўны стрыжань.

І разам з тым, усведамленне ўласнага шляху, сваёй паэтычнай сцяжыны, паэтычнага крыжа дапамагае сапраўднаму аўтару заўсёды трымацца крыху адасоблена.

Трэба заўважыць і яшчэ адну адметнасць: паэтэса не аддзяляе сябе ні ў чым ад пераломных момантаў у лёсе народа — у тым крывадушным кругавароце, пад які патрапілі розумы і душы:

Давай стряхнем,
как листья,
суету,
Увидим и услышим
ход неспешный
Времен, событий,
жизни — пустоту (?!)
Пространства,
неизвестности
кромешной...

Разважаючы аб сэрцавіне кнігі, суадносячы яе з агульным трагізмам нашага часу, які нярэдка адмаўляе прыгажосць і духоўнасць, аўтар заклікае чытача жыць днём, Богам дадзеным.

Думаецца, што ў рэшце рэшт наш розум адгукнецца на вечны покліч да ўзаемаіснавання — такая пазіцыя паэтэсы.

Генадзь ПАЦЫЕНКА

Гэтыя дзве рэцэнзіі ў рэдакцыю прыйшлі амаль адначасова. Як чытач лёгка заўважыць, і першая з іх, і другая — станоўчыя. У такім разе, каб не паўтарацца, лагічней за ўсё перавагу было б аддаць той, што лягла на рэдакцыйны стол першай. Тым не менш мы, пасля некаторых разваг, вырашылі ўсё ж надрукаваць абодва водгукі, бо аўтар другога Алесь Марціновіч гаворыць не пра ўсю кнігу Тамары Красновай-Гусачэнкі "Осень молодая", а толькі пра тую частку, што складаецца з новых твораў вядомай паэтэсы.

«Из чащи... прямо на весну»

У якую кнігу ні зазірнеш, за рэдкім выключэннем, абавязкова напаткаеш твор, прысвечаны ёй, "госці нябеснай — паэзіі". Не сказаць, аднак, каб ад усіх такіх публікацый атрымліваў задавальненне. Нярэдка здараецца, як і ў тыя, не такія яшчэ і далёкія савецкія часы: трэба верш пра камуністычную партыю — калі ласка, а што няма ў ім аніводнага новага матыву — такой бяды. Галоўнае для аўтара засведчыць, што ён — гэткі, як і ўсе. Дый і то не заўсёды зрабіць гэта па сваёй волі, а па напамінку выдавецкага рэдактара. Маўляў, сам разумееш, так трэба. Тым больш, што выхад (ці не выхад) кнігі шмат у чым залежыць менавіта ад гэтага рэдактара. Праўда, вершаў пра паэзію ніводзін рэдактар не замаўляе. Адбываецца ж яно, хутчэй за ўсё, па нейкім унутраным імпульсе. Тым самым: быць, "як усё".

Таму, калі разгарнуў новую кнігу Т. Красновай-Гусачэнкі "Осень молодая" — кніга гэтая адна з нядаўніх навінак выдавецтва "Мастацкая літаратура" — ажно здрыгануўся. Як кажуць, прыехалі! Зборнік адкрываецца менавіта вершам... "Поэзия". Таму са зразумелай насцярогай пачаў знаёміцца з гэтым творам. Але ледзь прачытаў першыя радкі, як адразу стала лёгка: рэдка калі напаткаеш у, так бы мовіць, "прадметным" творы тое, што гэтак лагодзіла б тваю душу і нейкай цёплай хваляй ахінала сэрца:

То полыхнет рябиной
в чаще,
То солнцем глянет
из-за тучи.
То нежностью мелькнет
вчерашней
Или толкнет небрежно
с кручи:
Лети!

Гэта — пра Яе Вялікасць Паэзію. Наколькі нечакана ўсё, настолькі і захапляльна. А які аб'ёмны паэтычны малюнак атрымаўся! Як пашыраецца ён у прасторы, гатовы паглынуць яе. Дый не толькі ў прасторы. Імгненне — і аўтарская думка пачынае па сутнасці ўбіраць у сябе сам час. І ўсё гэта па-ранейшаму праз паэзію. Праз яе невычарпальныя мажлівасці і яе ніколі да канца не зразумелую і не адчутую сутнасць. Гэта яна, паэзія, падштурхоўвае да дзеяння:

Лети!
Дорога горяча...
Маши руками, крыльев если
Не обрела...
Умей молчать,
Korga грохочет
Гром небесный.

Яна, паэзія, неаднолькава ставіцца да творцы, які імкнецца спасцігнуць яе таямніцу, як правіла, аднойчы азарыўшы, дае яму свайго роду выбар, ад якога ўжо залежыць, наколькі ўдасца самараскрыцца, застацца самім сабой, сказаўшы штосьці сваё, іншымі не заўважанае і неперададзенае:

То — злая мачеха,
То — мать,
И глубока ее наука:
Ввысь —
соловьем заклокотать,
Ниц — прахом, пылью...
И — ни звука.

Вершам "Поэзия" адкрываецца не толькі ўвесь зборнік, а і першы раздзел яго — "Новые стихи". У гэтым раздзеле не так і шмат твораў, што і не дзіўна: калі паставіць напісанне вершаў "на паток", ператварыць гэтую справу ў пастаянна працуючы канвеер, атрымаецца зусім не паэзія, а звычайнае вершаскладанне, ці яшчэ горай — вершаплётства. Аднак любы з новых твораў Т. Красновай-Гусачэнкі — абавязкова адкрыццё.

За ўсім гэтым — за дакладна схопленымі імгненнямі з жыцця, за свежымі вобразамі, за нечаканымі параўнаннямі — высокая культура пісьма, якая, вядома, з'яўляецца не адразу, а пры наяўнасці таленту прыходзіць з цягам часу. У таленце Т. Красновай-Гусачэнкі сумнявацца не даводзіцца, але відавочна і іншае: ад кнігі да кнігі ён усё ярчэй, глыбей выяўляецца, раскрываючыся часам, як кажуць, на мяжы магчымага.

Сцвярджэнні некаторых песімістаў (не ў апошнюю чаргу крытыкаў, дый не толькі беларускіх), што паэзія ў наш празмерна рацыянальны час не можа пасапраўднаму зацікавіць, рассыпаюцца ў парашок, калі чытаеш яе лепшыя вершы. Дастаткова хоць бы гэтага невялікага твора, у якім... прысутнічае тая ж самая паэзія высокага кшталту, без якой цяжка, калі хочаце адчуваць сябе духоўна багатым. Ужо гэтай ацэнкі стае, каб спасцігнуць усю непаўторнасць і загадкавую прыцягальнасць наступных радкоў:

Роща, как лимонное пятно,
За окном вагона пролетела
Легкою вуалью... И темно.
Лишь колеса
разрывают тело
Времени и мякоти ночной.
Поезд, как удава
хвост большого,
Мчит, со стыков
считывая бой,
К станции,
Где все начнется снова.

Высокі сэнс, глыбокі змест закладзены і ў заключным вершы падборкі раздзела "Новые стихи" — "Уже смеркалось". Прырода і чалавек, чалавек і вечнасць...У нейкай ступені — нават свайго роду "проза" звычайнага, але менавіта ў ёй, гэтай прозе, прысутнічае сапраўдная паэзія светаўспрымання. За ёй — Усявышні. Аднак за ёй і тое, да чаго не можа быць абыякавай душа чалавека, улюбёнага ў зямную прыгажосць і незаўважна для сябе пазнанага з таямніцай Космасу:

Уже смеркалось.
Свет стекал на запад.
Похожее
В сознании моем
Происходило:
Сумеречный запах
Пьянил,
Просачиваясь
Сквозь мороз.
Тепла начало
По ветвям бродило,
Происходило
Что-то
На земле,
И мартом
Завтрашним
Вокруг сквозило,
Светились
Вербы
Золотом во мгле...
Хоть на ветвях
Еще зима качала,
В оранжевом
Я видела сосну,
Шла буреломом
И
Так ясно знала:
Из чащи выйду
Прямо на весну.

Я свядома абмежаваў сваю гаворку толькі новымі творамі Т. Красновай-Гусачэнкі, бо пра ранейшыя яе кнігі мне ўжо даводзілася пісаць, таму не хочацца паўтарацца. Магу толькі яшчэ раз засведчыць, што Т. Краснова-Гусачэнка ўпэўнена заняла ўжо адно з першых месцаў сярод тых прадстаўнікоў сучаснай беларускай паэзіі, якія пішуць па-руску. Глядзіш, каму-небудзь з мэтраў давядзецца крыху і паціснуцца, прапускаючы яе наперад.

Алесь МАРЦІНОВІЧ

Паэт... зямляк паэта

Аляксандр Бардоўскі жыве ў абласным цэнтры, працуе галоўным інжынерам РУП "Гомельтранснафта Дружба", з'яўляецца кандыдатам тэхнічных навук. А нядаўна калегі па працы сабраліся ў актавай зале прадпрыемства, дзе маглі яшчэ раз пераканацца ў слушным і вельмі трапным выказванні: калі чалавек таленавіты, дык ён таленавіты ва ўсім. А. Бардоўскі вынес на суд службоўцаў сваю кнігу вершаў "На крыжы тваіх рук", а калектыў мастацкай самадзейнасці выканаў шмат песень, напісаных Аляксандрам Міхайлавічам на свае вершы.

Неабходна адзначыць, што раней творы А. Бардоўскага друкаваліся ў часопісах "Нёман", "Форум" (Расія) і "Літаратурны Чарнігаў", у "Литературной газете", у тыднёвіку "Літаратура і мастацтва", "Звяздзе".

Пачынаючы свой аўтарскі вечар, творца падкрэсліў, што кніга вершаў пабачыла свет дзякуючы Алесю Пісьмянкову, які першы ўхваліў яго творчасць і параіў аднесці вершы ў выдавецтва. Аляксандр Бардоўскі і Алесь Пісьмянкоў — землякі, абодва выраслі на Бесядзі, пра якую напісалі нямала паэтычных радкоў. Аляксандр Міхайлавіч расказаў пра паэта-земляка, які, на вялікі жаль, у росквіце творчых сіл пайшоў з жыцця, прачытаў некалькі вершаў-прысвячэнняў.

Пра адно толькі змоўчаў А. Бардоўскі: мемарыяльная дошка, што адкрылася на будынку дзіцячай бібліятэкі ў г. Касцюковічы і ўвекавечыла памяць Алеся Пісьмянкова, з'явілася дзякуючы сябру і земляку.

Васіль ТКАЧОЎ

Казімір КАМЕЙША

Драўляны мост

Памяццю агністаю парэчак
Бераг зноў па сэрцы паласнуў.
Нейкі грузавік зламаў парэнчу —
І далёка ў хвалі сігануў.

Шалясціць задумлівы алешнік,
Белы кмен маркоціцца ў трысці.
І лілея,
ясная, як блешня,
На вадзе пагодліва трымціць.

Хто сказаў,
што мост той нерухомы?
Ён ляціць па хвалях, як каўчэг,
І адносіць нас далей ад дому,
Пушчу за сабою валачэ.

Помню, як вясёла і празрыста
Той драўляны бубен мне грымеў.
Праляцець на ім з вясёлым свістам —
Хто такога гонару не меў?!

Нават конь рабіўся ганарысцей,
Нібы джгаў агонь па капытах.
І стаяў, і плыў на ім кудысьці
Я, сямігадовы капітан.

Галаву чарнявую кружыла,
У вачах мільгалі высь і шыр.
Нібы ўсё — і поле, і сцяжыны —
У адзін спляліся грайны вір.

Буду плыць я праз лугі і тоні,
Слухаць спевы маладых пяюх,
Покуль не аглушыць той, бетонны,
Гарадскога водгулля абух.

Можа, нават радасна прычалю,
З роспачы цыгарку закуру,
Памахаю ручкаю адчаю,
Што не даспяваў, дагавару.

Хай на бераг сыдуць сум і пошасць,
Што піхалі мой намер на мель.
Ну а я, як капітан,
апошнім
Добры свой пакіну карабель.

* * *

І адпелі нябожчыка,
Жаль віном залілі.
Дождж задумлівым пошчакам
Сыпануў па зямлі.

Нешта сумна-сірочае
Ручаём паплыло.
Ах, якія харошыя
Сёння ўсе за сталом.

Нават вочы зайздросныя
З легкім дожджыкам слёз,
Нават вусны не злосныя,
Нават вушы і нос.

Добрым словам і ладам
Вылівалі хвалу.
Той, хто некалі лаяў,
Заспяваў: — Алілу...

Гэта ж мошкі ніводнай
Не пакрыўдзіў, бядак.
Але славай народнай
Быў абдзелен аднак.

Быў і добрым і мілым,
Меў і слабасць адну.
Воз, што двум не пад сілу,
Ён адзін скрозь цягнуў...

Уздыхалі суседзі:
— Гэта ж столькі хвалы...
Раптам грукнула недзе,
Аж хіснула сталы.

І насуперак смерці
Крыкнуў ён з-пад зямлі:
— Што ж вы брэшаце, чэрці,
Дзе раней вы былі?..

* * *

Жывеш, нібыта ўцёк з палону,
А ўсё ж пры ложку, пры страсе.
І рад не госцю —
паштальёну,
Калі ён пенсію нясе.

Хоць і даўно яе растраціў,
Пакуль яшчэ не атрымаў.
З табой удвух мы, коце-браце,
Сяброў і ворагаў няма.

Ты дрэмлеш ціха пры вазоне,
Ля запацелага акна,
І прадчуваеш свята сёння
Пад келіх горкага віна.

У нас нядрэнная разведка,
Паверхам ніжай і вышэй.
Вось зараз з'явіцца суседка,
Як дойдзе да яе вушэй.

Яна закружыцца, як шпулька,
Пацягне нітку на мяне.
Нібы з паштоўкі
прыгажунька,
Шчасліва вокам падміргне.

І больш не трэба анічога —
Так лёгка, светла на душы,
Як у нябожчыка якога
Пасля святочнае імшы.

Касмічная элегія

У полі ясных бляскаў навальнічных
Ляціць зямной прыдумкі капялюш.
Будзь асцярожным,
добры госць касмічны,
І зоркі мне маёй не запаруш.

Гадзіннік твой ідзе без перабою,
Ці ты яго на вечнасць накруціў?
Адвёртка, што абронена табою,
Ля зоркі самай ціхае ляціць.

А вунь і гайкі нейкае асколак.
Як згодна ў пары кружацца яны,
Нібы пярынкі над крылом анёла —
Здабытак цёмных нетраў
незямных.

Якія фантастычныя там фарбы,
Мы ў сне і то іх бачыць не маглі.
А я, нібыта не ў сваім скафандры,
Таўкуся,
вас чакаю на зямлі.

Зямля даўно дарожкі разаслала,
Ды трэба круг чарговы
паўтарыць.
Кружыць не можа
гэтак нават слава,
Як кружаць вас касмічныя віры.

Ну досыць. Пакружыліся.
Хапіла.
Але ляціцца лёгка караблю.
Ды і па зорцы хлопцы прыхапілі,
Вяртаючыся нанач на зямлю.

* * *

У Бервянец, Альбуць
і Смольню
Душа папросіцца сама.
О, як жа гожа і свавольна
Там Нёман бераг заламаў.

Пад звон пчаліны канюшыны
І плёскат лёгкага вясла
Зламаўся цень старой альшыны,
І сон мой вечнасць абняла.

Плыве і хвалі не вяртае
Назад стамлёная рака.
Старонкі новыя гартае
У іншых вёснах і вяках.

Што шэптам сёння мне казала,
Пацвердзіць новаю вярстой
Табе, каму ўсё казак мала,
Нашчадак, аднакрэвец мой.

О дай мне, Бог,
з тым сном прачнуцца,
Што яву з мроі прычакаў!
Як плыць і з чым не размінуцца,
Не падказала мне рака.

* * *

Вось ізноў я вам пра рэчку
Ні з таго і ні з сяго.
Эх, і вузенькія плечкі
У высокіх берагоў!..

Як гуляла, не гуляе, —
Адгуляла плынь даўно.
Где ты, глыбіня былая?
Толькі дно адно відно.

І глядзіш: цячэ не рэчка —
Толькі роднай рэчкі рэшткі.

Ты дарэмна, Час, смяешся
І пярэчыш мне яшчэ.
Так цячэ — не схамянешся, —
З краю роднага ўцячэ.

Уцячэ — не згледзіш нават,
Як вясною ручайкі.
Застанецца толькі назва.
Назвы мала для ракі!

* * *

Было... Буяла ўсё, цвіло,
Чмялямі, пчоламі гуло.

Плыло густым зялёным валам
Праз навальнічныя навалы.

Хоць перыў па ствалах пярун —
Усмешкай трэскала кару.

Гуло ў дупле, нібыта ў грубцы,
Хапала сонца кожнай дзюбцы.

І раптам недзе ўсё прапала,
Няўжо ты ўсё, душа, праспала?

Ужо і дуб стары даў дуба,
І маладому жыць не люба.

Алесь СПІЦЫН

SOS

Я тут нічога не знайшоў,
хаця сваю і выпіў чашу.
А. Сыс

1.

СЫС
Гучыць
Як SOS
Save our sols.
Яны сыходзяць—
Тыя,
Што шукалі
І не знайшлі нічога...

Яны сыходзяць—
Тыя,
Што гукалі
Нібы ў пустыні, дзе не чуюць...

А мы (якія засталіся)
Нялепшыя за іх—
Такія ж...
І лепей нават мовіць—
Тыя ж,
Хіба што толькі ў барацьбе
Яшчэ пакуль не склалі зброі,
І ў пустаце
Аглухлага
Сусвету
Гучыць
Наш SOS
(Save our sols)—
І вера нашая жыве,
Што адшукаем
І дагукаемся нарэшце
Да кагось...

Герояў шмат
На ўсіх не хопіць вуліц
Няма хіба тут тых,
Што чуюць...

2.

Я некралогаў не пішу —
Даруйце...

Прабачце,
Я
Не веру ў смерць...

* * *

Калі чарговая выспа
Аказалася не тваёй,
А рыхтаваць карабель
Становіцца
Звычкай...

Усё часцей
Аднекуль з-за небакраю
Прыходзіць у сэрца страх,
Што калі-небудзь
Астравы могуць скончыцца
І ніводзін з іх
Не будзе
Тваім...

* * *

Восень
Лімонамі спее на ліпах
Лісце

Прагна
Ловіць апошнія кроплі
Цёплага сонца

Часу
Так мала у яго засталося
Выспець

Ноччу
Пахам ды шолахам ціха палягуць
У ногі

Як добра —
Лісты застануцца навекі
Лістамі

Іначай
Хто б напоўніў паветра
Водарам даўкім
У хорамах лесу
Пад
Восень...

* * *

Яе вочы
Як травеньскі дождж
Вялізныя і вільготныя
Яе позірк
Журботна-неабсяжны
Як шэра-зялёная непагадзь

Мокрая пасма
Ліпне да ілба

Я не люблю прычасаны свет
Мне падабаецца неахайнасць
дажджу
І распушчаныя валасы
Травень слязлівы
Гэтая шэра-зялёная прастора
Жывая задуменная і вохкая
Як позірк
Дзявочы
Вочы...

Фота Віктара Кавалёва

Паездка

Прысвячаецца Х. Л. Борхесу

У нейкай краіне, у нейкім горадзе, на нейкай планеце (у дадзеным выпадку тапаграфія мае чыста ўмоўнае значэнне), у нейкі час, што далёка адлягае ад нашага ў бок будучыні альбо ў бок мінуўшчыны, адбыліся некаторыя падзеі, якія паводле майго меркавання, могуць уяўляць цікавасць і для нас. Але перад тым, як распачаць непасрэдна сам аповед, я дазволю сабе невялікі экскурс, які дапаможа асвятліць пэўныя бакі гэтай месцамі блытанай гісторыі.

Усё жыццё вышэйузгаданай краіны было закручана вакол Паездкі. Эканоміка тут таксама была скіраваная на Паездку. Тутэйшыя паэты і філосафы прысвячалі ёй паэмы і трактаты. Быў нават зафундаваны спецыяльны Ордэн Паездкі. Гэта адначасова была і ўзнагарода і грамадскае аб'яднанне з аднайменнай назвай, у якім гуртаваліся ўсе ўзнагароджаныя гэтым ордэнам, таму пабываць у Паездцы азначала далучанасць да пэўнай колькасці прывілеяў і абавязкаў. Пра Паездку гаварылі шмат і штодня, але неяк не пра яе, а ўсё збольшага вакол. І ці не з гэтай прычыны нат школьнае выхаванне мела на мэце Паездку, дзяцей рыхтавалі да яе і маральна, і інтэлектуальна, і фізічна. Яшчэ дадалі, што да Ордэна маглі далучыць не толькі за нейкія звышзаслугі перад грамадствам, гэта яшчэ мог здзейсніць камп'ютэр, беручы пад увагу высокі маральны ці інтэлектуальны ўзровень свайго абранца.

Спыню ўвагу на адным маладым чалавеку і выберу яго ў якасці галоўнага героя расповеда. Малады чалавек хутка скончыў школу. Ён амаль такі, як усе, ну, можа, крыху лепшы, крыху разумнейшы, крыху больш спартыўны, крыху больш самаахвярны. І ён таксама, як усе, марыць пра Паездку. Ён штодня чытае біяграфіі далучаных да Паездкі і разглядае іхнія партрэты. На іх тварах ён заўсёды заўважае пячатку вялікай таямніцы і вялікага ведання. Ён увесь час намагаецца ўявіць сабе, што такое Паездка, і заўсёды яму здаецца, што гэта абавязкова будзе нейкая серыя выпрабаванняў, якія запатрабуюць звышнамаганняў і выкарыстання ўсіх магчымых чалавечых рэзерваў. (У звыклым для нас разуменні гэта можна параўнаць з дванаццаццю подзвігамі Геракла.) А таму рыхтаваўся да Паездкі з яшчэ большай упартасцю. І з кожным днём у ім расло і ўмацоўвалася адчуванне, што ён будзе абраны.

І вось сапраўды з многіх тысяч годных і вартых Камп'ютэр назваў ягонае імя. І адразу па яго прыйшлі і забралі ў спецыяльны цэнтр, дзе забаранілі ўсялякія кантакты са знешнім светам і нават унутраныя кантакты звялі да мінімуму. У тым цэнтры ён прабыў роўна год, чаргуючы знясільваючыя трэніроўкі са строгімі пастамі і не ведаў, калі яго паклічуць у Паездку. Але вось жаданы дзень надышоў. Над юным неафітам быў здзейснены абрад у вялікай і цёмнай зале. Пры правядзенні рытуала былі задзейнічаны музыка, маскі, мячы, паходні. Сутнасць абраду заключалася ў абяцанні захоўваць любую давераную таямніцу, якой бы дробязнай ці наадварот вялікаю яна не падавалася. У звыклым для нас разуменні гэты абрад можна параўнаць з масонскім альбо яшчэ з якім абрадам патаемных супольнасцяў, што фігуравалі ў нашай гісторыі.

Пасля заканчэння сняданка, які насіў чыста сімвалічны характар, нашага героя пасадзілі на стары цягнік, які хадзіў па адзіным у краіне адрэзку чыгункі, спецыяльна пакінутым для гістарычна-азнаямляльных мэтаў. Паўтадзіны цягнік ехаў сярод прыгарадных краявідаў, яшчэ з маленства знаёмых нашаму герою. А пасля цягнік увайшоў у тунель, дзе цэлую гадзіну грымеў аб рэйкі ў абсалютнай цемры. Чаго толькі не перадумаў наш герой за гэтую гадзіну, якія толькі пачуцці не змяняліся ў ягонай душы! Але цягнік, нарэшце, выйшаў з тунеля і спыніўся. Юнаку загадалі выйсці з вагона. Было нязвыкла зноў убачыць сонца, і ў яго забалелі вочы. А калі ён зноў прызвычаіўся да святла, то пабачыў вакол сябе самы звычайны луг, на якім расла самая звычайная трава, над якім свяціла самае звычайнае сонца, а паміж зямлёй і небам, проста над галавой, спявалі самыя звычайныя птушкі. Ён не памятаў, колькі часу хадзіў па лузе, чакаючы далейшых загадаў. Ён нават спрабаваў адшукаць нейкія таемныя знакі ў зменлівых аблоках. Але загадаў не было, і ніякіх сімвалаў у навакольлі прачытаць не ўдалося. Душа бунтавала. Гэта ж самы сапраўдны падман. Як можна? Але ён душыў у сабе ўсе гэтыя пачуцці, і ўсё яшчэ спадзяваўся. Пералом наступіў незаўважна, але на твары гэта не адбілася ніякім чынам, твар знерухомеў ва ўзрушанай і адначасна суворай грымасе. Але позірк застаўся такім жа ўважлівым і спакойным. Бо ён разумеў, што за ім назіраюць. Ён не памятаў, калі зноў сеў у вагон. Думкі то абганялі экспрэс, то паўзлі марудней за слімакоў. Яны стукаліся адна аб адну і крышылі ўшчэнт усё тое высокае, што ўвасабляла для нашага героя Паездка. Ён ужо збіраўся ўстаць і выкрыць перад людзьмі, якія суправаджалі яго, усю гэту «паездку», але чамусьці стрымаўся і вырашыў, што раскажа ўсё па прыбыцці, больш значнай колькасці людзей, а потым вырашыў, што зробіць гэта на цырымоніі ўручэння ордэна, калі збярэцца шмат запрошаных і будзе прамая трансляцыя па тэлебачанні. Пасля прыбыцця юнака зноў адвезлі ў нейкі спецыяльны цэнтр, дзе ён быў на сорак дзён адрэзаны ад усялякіх кантактаў з людзьмі. Там ён шмат пра што думаў і нават пра тое, што не ўсе людзі вярталіся з Паездкі, значыцца і яны таксама спрабавалі распавесці пра Вялікую Хлусню. "Няўжо астатнія збаяліся гэта зрабіць?" — думаў ён, і сам жа абвяргаў сваю думку тым тэзісам, што на Паездку вылучаліся самыя смелыя і моцныя. І відаць, яны мелі нейкія важныя прычыны, каб не расказваць праўду, а значыць, Паездка павінна мець яшчэ нейкую таямніцу, і ён вырашыў, што абавязкова дабярэцца да яе сутнасці. І ён пачаў думаць. Ён папрасіў, каб яму прынеслі кнігі, якія расказвалі пра перадгісторыю Паездкі. Ён даведаўся, што раней людзі ўяўлялі гісторыю чалавецтва, як бясконцаўзыходзячую крывую прагрэсу, дзе развіццё ідзе ад ніжэйшага да вышэйшага, ад меншага да большага, ад кепскага да добрага. Так, спачатку людзі пакланяліся духам, потым развянчалі іх і пачалі шанаваць багоў, якім перадалі функцыі духаў і надзялілі новымі, потым самі ж зверглі гэтых багоў дзеля ідэі аднаго Бога, якому прыпісалі якасці абсалюту, затым апантана пачалі змагацца з гэтым Богам, каб замяняць яго то культам Розуму, то Вышэйшай Істоты. І паступова прыйшлі да Вялікага Нічога, пасля чаго жыццё чалавецтва, як віду, страчвала ўсялякі сэнс.

І тут ён зразумеў, што Паездка была прыдумана альтруістычнымі мудрацамі ягонай расы, каб хоць нечым запоўніць Вялікае Нічога і даць чалавецтву надзею. І гэта — самы найапошні шанц. І глыбокая тайна, і вялікае веданне адбіліся ненатуральнай для ягонага ўзросту тугой на твары.

Кароткія апавяданні

Сяргей ВЕРАЦІЛА

Вусны яго сцяла маўчанне, і ён успомніў пра абрад і клятвы, і цяпер яны падаліся яму поўнымі новага надмістычнага значэння. А потым была цырымонія ўзнагароджання, якую ён да гэтага колькі разоў бачыў па тэлебачанні, а потым быў банкет. Затым адбылася цэлая серыя сустрэч і выступленняў у розных установах, дзе ён расказваў пра Паездку ўрачыстымі і загадкавымі словамі. А потым пачалася будзённая праца, дзе была пэўная колькасць прывілеяў і абавязкаў.

І вось ён ідзе па вуліцы, на ягоных грудзях — Ордэн, у ягоным сэрцы — сум, на твары — сумесь вялікага ведання і горкай іроніі. Апошнім часам усё часцей яго стала наведваць думка, што кожнаму ў жыцці наканавана свая Паездка. На яго захоплена і замілавана пазірае зусім яшчэ дзіцячага выгляду юнак, якому, магчыма, таксама наканавана быць далучаным.

«Клапы»

Прысвячаецца імператару Марку Аўрэлію

Уратавацца ад клапоў было немагчыма. Зураб адзіны з нас выпавядаў філасофію стаіцызму. Але я мяркую, што і яму было не лягчэй, чым нам. Леў Мікалаевіч ставіў ножкі сваёй канапы ў міскі з вадою. Клапы не ведаюць мастацтва фарсіравання вадзяных перашкодаў. Затое клапы ведаюць пра покліч крыві. І дарогу да крыві расійскага генія яны знаходзілі, узлазячы па сценах на столь, і падалі зверху, адразу засоўваючы праз скуру свае прагныя хабаткі, каб дасягнуць жыццёва-неабходнага дзеля іхняга існавання прадукта. Міскі з вадою не ратавалі і нас, бо клапы ў гэтым жытле былі паўсюдна. Кожная шчыліна будана, збітага з дошак і абшытага ДВП, утрымлівала іх незлічоныя тысячы. Яны вылазілі па начах і атакавалі нашыя бедныя целы.

Цяпер я ведаю, што клапоў трэба тапіць, а тады мы злосна душылі іх, напаўняючы пакой пахам пяцізорачнага каньяку. А тады я не ведаў, што клапоў трэба тапіць, бо яны напаўзаюць ці не па пяць за кожнага раздушанага, мусіць, паводле закона кампенсацыі. Відаць, уласны пах уздзейнічае на нейкія іхнія рэцэптары, і яны пачынаюць пладзіцца, бы шалёныя. А, можа, ім папросту таксама падабаўся каньяк. Усе тыя ночы запар мы душылі клапоў, забыўшыся на адпачынак для сваіх стамлёных целаў. І ўжо блізу ранку мы забываліся на пару-тройку гадзінаў нервова-трывожлівага сну. Але і ў сне нашыя целы ўздрыгвалі, бо кожны атам быў поўны жахам клаповага нашэсця. Мы змагаліся як умелі адзіным даступным нам спосабам, адказваючы пляскатам далоні за кожны ўкус. Мы бясконца абмяркоўвалі бязлітаснасць нашых крэўных ворагаў, мы выношвалі планы лютай помсты, але ўсе нашыя прыдумкі заканчваліся традыцыйнымі ўдарамі ўласных далоняў па нашых жа ўласных пакусаных і стамлёных целах. І Зураб быў адзіны з нас, хто выпавядаў філасофію стаіцызму, але я думаю, што яму было не лягчэй, чым нам. Ён проста стараўся адпавядаць сваёй філасофіі. Ён а дзесятай гадзіне клаўся ў ложак, заплюшчваў вочы, крыжаваў на грудзях рукі і аддаваў сваё мускулістае цела на спажыву маленькім, цвёрдым крывапіўцам. А пятай гадзіне ён узнімаўся, выпіваў шклянку вады, падрыхтаваную яшчэ з вечара, рабіў зарадку, піў слабазавараны, але затое вельмі салодкі чай з белым хлебам, потым ізноў рабіў зарадку, і толькі пасля гэтага ішоў выконваць сваю цяжкую цяслярскую працу. Я падазраю, што ён ніколі не спаў. Прыгадваю адзін выпадак: неяк Зураб загнаў сабе пад вялікі палец нагі маленькі каменьчык. Ранка хоць і была невялікая, але моцна крывавіла, і мяркую, што была надзвычай балючай. Але Зураб адбыў працоўны дзень да канца і толькі тады скінуў з нагі сандаль, выкалупаў ножыкам надакучлівы прадмет, прамыў ранку фурацылінам, заліў ёдам і наляпіў пластыр. Зажывала на ім, як на сабаку, бо заўтра пластыра на назе я ўжо не бачыў. Менавіта на яго здольнасці трываць боль я і грунтаваў свае падазрэнні пра ягонае бяссонне. Мне здаецца, што ён увогуле ніколі не спаў, прынамсі да таго часу, пакуль нам не ўдалося знайсці эфектыўны сродак барацьбы з нашымі ворагамі.

Дзіўна, але кажуць, што чалавек можа прызвычаіцца да ўсяго, асабліва лёгка прывыкае да нечага прыемнага. Але вось да клапоў прызвычаіцца мы так і не змаглі, і ці не ўвесь пал нашых маладых душаў абрынаўся ў нянавісць да гэтых зусім не боскіх істотаў. Прывык да іх, мусіць, толькі Зураб, бо ён адзіны з нас, хто выпавядаў філасофію стаіцызму, і тое я часам падазраю, што ён толькі прыкідваўся спячым, а насамрэч яму было не лягчэй, чым нам. І я падумаў, калі б я пражыў сярод клапоў значна больш працяглы тэрмін, напрыклад пяцьдзесят тысяч год, то мая скура стала б цвёрдай як рог. І вось што цікава: сэрцу, каб ацвярдзець, патрэбны куды меншы тэрмін. Тысячагоддзяў на эвалюцыю мы не мелі, а таму мы прыдумалі спосаб выбаўлення, які, зразумела, быў выпрабаваны яшчэ да нас: мы занеслі свае сеннікі на дэзінфекцыю; і хоць потым ад іх смярдзела, але дзён дзесяць клапы нас не турбавалі. А потым усталявалася надвор'е, і мы змаглі спаць на шырокім пляскатым даху нашага будана, туды ўжо клапы не здолелі дабрацца.

Ідэя занесці сеннікі на дэзінфекцыю нарадзілася вось якім чынам. Неяк я распавёў пра тое, што аднойчы спаліў на печы сяннік. Печ была старая і прагарала, а я напаліў яе ў той вечар ажно да чырвані, і яшчэ да рання вата пачала тлець, і хоць я бухнуў на сяннік ці не з тузін цэбараў вады, ды яшчэ павесіў сяннік на плот пад марасейку, усё роўна да вечара ад яго засталіся вартыя жалю рэшткі. Больш я на тае печы не спаў.

І тут, пасля майго расповеда, Іван, якому палкая ўкраінская душа не дазваляла авалодаць ніякаю прафесіяй, акрамя грузчыцкай, прапанаваў аддаць агню нашыя сеннікі; маўляў, няхай гараць з нашымі крэўнымі ворагамі. Але ўрачыстага аўтадафэ не адбылося, бо Пётра, які працаваў вадзіцелем і быў самым рацыянальным з нас, запярэчыў Івану. Таму мы вынеслі сеннікі на вуліцу і кіямі выбівалі з іх клапоў. І тут я ўбачыў лютасць, з якой Зураб лупцаваў кіем. Увесь пал ягонай напалову грузінскай, напалову беларускай натуры выявіўся цалкам і начыста знёс філасофію, што нарадзілася на беразе зусім іншага мора. Зураб помсціў за ўсе ночы, калі ён, заплюшчыўшы вочы, толькі прыкідваўся, што спіць, а насамрэч яму было вельмі балюча, хоць ён і быў адзіны з нас, хто выпавядаў філасофію стаіцызму.

І вось што мне падумалася, калі я ўжо дапісваў апошнія радкі: цікава, ці кусалі клапы імператара Марка Аўрэлія, які таксама выпавядаў філасофію стаіцызму?

Перабудова

Вечнасць — дзіця з забаўкамі,
Вечнасць — дзіця на троне.

Геракліт Цьмяны з Эфеса

У нейкай адной дзяржаве, якая займала цэлую планету, жыццё было настолькі ўпарадкаваным, што некаму магло нават падацца нецікавым. Поры года змяняліся толькі на пэўных тэрыторыях. Сонейка і дождж размяркоўваліся ў патрэбных колькасцях над палямі і пашамі. Вулічная злачыннасць, школьная непаспяховасць, дарожныя заторы, падзенні самалётаў і іншыя падобныя непрыемнасці былі абсалютова выключаныя з жыцця.

Але некаторыя людзі разумелі, што такая звышуладкаванасць побыту можа адмоўна ўздзейнічаць на інтэлектуальныя здольнасці чалавецтва, і таму кімсьці была прыдумана перабудова. Ейныя сэнс і сутнасць заключаліся ў тым, што праз некаторы час: праз год, праз месяц (даты заўсёды былі нечаканымі і ніякай заканамернасці тут не было), усё мянялася сваімі месцамі. Усё — гэта зусім усё. Мяняліся назвы вуліц, нумары транспарту, мяняліся сваімі функцыямі ўстановы, прадпрыемствы і гэтак далей, у падобным рэчышчы. Усе гэтыя змены адбываліся звычайна цягам аднае ночы. Рабіць падобныя змены так хутка і без вялікіх стратаў дазвалялі высокія тэхналогіі, што адпавядалі агульнаму ўзроўню развіцця тутэйшай цывілізацыі. Можна сабе ўявіць: вось прачынаецца чалавек і адчувае лёгкі шок. За акном — незнаёмы краявід, на месцы ўлюбёнай кавярні — бюро пахавальных паслуг, нават у роднай жонкі — іншы колер валасоў. Карацей, на новае "ўпісванне" ў жыццё трэба патраціць пэўны час.

Большасць людзей ставілася да такіх змен абыякава, некаторыя цешыліся з гэткіх штукарстваў, былі і такія, якім гэтыя змены не падабаліся, яны нават выказвалі пэўную незадаволенасць. І вось адзін з такіх грамадзян вырашыў высветліць, дзе плануюцца і адкуль ажыццяўляюцца ўсе гэтыя перасоўванні. Спачатку ён вельмі спяшаўся, баючыся, што пры наступнай перабудове цэнтр зменіць сваё месцазнаходжанне, але потым да яго дайшло, што павінна існаваць нешта пастаяннае, што не мяняецца ні пры якіх абставінах, інакш тыя, хто ажыццяўляе гэтыя перабудовы, заблытаюцца ў сваіх дзеяннях. Тады ён пачаў метадычна даследаваць горад. Ён падзяліў яго на квадраты і праз некаторы час яму ўдалося напаткаць будынак, які выклікаў у яго падазрэнне. Цягам некалькіх перабудоў ён назіраў за будынкам і канчаткова пераканаўся, што ён з'яўляецца канстантай, заставалася толькі туды пранікнуць. Пасля пэўнай падрыхтоўкі яму ўдалося гэта здзейсніць. Сам будынак быў звычайным для архітэктуры горада, але ўнутры, апроч калідораў, нічога не было. На сценах не мелася нават ніякага намёку на дзверы. Пасля працяглых блуканняў чалавек зразумеў, што ўсе калідоры сыходзяцца як бы ў адной кропцы, і там ён напаткаў нешта падобнае на дзверы. Неўзабаве ягонае меркаванне спраўдзілася, і ён здолеў адчыніць гэтыя дзверы і патрапіць у адзіны ў гэтым будынку пакой.

Пакой уяўляў сабой даволі вялікае памяшканне, застаўленае мноствам камп'ютэраў. Усе экраны свяціліся і на іх былі розныя графікі, карты, дыяграмы, а на падлозе пасярод пакоя ляжалі дзіцячыя цацкі...

Арт-пацеркі

Позняй восенню ў Нацыянальным акадэмічным тэатры балета Беларусі адзначаюць... Валянцінаў дзень. Нават аднайменны тэлефільм штогод пра гэта нагадвае. І такое разыходжанне з традыцыйным календаром не здзіўляе ні дзеячаў мастацтва, ні яго аматараў, бо яны ведаюць: 30 кастрычніка нарадзіўся лідэр сучаснага Беларускага балета Валянцін Елізар'еў. Сёлета ў гэты дзень Майстра віншавалі з 60-годдзем. На сцэне Палаца Рэспублікі адбылася святочная імпрэза. Падчас кароткай афіцыйнай цырымоніі намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Аляксандр Косінец перадаў юбіляру прывітальны адрас Прэзідэнта нашай дзяржавы. У віншаванні гаварылася пра высокае майстэрства і тонкі густ В. Елізар'ева — выдатнага харэографа сучаснасці, чыя творчасць — сапраўдны нацыянальны набытак Беларусі, адзначалася яго грамадская дзейнасць. Прыемную місію выканала ў той вечар і кіраўніцтва сталічнага гарвыканкама, урачыста паведаміўшы пра наданне В.Елізар'еву звання ганаровага грамадзяніна горада Мінска. Незабыўным юбілейным "пачастункам" стаўся паказ аднаго з лепшых спектакляў В.Елізар'ева — "Карміна Бурана" (у галоўных партыях выдатна выступілі Л. Кудраўцава, К. Борчанка, А. Краўчанка,

Ю. Кавалёў, цудоўна гучалі хор, аркестр пад кіраўніцтвам М.Калядкі, уразілі галасы салістаў У. Пятрова, Т. Гаўрылавай, В.Стральчэні), а яшчэ — канцэрт зорак сусветнага балета з удзелам літоўскіх, расійскіх, украінскіх і лепшых беларускіх артыстаў. Сюрпрызам для публікі было дасціпнае і далікатнае ўлучэнне самога імяніннка ў першы і заключны балетныя нумары гала-праграмы. Сярод ганаровых гасцей юбілейнай вечарыны былі харэографы і мастацтвазнаўцы з сусветнымі імёнамі: Д. Зайферт (Германія), К. Усуі (Японія), С. Сухуа (Кітай), М. Баярчыкаў, Г. Маёраў (Расія), С. Суіні (Вялікабрытанія) ды інш.

Брэсцкая абласная філармонія арганізавала гастрольны тур Нацыянальнага канцэртнага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам народнага артыста краіны прафесара Міхала Фінберга па Берасцейшчыне. Канцэрты заслужанага калектыву прайшлі ўжо ў Камянцы і ў Баранавічах. 25 лістапада яго чакаюць у Кобрыне і Брэсце. Салісты аркестра прапануюць новую песенную праграму, а камерныя калектывы — музыку Напалеона Орды, як вядома, ураджэнца берасцейскага краю.

У Барселоне (Іспанія) на пачатку кастрычніка прайшоў VII Міжнародны фестываль дакументальных фільмаў "Docupolis-2007". У лік 12 стужак-фіналістаў фестывальнага конкурсу ўвайшла і "Завядзёнка" — работа беларускага дакументаліста, неаднаразовага прызёра міжнародных кінафорумаў Галіны Адамовіч. Яна выступіла тут як аўтар сцэнарыя і як рэжысёр.

С. ВЕТКА

Фота аўтара

Дзіця кіно

Журналіст па адукацыі, Анатоль Алай у якасці аператара і рэжысёра ўдзельнічаў у стварэнні больш як 100 дакументальных фільмаў, у тым ліку і падчас ліквідацыі наступстваў выбуху на Чарнобыльскай АЭС, і напісаў кнігу "Сустрэчы на ўсё жыццё". Асноўная ж тэма яго творчасці як рэжысёра — падзеі Другой сусветнай вайны. У фільмах "Его зарыли в шар земной" і "Марынеска" дыктарскі тэкст чытаў артыст з сусветным імем Інакенцій Смактуноўскі. Анатоль Алай, прыгадваючы Смактуноўскага, кажа, што гэтак пранікнёна прачытаць дыктарскі тэкст, як гэта зрабіў Інакенцій Міхайлавіч, пакуль не ўдаецца нікому.

Праца рэжысёра мае афіцыйнае прызнанне. Так, за фільм "Салдаты Італіі" ў 2004 годзе яму ўручылі дыплом ад Прэзідэнта Чувашыі, а ў 2006-м ганаравалі званнем лаўрэата спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Беларусі ў намінацыі "кінавідэамастацтва". Сёлета на VI Рэспубліканскім фестывалі беларускага кіно, што праводзіцца ў Брэсце, Анатоль Іванавіч атрымаў дыплом за вернасць герою і ідэалам дабра і справядлівасці ў працы над фільмам "Уладзімір Бядуля" — пра знакамітага чалавека, які палову стагоддзя ўзначальваў калгас "Савецкая Беларусь".

Рэжысёр А. Алай прыступіў да здымак фільма, прысвечанага аднаму з кіраўнікоў БССР Панцеляймону Панамарэнку, перыяд праўлення якога займае ў гісторыі нашай краіны важнае значэнне і які ён сам назваў "незабыўным часам".

— Анатоль Іванавіч, ці маюць падзеі, пра якія вы імкняцеся распавесці ў новым фільме, асаблівы для вас сэнс?

— Пры Панамарэнку, які ў 1938 годзе быў прызначаны на пасаду першага сакратара ЦК КПБ, адбылося аб'яднанне беларускіх земляў. У Брэсце тады прайшоў сумесны парад савецкіх і нямецкіх войскаў, у якім з нашага боку камандаваў Крывашэін, а з нямецкага — Гудэрыян. Парад быў у гонар таго, што ў Полыпчы "адбілі" Брэсцкую крэпасць. Многія нашы камандзіры атрымалі нямецкія ўзнагароды, але пра гэта пакуль гісторыя маўчыць... А потым пачалася вайна. Гісторыя — гэта факт, ад яго нікуды не дзецца. Людзі павінны ведаць праўду, і яны ўсё зразумеюць.

"Панцеляймон Панамарэнка", магчыма, стане галоўным фільмам у маёй творчай біяграфіі. Мой бацька быў ваенным доктарам, служыў на мяжы і прапаў без вестак. Можа, ён ляжыць пад сценамі Брэста ці Гродна. Таму мяне цягне ў тыя мясціны. Ужо дзесяцігоддзі я шукаю сляды свайго бацькі, але ніяк не магу знайсці.

— Хто вам дапамагае разабрацца ў лёсе героя вашага новага фільма?

— Калі меркавалі над тым, хто зможа напісаць яго сцэнарый, былі прапанаваныя нашы вядомыя гісторыкі: дырэктар Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь Вячаслаў Селяменеў і літаратар Віталь Скалабан. З Селяменевым я ўжо рабіў фільм "У двух кроках ад гільяціны". Гэта чалавек, сапраўды захоплены працай, сваёй справай, ведае шмат дакументальных матэрыялаў і вельмі таленавіты. З Віталем Скалабанам я знаёмы толькі па яго публікацыях, але, думаю, наша супрацоўніцтва дазволіць стварыць фільм, які будзе заўважнай з'явай у культуры краіны.

— Анатоль Іванавіч, вы "маеце імя" ў кінадакументалістыцы, і ў вас, напэўна, ёсць свае правілы стварэння фільма. Што, на вашу думку, найперш патрэбна для таго, каб ён атрымаўся?

— Вялікае значэнне ў дакументальным кіно мае сінхроннае інтэрв'ю. Вельмі цяжка атрымаць давер свайго героя, з якім даводзіцца размаўляць перад аб'ектывам камеры, каб ён адчуваў сябе, як у гутарцы з блізкім чалавекам і хацеў раскрыцца і нават паспавядацца. Многія фільмы выглядаюць вельмі слабымі найчасцей з-за таго, што не адбылося сапраўды шчырай размовы з героямі. Нікому не хочацца казаць пра тое, што паказвае яго не зусім з пазітыўнага боку, але з такіх момантаў ствараецца праўдзівы вобраз чалавека. Жыццё ж нясе ў сабе і выпрабаванні, і рашэнні, і пакуты, якія паказваюць сапраўдныя пачуцці і сапраўдную гісторыю нас саміх. Пра чалавека ў дакументальным кіно гаворыць і тая памяць, што пра яго захавалася.

Яркі момант у мяне быў, калі я здымаў у Маскве фільм "Сталін і Геля". На Краснай плошчы, ля Дзяржаўнага гістарычнага музея стаяў артыст, загрыміраваны пад Карла Маркса, а побач з ім такі ж Ленін. Я звярнуўся да Леніна: "Уладзімір Ільіч, чаму вы выйшлі з Маўзалея?" А ён мне кажа: "Ведаеш, сынок, змогся ляжаць без Крупскай, вось і выйшаў". Нават такі эпізод многае кажа. Мы ледзь не маліліся на Леніна, на Сталіна, рабілі з іх святых, але мала казалі пра людзей, якія сваёй працай, сваім лёсам, а не штучным аўтарытэтам ствараліі гісторыю нашага народа. Таму, калі я атрымаў магчымасць зняць фільм пра Уладзіміра Бядулю, то з вялікім задавальненнем узяўся за гэта. Размовы з чалавекам незвычайнага лёсу пакінулі ўва мне вельмі глыбокі адбітак. Уладзімір Лявонцьевіч зараз застаецца ганаровым старшынёй гаспадаркі, а імя яго залатымі літарамі ўпісана ў гісторыю нашай дзяржавы. Я мог пагаварыць пра Бядулю са знакамітымі людзьмі, якія з ім сустракаліся, але ж гэта не паказала б яго сутнасці. Таму я даў слова на экране работнікам гаспадаркі, з якімі герой фільма поплеч прайшоў усе гады нялёгкай старшынёўскай працы.

— У вас багата фільмаў пра Вялікую Айчынную вайну. Чым вас як рэжысёра-дакументаліста, творцу, цікавяць тагачасныя падзеі, іх наступствы?

— Са мной тады працаваў адзін з лепшых журналістаў, з якімі мне даводзілася сустракацца, вельмі таленавіты чалавек, Ігар Асінскі. Ён быў тады спецкарам газеты "Правда" ў Германіі, і фільм "Его зарыли в шар земной" мы здымалі разам. Мой дэбют у рэжысуры звязаны з імем гэтага чалавека. Я не забуду ніколі свой першы фільм, калі ў сталічных кінатэатрах, дзе паказвалі "Не плачце па мне" — пра Аляксандра Ісачова, мастака з цяжкім лёсам, была даўжэзная чарга. Фільм атрымаў тады сапраўднае прызнанне гледача, што для творцы, тым больш для дэбютанта, самае важнае.

А цікавасць да тэмы Вялікай Айчыннай вайны праявілася ў мяне яшчэ падчас дыпломнай працы. Кіраўніком у мяне была тэатразнаўца Таццяна Арлова, кіназнаўца Ефрасіння Бондарава — рэцэнзентам. А тэма дыпломнай работы — вайна з фашызмам у беларускім дакументальным кіналетапісе.

Маё жыццё прайшло на кінастудыі "Беларусьфільм". Ад першага дня і дагэтуль працую тут, прайшоў усе прыступкі — ад асістэнта асвятляльніка да рэжысёра вышэйшай катэгорыі. Я — дзіця кіно, і валодаю ўсімі асноўнымі кінематаграфічнымі прафесіямі. Кіно — маё жыццё, іншага для сябе і не жадаю. І не шкадую, што абраў сабе менавіта такую тэму, бо раскрыўся і раскрываюся ў ёй напоўніцу.

— Пасля таго, як выходзіў фільм, ці меў ён жыццёвы працяг?

— Нядаўна ў Цэнтральнай кнігарні я ўбачыў кнігу "Мой бацька — капітан Гастэла", дзе сын героя падтрымлівае тую версію, што яго бацька ўпаў на падбітым самалёце каля вескі Дзікшняны. Але я ведаю, што там быў падбіты іншы самалёт — Аляксандра Маслава. Цяпер ёсць яшчэ меркаванне, што Гастэла ўпаў каля вёскі Мацкі. Таму пытанне засталося адкрытым. Я пазваніў сыну Гастэлы і прапанаваў падключыцца да нашых пошукаў: ён жа журналіст. Я яму сказаў: "Мой бацька прапаў без вестак, ваш бацька, хрэстаматыйны герой, — таксама. Давайце шукаць". Ён адказаў: "А вы ведаеце, што рабілі з тымі лётчыкамі, якія траплялі, пасля таго, як былі збітыя, на тэрыторыю ворага?" — і паклаў трубку. Але самалёт яго бацькі яшчэ у 1939 годзе таксама быў падбіты (Гастэла ў экіпажы тады быў штурманам), апусціўся на тэрыторыю ворага, потым вярнуўся ў сваю вайсковую частку і лётчык не быў пакараны. Можа, і ў 41-м Гастэла застаўся жывы і быў тым лётчыкам, які змог скочыць з парашутам? Я не хачу на такіх падзеях і сітуацыях зрабіць сабе імя. Я проста хачу дазнацца праўды. Я здымаў фільмы пра ваеннапалонных у Канадзе, Швейцарыі, усю Германію аб'ездзіў, Польшчу, Ліхтэнштэйн. Таму я ведаю, што хоць сын Гастэлы і настойвае на сваёй версіі, але ўпотай думае пра тое, дзе ж яго бацька — як не дае спакою і мне жаданне шукаць майго бацьку. Я не выключаў і дагэтуль не выключаю нічога: шукаю і сярод ваеннапалонных, і сярод сасланых... Мой сыноўні абавязак — знайсці свайго бацьку, знайсці тое месца, дзе ляжаць яго астанкі. Можа, таму і прыйшоў у дакументальнае кіно, хоць спачатку і не думаў пра гэта.

Гутарыў Андрэй КЛЮЧНІКАЎ

На здымку: А. Алай (справа) з героем свайго фільма У. Бядулем.

Гульні творцаў

Сёння гульня ўвайшла ў жыццё амаль усіх людзей, і да яе часта ставяцца як да магутнага выхаваўчага інструмента. Нездарма можна пачуць, што мы жывём у эпоху "чалавека, які гуляе".

Выстаўка, арганізаваная сталічнай мастацкай галерэяй "Універсітэт культуры" пад назвай "Тэхна-арт. Час гульні", вельмі добра дэманструе нам тыя гульні мастакоў, якія сталі вельмі даступнымі са з'яўленнем высокіх тэхналогій. Гэта ўжо чацвёртая па ліку выстаўка такога кшталту, і можна з упэўненасцю сказаць, што тэхна-арт як асобная плынь мастацтва набірае абароты ў нашай краіне.

Ідэя сёлетняй выстаўкі, паводле слоў дырэктара галерэі Дзяніса Барсукова, — мастацкімі сродкамі акрэсліць гульню як сацыякультурны феномен сучаснасці. Узяліся за гэта майстры Уладзімір Цеслер, Вадзім Качан, Андрэй Шчукін, Аркадзь Бірылка і многія іншыя. Прадстаўлены работы ў такіх напрамках, як 3D і

flash-анімацыя, камп'ютэрная графіка, лічбавы мантаж, а таксама розныя арт-аб'екты, адзін з якіх — "Танкавая атака", прадэманстраваны майстрам па металапластыцы Андрэем Капуснікавым.

Прэзентацыя сёлетняга "Тэхна-арту" была насычаная элементамі шоу. Адпаведная музыка, святло, робаты, якія гулялі па залах і здзіўлялі гасцей, — усё гэта ператварала выстаўку ў невялічкі фестываль.

"Суправаджэнне мастацтва шоу-элементамі робіцца для таго, каб зрабіць гэтае мастацтва больш даступным для шырокага кола людзей, — патлумачыў Д. Барсукоў. — Шоу, па-першае, надае святочную атмасферу выстаўкам, а па-другое, дапамагае чалавеку зразумець тыя творы, што дэманструюцца ў галерэях".

Алесь КІРЫКОВІЧ

Фота Святланы Берасцень

Пра цара Эдыпа

Ці можна ўявіць сусветную культуру без музыкі Ігара Стравінскага? Наўрад. Бо калі б не было гэтага геніяльнага наватара ў сферы кампазітарскай творчасці, зусім па-іншаму выглядала б, ці, дакладней сказаць, гучала б, музычная панарама XX — XXI стагоддзяў.

Некаторыя людзі любяць пры нагодзе падкрэсліць, што Ігар Стравінскі "меў беларускія карані". Меў. Ды ці ведаў, ці задумваўся пра гэта? А той, хто мае звычку называць імя кампазітара ў ліку нашых сусветна вядомых землякоў, — ці ведае яго музыку? Да слова, гучыць яна ў нашых канцэртных залах не надта часта. Піяністы граюць транскрыпцыю балета "Пятрушка". Творчасць І. Стравінскага прадстаўленая ў рэпертуары Нацыянальнага акадэмічнага тэатра балета Беларусі ("Вясна свяшчэнная", "Жар-птушка"), неаднаразова звяртаўся да яе Ансамбль салістаў "Класік-Авангард"...

Пагартаць старонкі партытур І. Стравінскага, якімі (будзем шчырымі!) больш ці менш адкрыта сілкуюцца прадстаўнікі ўжо не аднаго кампазітарскага пакалення, — гэта пазнаваўча і павучальна. Тым болей, што сёлета свет адзначае 125 гадоў з дня нараджэння Майстра. Менавіта гэтай даце прысвяцілі прэм'еру яго оперы-араторыі "Цар Эдып" артысты Нацыянальнага акадэмічнага тэатра оперы Беларусі. Прыгадаўшы, што з часу першага выканання гэтага твора (1927) мінула 80 гадоў, а ў нас ён раней не выконваўся, дык можна лічыць падзею асабліва знамянальнай. Адбылася яна ў Вялікай зале сталічнай філармоніі ў межах XXXIV Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Беларускай музычная восень".

Лібрэта "Цара Эдыпа" стварыў сам І. Стравінскі разам з Жанам Както, узяўшы з аднайменнай трагедыі Сафокла толькі асноўныя сюжэтна-псіхалагічныя моманты. Тэкст быў перакладзены на лацінскую мову — як сімвал вечнага і універсальнага. Трагедыя Эдыпа, якому ні выдатная інтуіцыя, ні празорлівасць не дапамаглі пазбегнуць страшнай пасткі акалічнасцяў, зрабілася тэмай спачування. Увасобленая магутнымі вакальна-сімфанічнымі сродкамі (выканаўцы — салісты, аркестр і мужчынская група хору Нацыянальнага акадэмічнага тэатра оперы Беларусі), падтрыманая далікатным каментарыем Чытальніка (арганічна, суладна музычнай атмасферы гучала слова Валерыя Анісенкі), тэма гэтая, дзякуючы дырыжору Віктару Пласкіну, прайшла дынамічнай і псіхалагічна выразнай лініяй праз драматургію твора.

Няма сумніву, што пра гісторыю жыцця егіпецкага цара Эдыпа сёння ведаюць куды менш, як пра "эдыпаў комплекс". Старажытнагрэчаскі мудрэц Сафокл, а за ім і стваральнікі музычнай версіі антычнай трагедыі, засяроджвалі ўвагу не на загадках падсвядомасці індывіда, а на таямнічай залежнасці асобы ад наканаванага звыш: ад лёсу не ўцячэш і не схаваешся, першая ж спроба яго абхітрыць спараджае чараду неверагодных міжвольных памылак і караецца жахлівай развязкай. І не асуджэння, а шкадобы і спачування вымагаюць гаротныя ахвяры злачынных падзей, прадказаных аракулам.

Віктар Пласкіна (заслужаны артыст Украіны, ён адносна нядаўна прыйшоў за пульт галоўнага дырыжора Сімфанічнага аркестра нашага Вялікага тэатра) напоўніцу скарыстаў багацце партытуры І. Стравінскага. Красамоўны аркестр; жывое, выразнае мастацтва хору (хормайстры Ніна Ламановіч, Сяргей Аграновіч). Яркая ігра вакальных тэмбраў, артыстызм салістаў: была прадстаўлена багатая палітра нізкіх мужчынскіх галасоў — Васіль Кавальчук (Крэонт), Аляксандр Кеда (Тырэсій), Дзмітрый Капілаў (Вястун), пранікнёна і высакародна прагучала партыя Іякасты ў выкананні Аксаны Якушэвіч, далікатным штрыхом дадаўся ў ансамбль чыннікаў дзеі лірычны тэнар Юрыя Гарадзецкага (Пастух), інтанацыйнай разнастайнасцю, драматычнай глыбінёй уразіў тэнар Янаша Нялепы, чый Эдып стаў сапраўдным цэнтрам прыцягнення ўвагі не толькі ўсіх персанажаў оперы-араторыі, але і публікі...

Дзіўная метамарфоза здарылася з рэальным часам: менш як за гадзіну прайшлі эпізоды нібыта зусім і не адцягнена-ўмоўнага, а "цеплакроўнага" жыцця з яго адвечнымі жарсцямі, чалавечым самападманам, ілюзорнасцю перамог над монстрамі, спадзевам на шчасце, якое не бывае вечным.

Затое вечнымі бываюць загадкі жыцця — і мастацтва, цудоўныя праявы якога спакваля падводзяць уражаных людзей да шчырых воплескаў і міжвольнага воклічу: "Брава!"

●

Чытачам нашым наўрад ці трэба тлумачыць, што змешчаны тут партрэт адлюстроўвае аблічча Ігара Стравінскага часоў яго пераезду ў ЗША. Праўда, ён чымсьці нагадвае другога "амерыканскага расіяніна" — Сяргея Рахманінава, музыка якога таксама была прадстаўлена ў праграме вечара: прагучала яго Сімфонія № 3.

Канцэрт пад папулярнай рубрыкай "Беларуская опера прадстаўляе...", які маэстра В. Пласкіна правёў у Беларускай дзяржаўнай філармоніі, застанецца ў летапісе музычнага жыцця краіны адной з найбольш уражлівых старонак.

Святлана БЕРАСЦЕНЬ

Віктар Уладзіміравіч РОЎДА

Беларускае нацыянальнае мастацтва панесла цяжкую страту. На 86-м годзе жыцця пасля працяглай хваробы памёр выдатны дзеяч харавога мастацтва, народны артыст СССР, народны артыст Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор Акадэмічнага хору Нацыянальнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь, загадчык кафедры харавога дырыжыравання Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, прафесар Віктар Уладзіміравіч Роўда.

Роўда Віктар Уладзіміравіч нарадзіўся 23 лістапада 1921 года ў г. Смаргонь. Скончыў Вільнюскую духоўную семінарыю, дырыжорска-харавое і вакальнае аддзяленне Вільнюскай кансерваторыі ў прафесара К. Кавецкаса ў 1951 годзе, аспірантуру Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі імя П. І. Чайкоўскага па класе выдатнага майстра харавога мастацтва А. В. Свешнікава. Далейшая работа ў якасці хормайстра Дзяржаўнага акадэмічнага хору СССР і выкладчыка Маскоўскага харавога вучылішча, паспяховая абарона кандыдацкай дысертацыі па праблемах выканання народнай песні ў акадэмічным хоры вылучылі В. Роўду ў шэрагі вядомых музыкантаў-інтэрпрэтатараў харавога спеву, вопытных дырыжораў.

З 1955 года В. У. Роўда — вядучы хормайстар Дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэлы БССР і нязменны кіраўнік кафедры харавога дырыжыравання Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. За час работы ім падрыхтавана больш як 800 хормайстраў. Вялікая колькасць фондавых запісаў і праведзеных ім канцэртаў у якасці мастацкага кіраўніка і галоўнага дырыжора Акадэмічнага хору Нацыянальнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь трывала сцвердзілі імя В. У. Роўды ў ліку выдатных дзеячаў сучаснага музычнага мастацтва. З яго іменем звязаны творчыя дасягненні і міжнароднае прызнанне канцэртнага хору студэнтаў Акадэміі музыкі, правядзенне рэспубліканскіх святаў, аглядаў дзіцячай і дарослай харавой самадзейнасці, неперaўзыдзеная інтэрпрэтацыя літургічнай музыкі.

За сваю самаадданую творчую працу В. У. Роўда ўдастоены ордэна Францыска Скарыны, прэміі "За духоўнае адраджэнне". Ён з'яўляецца поўным кавалерам ордэна Святога князя Данііла Маскоўскага.

Светлая памяць пра Віктара Уладзіміравіча Роўду назаўсёды застанецца ў сэрцах яго родных, блізкіх, калег, вучняў, усіх знаўцаў музычнага мастацтва.

Косінец А.М., Рубінаў А.М., Матвейчук У.Ф., Зімоўскі А.Л., Аўдзеева Н.П., Рылатка У.П., Рашчупкін А.Ф., Лучанок І.М., Яфімава Л.Б., Казінец М.А., Ізворска-Елізар'ева М.М., Ісаеў А.М., Гільдзюк Ю.М., Анісімаў А.М., Ламановіч Н.І.

Проста прырода

У сталічным Палацы мастацтва гасцявалі жывапісцы са Светлагорска. Іх вернісажу не папярэднічала гучная рэклама. Тым не менш, удзячныя гледачы і сапраўдныя знаўцы папулярнага ў публікі пейзажнага жанру знаходзілі дарогу ў выставачныя залы шматнаселенага палаца, дзе адкрывалі для сябе своеадметны і шчыры свет Віктара Баранава ды Мікалая Кухарэнкі.

Віктару Баранаву — семдзесят адзін, Мікалай Кухарэнка маладзейшы за яго на дваццаць гадоў. Першы родам з-пад Гомеля, другі нарадзіўся на Браншчыне, вучыўся ў Разані ды Санкт-Пецярбургу. Сёння абодва мастакі жывуць у Светлагорску. Мяркуючы па тым, што дзве творчыя асобы пагадзіліся прадставіць свае работы ў агульнай выставачнай прасторы, у іх эстэтычных поглядах, у стаўленні да прафесіі, да жыцця ёсць нямала агульнага.

Віктар Баранаў піша нацюрморты, пейзажы. З асаблівым замілаваннем адлюстроўвае наваколле Светлагорска. Варта прыгледзецца да шчырых, нейкіх даверліва-безабаронных і немудрагелістых вобразаў яго карцін, як нібыта пачуеш кранальную лірычную музыку прыроды, адчуеш родную ўтульнасць сялянскіх хат за цеплынёй асветленых вакенцаў, "подых бацькаўшчыны" — у пахкім дымку з коміна...

Шчыра піша прыроду Мікалай Кухарэнка, захапляючыся сакавітасцю яе натуральных фарбаў, багаццем колеравых нюансаў. І на гэтым свяце прыроды арганічна ўспрымаўся, здаецца, адзіны прадстаўлены ў экспазіцыі партрэт — псіхалагічна выразнае аблічча пейзажыста Віктара Баранава, напісаны Мікалаем Кухарэнкам.

●

Адначасова з творчасцю светлагорскіх жывапісцаў у Палацы мастацтва праходзіла выстаўка пейзажаў Аляксандра Дзяшко. Прадстаўленыя работы без лішніх каментарыяў далі зразумець, наколькі дынамічна мяняўся (і працягвае мяняцца) падыход гэтага мастака да ўвасаблення вобразаў прыроды: зважанне на традыцыі рэалізму пераходзіла ў няўрымслівыя пошукі асаблівай відовішчнасці, засяроджанасць на гульні светлаценю, імкненне зафіксаваць незвычайны хуткаплынны стан наваколля ці ў спробу перадаць зрокавае ўспрыманне паветра...

Напрыклад, плёнам яго паездкі на Каўказ сталася серыя малюнкаў і накідаў пяром, тушшу, сангінай. Вандроўка па Крыме натхніла на філасофскае асэнсаванне прыроды, стварэнне кідкіх, гучных па каларыце, жывапісных работ. Аднак — і гэта адзначаюць знаўцы творчасці Аляксандра Дзяшко — эпіцэнтрам яго захаплення была і застаецца прырода Беларусі. Свае пачуцці, выкліканыя, напрыклад, наваколлем Лагойска, Хатыні, далягляда мі Мінскага мора, мастак выказвае праз "прыхаванае хваляванне" ў высакародна-стрыманай колеравай гаме. Аднак для прызнання ў любові да беларускіх краявідаў не скупіцца ён і на яркія мажорныя акорды.

А пошук ураженняў і свежых сродкаў мастацкай мовы не спыняецца...

Лана ІВАНОВА

На здымках: М. Кухарэнка, "Май. Поўдзень" (2005); А. Дзяшко, "Крыніца" (2006); В. Баранаў, "Зімовыя прыцемкі" (2006).

Фота Кастуся Дробава



№ 47 23 лістапада 2007 г. ЛіМ

Велічальная песня мове народа

Рыхтаваўся да ад'езду ў свае Зубрэвічы, збіраўся на аршанскую электрычку, а тут нечакана прынеслі бандэроль. Я раскрыў яе, пачаў гартаць кнігу... І зачытаўся! З першай жа старонкі.

"Што ты мацаешся, як сьляпы ў торбе? Вунь уключацель", — пасмейваўся нехта з некага.

"Яму добра, старому: памёр — і німа дзялоў ніякіх, усё ў парадку", — задумваўся хтосьці іншы.

"Спала столькі, як каню перакаціцца". Ай, як жа хораша, якое параўнанне, якая выразнасць!

"Я ні аднаго класа не кончыла, але дай мне грошай што паболей — сашчытаю", — падміргвае субяседніку жартаўніца.

"Замуж я ішла за ўдаўца, а ў яго ўжо чацьвёра дзяцей было: два мальца і дзве дзяўчыны. Пасьля сваіх дзяцей яшчэ пяцёра. Усіх вывучыла". Гэта ўжо лёс. Цэлае апавяданне, а, можа, і аповесць.

Лёс бывае розны. І такі вось усмешліва-самаахвярны:

"Як вяселле было, маладая цераз кажух ішла — на дзяжу, засланую кажухом, садзілася. Я свайго так любіла, дык села б абы на што".

А бывае лёс і страшны: усё добра нібыта і раптам:

"Я сына люблю свайго. Я малая, а ён вялікі, вышэй за сваю Галю. Мне не было калі расці. Рана асірацела. Яшчэ малая была, як бацька забіўся, зваліўся з гары разам з мяшком. Маці гэтак жа, малацілі жыта, адарваўся цэп і па галаве, прывялі ў хату — уся ў крыві. Я адна асталася, і мне ўсю работу прыходзілася рабіць. Вось так і згадавалася".

Пра голад мы расказваем вось так:

"Мая суседка пякла бліны з ліпы. Дала мне аднаго пакаштаваць. Узяла, гляджу — зялёны. Адкусіла, а палкнуць не магу. А я дык усё "булкі" з вераб'юшкі пякла. І дзеці так елі з малаком!"

І такія вось гаротныя, шчымлівыя ўспаміны жанчыны, якая і цяпер нікога не асуджае, ні на каго не злуецца:

"Хапіла мне гора, увесь век б'юся, як рыба аб лёд. Мужык быў — дык толькі і ведаў, што хлыбыстаць гэтую гарэлішчу. Адзін раз паехаў купіць мукі, кірасіну, вярнуўся — на двары ноч. Глянула: а божачка! Кірасін у муку выліўся, а ён ляжыць — язык у роце не шаволіцца".

І ўсё гэта запісана толькі на адной Лагойшчыне!

А яшчэ з кнігі я даведаўся, што на Клеччыне кажуць: "Не чалавек, а кіпень"; на Валожыншчыне радуюцца: "Во грады, дык грады. Цыбуля — ну проста з небам гаворыць"; на Смалявіччыне жартуюць: "Ведаеце, стол без хлеба, што сабака без хваста".

"Як спёка — так каровы ў рацэ, а раз у рацэ — то малака няма", — заўважаюць на Вілейшчыне. "Як убачыла Аксінька свайго бацяна п'янага, дык адразу пад пяткамі стала калоць", — горка ўсміхаюцца на Старадарожчыне. "Углядзела, што плечы як засланка, і выйшла замуж за яго", — і сёння не нарадуецца сваім выбарам жанчына з Лунінецкага раёна. А на Петрыкаўшчыне пацяшаюцца: "Якая там рыба? Што ён налавіў? Адны бліскушкі". Чуеце, бліскушкі! Плотачкі ўсяго!

Я знарок, сумысле прывёў тут шмат цытат. Каб кожны чытач адчуў і пасмакаваў, пра што і як мы, беларусы, гаворым. Усё гэта — жывое народнае маўленне. Якая павага да слова, якія досвед і акраса, якая далікатнасць, якая чысціня, якая натуральнасць выказвання думкі! Чытайце, недавяркі і пустадомкі! Гэта ж вы такую цудоўную мову зневажаеце, кажучы, што беларусы гаворыць на нейкай трасянцы. Якая вам трасянка?! То ж гаворыць сам народ на сваёй спрадвечнай мове! Пачытайце гэтыя запісы, і вы пераканаецеся, убачыце, як натуральна і мілагучна яна гучыць, наша мова-працаўніца, мова-руплівіца!

Усе прыведзеныя тут цытаты я ўзяў з кнігі Ніны Гілевіч "Слова — роднае, жывое, свабоднае". Яшчэ раз перапрашаю, што, магчыма, я злоўжываю цытатамі, але ж што зробіш, калі гэтую кнігу хочацца цытаваць усю цалкам.

Кніга мае падзагаловак: "Узоры жывой народнай мовы ў вуснах беларускай вёскі 1960-х—1970-х гадоў".

Ніна Іванаўна Гілевіч, дацэнт кафедры беларускай мовы Белдзяржуніверсітэта, шматгадовы выкладчык, Настаўнік з вялікай літары, неаднаразова падчас дыялекталагічнай практыкі выязджала са студэнтамі ў розныя раёны Беларусі, збірала моўныя скарбы сама і дапамагала іх збіраць ды запісваць сваім практыкантам.

Пра гэтую кнігу можна сказаць упэўнена: так думае і гаворыць беларускі народ! Але ж гэта не толькі яркія ўзоры народнага думання і маўлення, а яшчэ і наша памяць, наша мараль, наша этыка. І, урэшце, наша моватворчасць — мы самі ствараем і ўдасканальваем сваю мову.

Як мы ўмеем суперажываць чужому гору ды болю, колькі дабрыні і спачування заўсёды жыло і жыве ў нашых душах! І ў словах — таксама.

На вялікі жаль, давесці свае запісы да кнігі Ніна Іванаўна не паспела. Гэта руплівa і тактоўна зрабіў яе муж — народны паэт Беларусі Ніл Гілевіч.

"Слова — роднае, жывое, свабоднае" — не першая кніга Ніны Гілевіч. Перад гэтым быў яе ж "Дыялектны слоўнік", які таксама падрыхтаваў і выдаў Ніл Сымонавіч.

Лексіка. Фразеалагізмы. Прыказкі, прымаўкі, прыгаворкі. Параўнанні. І зноў жа хочацца цытаваць слоўнік поўнасцю.

Вось яны, фразеалагізмы:

"Ядуць — аж за вушамі хрумсціць". "Вераб'і ў галаве нясуцца". "Драматуй рабіць" (г. зн. танцаваць: дра-та-та), "Ісці на казалы" (на зборышча). "На свой хвост набрахаць". "Гузікі прышывае" (заканчвае нейкую працу). Во як мы, звычайныя людзі, гаворым!

А якія прыказкі, прымаўкі ды пагаворкі запісалі Ніна Іванаўна і яе студэнты!

"Абы зубы, хлеб будзе", "Была дзеўкай на ўсю вуліцу, а цяпер на ўсю печ", "Во косіць: трава стаіць, зямля ляціць".

Праклёны і пажаданні: "Каб ты пяткамі назад хадзіў", "Каб ты ў вадзе стаяла і піць прасіла". Гэта ж такія пакуты!

І раптам: "Каб цябе Бог любіў!" Запісана ў вёсцы Слабада. Цуд! Так і хочацца адразу ж з'ездзіць у тую Слабаду, дзе такое жадаюць людзям.

Параўнанні. Здаецца, нікога не пакінуць яны абыякавымі: "Лезе, як жаба на корч". Пражыў жыццё, як на свінні праехаў", "Наліта гора ў мяне, як вока".

І, нарэшце, лексіка, сам слоўнік, матэрыялы для якога Ніна Іванаўна збірала ўсё сваё жыццё. Ён невялікі памерам, але вялікі беларускім духам, за якім наша даўніна, сівая наша гісторыя: абмецце (зерне нізкага гатунку), адвавуліць (адрэзаць вялікі кавалак), адразанікі (боты без халяваў), аблівень (зімовы дождж), бадзюлькі (дзядоўнік), гаганец (гальштук), грудок (воблака), есцечкі... Як шчымліва гучыць, ірве душу апошняе слова з дзіцячых вуснаў: "Уваходзіць малы хлопчык гадкоў трох і плача: "Цёця, ножкі ў мяне мокрыя, я ад мамкі адбіўся, есцечкі хачу.."! Разумееце, есцечкі хачу!

А ў якіх вёсках запісаны гэтыя звычайна-незвычайныя словы! Самі назвы іх просяцца ў дыялектныя слоўнікі: Белавуша, Бірулі, Вавукі, Відэйкаўшчына, Залацеева, Коцькі, Ладасна, Перацяткі, Псуя, Сачыўляны, Удзела, Язавінь...

Пра якую, панове, трасянку вы гаворыце?! У беларусаў, як бачыце, ёсць свая цудоўная, багата распрацаваная самім народам мова, якую любілі і якою захапляліся шмат якія вялікія людзі свету.

Ніна Іванаўна Гілевіч сваёю працаю, сваімі зборамі хораша пацвердзіла, пасведчыла гэта.

Я ведаў асабіста Ніну Іванаўну як шчырага, сумленнага, добрага, мудрага, руплівага, сяброўскага, вясёлага чалавека. Аднаго разу мы з ёю ў Доме творчасці ў Кактэбелі нават нязлосна пажартавалі з пісьменнікаў, вывесіўшы на дзвярах сталоўкі своеасаблівую аб'яву. Аднак тады я не ведаў, што яна носіць у сабе такі скарб — жыве дзеля роднага слова.

І як добра, што гэты скарб жонкі беражэ Ніл Сымонавіч — дбайна парадчыць, складае, рэдагуе і выдае асобнымі кніжкамі.

Ён жа напісаў кнігу "Разумная дзевачка", у падзагалоўку якой пазначыў: "Маленькая аповесць пра адно дзяцінства". І прысвяціў яе "светлай памяці Ніны Іванаўны, поруч з якой мне пашчасціла прайсці жыццё".

Нявыдуманая проза. У кнізе ўсё так, як і было. Як расказвала аўтару пра сваё дзяцінства сама Ніна Іванаўна. Нават імя яе засталося сапраўднае: Ніна. Засталіся яе дабрыня, чысціня, шчырасць.

І яшчэ адна шчымлівая кніга Н. Гілевіча прысвечана светлай памяці жонкі — "На флейце самоты". Вершы. Лірычныя мініяцюры ў жанры "танка". А дакладней — не ўся кніга, а толькі яе палова. Першая частка прысвечана маці, а другая — апошнім гадам і дням жонкі. Шчымлівыя, сумныя "танкі":

* * *

Тымі ключамі,
Што я адмыкаў дзверы
У свет мілаты,
Цяпер адмыкаю ў стынь,
У пустату, у вусціш.

* * *

І чуецца мне
Ціхі журботны голас, —
Той, у палаце:
"А ружы ці зацвілі?
Праўда? То гэта добра"...

Так, чалавек памірае, а тое добрае, што ён зрабіў, застаецца назаўсёды. З жывымі.

Як і гэтыя кнігі Ніны Іванаўны Гілевіч, пра якія мы расказалі тут.

Янка СІПАКОЎ

Мне пашчасціла два гады запар удзельнічаць у гэтым незвычайным фэсце — Мядовым Спасе. У душы аселі пэўныя ўражанні, якімі і хачу падзяліцца.

Дзеці і пчолы

Дзеці і пчолы... У іх, Божых стварэнняў, шмат агульнага, роднаснага, мілага. Яны любяць прыроду, кветкі, бо і самі — жыццёвыя краскі.

Дзеткі радуюцца сонцу, бацькоўскай любові, якія лашчаць іх штодня.

А мамы і таты, каму дадзена Божая ласка, выводзяць малечу ў вялікі свет, нястомна паўтараюць сваю нязменную малітву:

Дзеці — Божыя пасланнікі на зямлі,
яны — жывы помнік Божай
міласэрнасці,
яны — служкі праведнасці.
Папярэдзім дзяцей нашых
ад памылак,
якія мы самі тварылі,
і Бог падможа ім.
Давайце, як вучыць Сын Божы,
павернемся да дзяцей нашых,
зразумеем, палюбім іх сардэчна.
Давайце будзем як дзеці,
бо не ўвойдзем у Царства
Нябеснае.
За дзяцей нашых памолімся
на ўсходзе дня,
на захадзе сонца.
Амінь.

І наступае ў дзяцей нашых жыццёвы Спас. Яны дораць бацькам і Бацькаўшчыне мёд сваёй працы, сваёй творчасці, свайго натхнення, як удзячнасць за падараванае ім жыццё.

І ў пчол наступае свой Мядовы Спас. Яны ўсё лета зумкалі-малілі ся над квяцістымі лугамі, над белай квеценню грэчкі, над малінавымі кустамі ды пахкімі ліпамі. Наведвалі ўсе кветкі, але далёка не з кожнай бралі нектар.

І вось наступае вялікае свята для людзей і пчол — Мядовы Спас. З даўнейшых часоў ён адзначаецца царквой у сярэдзіне жніўня. Лета дагарае — восень эстафету прымае.

Запомнім дзень 14 жніўня. Было цёпла і сонечна. У Мінску шырока святкавалі Мядовы Спас. На Кафедральную плошчу ў сталіцы, што каля велічнага, старажытнага белакрылага храма, з самай раніцы пачалі збірацца мінчане. Як пчолкі на гаючую лугавіну, ішлі, ехалі людзі. Сярод іх — сталыя і старыя, юнакі і дзяўчаты. Завітаў на свята нават жывы мядзведзь. А яшчэ быў артыст-мядзведзь і дзеці-пчолкі. Кафедральная плошча ажыла, расквецілася, загула.

Свята блаславіў Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі, патрыяршы Экзарх усяе Беларусі Філарэт. Ён сказаў душэўнае прывітанне ўсім прыхаджанам. Асобныя словы Мітрапаліт адрасаваў дзецям. Ён прыняў іх у сваёй рэзідэнцыі. Ён ахвяраваў дзецям бочку мёду (сто кілаграмаў!) з пчольніка Свята-Елісавецінскага манастыра.

Даўней лічылася, калі на Спаса пчаляр дастае мёд і не пачастуе ім дзяцей, то пчолы прападуць. Таму і называлі Спасаўку «ласаўкай». І ў пчол быў свой святы ахоўнік і заступнік Зосім. Ён услаўляецца ў многіх пчалярных малітвах і замовах. Раней на пасеках трымалі яго абраз, як абярэг. Зосіма заўсёды малявалі ў манаскім адзенні, на фоне лесу. У адной руцэ ён трымаў кацялок, у другой — крыж і мяцёлку для заграбання раёў. Добры Зосім быў бязлітасны да тых, хто разбураў пчаліны дом, бо гэты грэх прыраўніваўся да разбурэння Храма Божага. А злодзей, які выдзіраў мёд з борці, лічыўся злачынцам, які забіў чалавека. Вось чаму пчолы водзяцца толькі ў добрых людзей, а ліхіх не любяць.

І вельмі прыемна, што на фестываль "Мядовы Спас" у Мінск прыязджаюць пчаляры не толькі з усяе Беларусі, але і з Алтая, Башкірыі, Курска, Растова, Валгаграда, Арлоўскай вобласці, Асеціі, Далёкага Усходу, Удмурціі...

Узрушаныя, поўныя ўражанняў вярталіся дзеці дамоў са свята "Мядовы Спас". На вялікі жаль, для многіх дзяцей Беларусі іх домам з'яўляецца не сям'я, а школа-інтэрнат, дом дзіцяці. Ім на "Мядовым Спасе" была асаблівая ўвага.

Выхаванцы Рэспубліканскага дзіцячага рэабілітацыйнага Цэнтра вярнуліся ў свой дом з падарункам ад самога Філарэта. Іх тварыкі свяціліся надзеяй і верай. А дзве дзяўчынкі, Даша і Ніна, захацелі паспавядацца ў сваім храме, які месціцца тут жа, у іх Цэнтры. Перад іконай Маці Божай затрымаліся. Пра што думалі дзяўчынкі — вялікая тайна. А на паперы, як умелі, літарка за літаркай выпісалі сваю кароткую, але вельмі шчырую малітву: "Дзякуй Богу".

А яшчэ дзеці прасілі ў Бога здароўя. І ўсе як адзін угаворвалі дзядзьку Юру, каб мядзістая Пчала яшчэ калі-небудзь прыляцела да іх. А дзядзька Юра (Юрый Аляксеевіч Радзькоў) шчасліва ўсміхаўся. Ён, галоўны прадзюсер і арганізатар фестывалю "Мір мёду і здароўя", "Мядовы Спас", сам выхаваны ў дзіцячых дамах і школах-інтэрнатах, добра ведаў кошт дзіцячай радасці. Яна ўсяляе ў кожную душу Веру, Надзею і Любоў. А дзеля гэтага і трэба ўсім нам жыць, працаваць і верыць. Давайце не выжываць, а жыць натхнёна, з любасцю адзін да аднаго.

Уладзімір ЛІПСКІ

Фота Віктара Кавалёва

Агульнарэспубліканскі конкурс сачыненняў (эсэ) сярод школьнікаў, студэнтаў і моладзі краіны



Фота Віктара Кавалёва

Усе цуды свету

Ні сном, ні казкай, ні ціхай песняй нельга перадаць пачуцці. Колькі ні кажы — усё не так і не тое. Таму лепш рабіць высновы не для кагосьці, а для сябе самога...

— Я жытні колас. Ціхай летняй раніцай я стаю ў расе і слухаю галасы сваіх сяброў. Праз доўгія асцюкі мае бачу, як устае сонца і свеціць так ярка, што асляпляе мяне, і я, сухі познім летам, сакачу ад сонечнай пяшчоты. Серабрыста-залаты колер мой гаворыць усяму свету аб гатоўнасці трапіць у рукі Чалавеку. Зусім спелы, я мару пра адно — быць хоць чым-небудзь карысным Беларусі, зямлі якая мяне ўзрасціла.

— Мой лёс закінуў мяне ў шумны і вялікі горад. Я тралейбус. Электрычныя лініі і дарога — мае верныя сябры. Я не магу нічога без іх. Я ўстаю самы першы, часта раней за сонца. Кожны дзень чакаю, пакуль да мяне дакрануцца рукі Чалавека. Я з гонарам "лячу" па вуліцах і праспектах, бо ведаю, што карысны людзям маёй Беларусі.

— Мяне называюць кнігай. Я — самае каштоўнае, што ёсць у свеце. Я ператвараю невядомае ў вядомае, а таемнае ў адкрытае. Мяне лічаць мудрэйшай за ўсіх мудрацоў, а мае словы — мацнейшымі за самую вялікую сілу. Я ёсць усюды і заўсёды. І стоячы ў якім-небудзь месцы, я думаю пра дотык рук Чалавека. Я гатова адкрыць перад ім вялікае жыццё. Я зберагу маю Беларусь у сабе.

— Я камп'ютэр, звышрозум. Усяго за некалькі дзесяцігоддзяў людзі зрабілі мяне такім дасканалым, што нават самі не ведаюць, якім чынам я здольны рабіць унікальныя падлікі, кіраваць машынамі... Але я "хварэю" і тады чакаю дапамогі ад Чалавека. Я гатовы рэалізаваць любыя праекты для маёй Беларусі.

— Шматпавярховы, сялянскі, маленькі, вялікі... Я дом. Я не маю магчымасці зрушыцца з месца, ды і не трэба. Я настолькі адданы і верны сваім гаспадарам, што з радасцю прыму іх у любым стане і ў любы час. Мне прыемна адчуць тупат каля сваіх дзвярэй і дотык цёплых рук Чалавека. Я шчаслівы, бо карысны для людзей маёй Беларусі.

— Лес. Восеньскім шаманеннем апалага лісця я шкадую, што так доўга не пабачу заўзятага грыбніка на сваіх лясных сцежках. Я здольны суцешыць самага неспакойнага. Я берагу сябе ў лютыя маразы і вясеннія ліўні з маланкамі, каб убачыць празрыстыя вочы Чалавека, які любуецца першымі кветкамі. Я адчуваю радасць, бо штогод шчыра адорваю маю Белую Русь.

— Я воблака. Я лётаю па ўсім свеце і вельмі люблю сінявокую Беларусь. Няхай не крыўдуюць на мяне працавітыя рукі Чалавека, калі ў спякоту кроплі дажджу не ўпадуць на адкрытую далонь. Я проста настолькі рада бачыць прыгожую Беларусь, што не магу плакаць.

Чалавек я. Мне падораны ўсе цуды свету. Я працягваю рукі прыродзе маёй Беларусі. Я, на жаль, не заўсёды думаю пра маю Беларусь, але яна — дае мне сэнс жыцця.

Ірына БАЖОК,
студэнтка ГДУ
імя Ф. Скарыны

Мой родны горад

Пачну, мабыць, з банальнага сцвярджэння: я вельмі люблю маю Беларусь і ганаруся ёю. На жаль, гэта зразумела толькі нядаўна: бо ў дзяцінстве яшчэ не ўсведамляеш глыбіні такіх паняццяў, як любоў да Радзімы, гонар за яе, але па меры сталення пачынаеш разумець іх ва ўсёй складанасці.

Як можна не любіць Беларусь — з яе хараством, пяшчотай, утульнасцю. Але найперш я хацела б расказаць пра маю "малую радзіму" — горад Гомель. Ён узнік у дванаццатым стагоддзі і ўпершыню прыгадваецца ў Іпацьеўскім летапісе пад 1142 годам. Сёння ён вельмі вялікі і прыгожы.

Самае любімае месца нашых гараджан — парк культуры і адпачынку, дзе па вечарах і ў выхадныя дні збіраюцца ці не ўсе гамяльчане. Тут багата розных дрэў, кустоў, клумбаў, на якіх з самай вясны і да глыбокай восені раскашуюць кветкі; у парку жывуць вавёркі, якія любяць частавацца рознымі ласункамі проста з рук наведвальнікаў. Пасярод парку ёсць штучнае возера, яно называецца Лебядзінае, таму што на ім летам жывуць лебедзі.

Зусім нядаўна ў нас пабудавалі фантан, які ўначы зяе рознакаляровымі ліхтарыкамі — ад іх, здаецца, вада робіцца рознакаляровай. Вечарам каля гэтага фантана збіраецца моладзь нашага горада.

Асабліва ж мне падабаюцца скульптуры, якіх апошнім часам становіцца ўсё больш на нашых вуліцах. Гэта Гулівер ростам з двухпавярховы дом і "краіна ліліпутаў"; першы жыхар Гомеля на лодцы з рыссю; дама з сабачкам, якая нібы прагульваецца каля маленькага мосціка, а побач з ёю чалавек у цыліндры; вялікі дыназаўр, што быццам есць лісце з дрэва. А ў Савецкім раёне маецца сад, у якім ляжаць вялікія, памерам з чалавека яблыкі, праўда, побач размясціўся зялёны вусень, але ён не страшны — усмешлівы.

Мой горад найпрыгажэйшы ноччу. На вуліцах запальваюцца ліхтары, а на плошчы і на некаторых дрэвах — маленькія каляровыя гірлянды. На вуліцах ціха і спакойна.

Я вельмі люблю свой горад і сваю Беларусь! Гэта — мая Радзіма, дзе я нарадзілася і застануся жыць назаўсёды!

Ірына ГУСАКОВА,
студэнтка ГДУ імя
Ф.Скарыны

Фестывальная феерыя

Безліч тэкстаў пра Беларусь я чытала. Такіх разважлівых, прыгожых. Ды мая Беларусь — святочная, фестывальная. Мая Беларусь — штогадовы "Славянскі базар", чаканне — ад ліпеня да ліпеня. Гэта ўжо рытуал: апынуцца ў сталіцы музычнага свята напярэдадні адкрыцця фестывалю. Выйсці з вагона апоўначы. Удыхнуць на поўныя грудзі гэты збор пахаў: імклівых цягнікоў, свежых фарбаў з афіш, цэлага акіяна кветак. Апынуцца на прывакзальнай плошчы і пабачыць амаль касмічную з'яву. Мільёны рознакаляровых зіхоткіх "аб'ектаў" з усіх бакоў клічуць, прыцягваюць да сябе, вабяць гукамі, пахамі, радасцю. Квацістая плынь у абодва кірункі — на форум і з форуму — удзельнікаў гэтай дзівоснай феерыі. Віцябляне, мінчане, госці з Піцера, з Масквы, Познані. Тут увесь белы свет — ад французаў да жыхароў далёкай Бразіліі. Тут не ведаеш, дзе заканчваецца ноч і пачынаецца раніца.

Чатыры гадзіны на сон — і зноў туды, да амфітэатра. Колькі зорак эстрады! Колькі сустрэч! Дзе ж яшчэ можна зрабіць такія здымкі: шматзначны Брэйтбург, загадкавая, непаўторная Эдзіта П'еха, добразычлівы Анатоль Ярмоленка. Розныя людзі, розныя мовы. Англійская, нямецкая, іспанская. Сяброўка мая Лена — як шчупак у вадзе, яна ж вучыцца ў лінгвістычным. То тут, то там яе пабачыш, спрабуе сябе ў розных "жанрах". Яе, нарэшце, заўважаюць. Хлопчыкі-немцы на "рускай" мове пытаюцца, адкуль яна.

— А мы тутэйшыя, — з гонарам кажа Лена. — Віцебскія. А вы мо думалі, што ў нас тут толькі зубры ходзяць у валёнках? — жартуе яна. — Дык ёсць і зубры. У сваім павеце, у Белавежскім.

— О, какой маленький белорус, какой амбиций! — імправізуюць іншаземцы.

Імправізуе і Лена: з нямецкай пераходзіць на англійскую, на іспанскую, ёй падабаецца дражніць хлопцаў. Штурхае мяне: "Ты ж ведаеш польскую. Вунь палякі, карыстайся момантам, лаві сапраўднае маўленне".

— Колдун Дима, — падлізваюцца нямецкія "кавалеры".

—Хо, — адказвае Ленка. — То ж наш знаёмы.

Яна паказвае ім фотаздымкі, на якіх мы з Дзімам. Але гэта толькі выкрутасы форуму: усё знаёмства — гэта аўтографы і здымкі на памяць каля амфітэатра. Адкуль ім ведаць?

— О-о-о! — кажуць. — Зэр гут, Дима!

— А то! — адказвае Лена. — Мы Георгія Калдуна ведаем. Вось яна, — Ленка штурхае мяне ў бок, — яна піша вершы для яго песень.

Ой-ой, таксама ж лухта. Не, вершы я Георгію прапанавала, той аркушык з тэкстам ён узяў, але, магчыма, забыўся даўно пра гэта. Тут крыху хлусні, крыху праўды.

А ноччу зоркі здзіўлена глядзелі на віцебскую феерыю. Пляскалі ў далоні, пераглядваліся: а прыгажосць якая, от табе й Беларусь — суніцы з рамонкамі! Бач ты што вырабляе — дзівачыць на ўвесь Сусвет. Канцэрт пад новым дахам. Фальклорная група. Які хлапчына! А мы без кветак. Ой-ой! Толькі пакунак цукерак гомельскага "Спартака".

— Хадзем, — кажа Лена. Мы падымаемся на сцэну. Хлапчына ўжо цалкам у кветках і пацалунках, крыху разгублены. А тут і мы з цукеркамі.

— Дзякуй, дзякуй, цудоўныя кветкі!

— Вось так, — кажа Лена. — Няхай будуць кветкі, — цмокае яго ў шчаку.

Хлопчыкі з Германіі сустракаюць нас яшчэ раз.

— Вы сапраўды пішаце вершы? — пытаюць яны мяне.

— А то! — кажа Лена.

— Дык прачытайце нам, мы зразумеем, — просяць яны. Ленка перакладае.

— Ну што? Чытай, — загаворвае яна. — Мо надрукуюць у мясцовым цайтунгу.

Я чытаю:

Ах, мая Беларусь!
Я такая ў цябе закаханая.
Ззяе неба тваё,
У начы яно ў зоркі прыбранае.
А як рання зайграюць гармонікі,
Упрыгожыць тваё неба сонейка.

Ах, мая Беларусь!
Жыта ў полі ад ветру
хвалюецца,
Над тваёй галавой
Як карона, вясёлка красуецца.
Толькі сонечны дождж
Над ялінамі ззяе высокімі,
Толькі вецер-пястун
Над рамонкамі ў полі галёкае.

Ах, мая Беларусь!
Непаўторная ты, каларытная.
Як да твару табе
Дарагая суконка блакітная!
Ды за ўсё даражэй
Твае рукі, такія пяшчотныя,
Што шчыруюць аб тым,
Каб жылі мы заўжды
бесклапотныя.

Наталля ТРЫЗНА,
студэнтка ГДУ імя Ф. Скарыны

Фота Віктара Кавалёва

№ 47 23 лістапада 2007 г. ЛіМ

Калі пачынаюць гаварыць пра літаратуру Беларусі ўвогуле, часам згадваюць пра тое, што акрамя ўласна беларускай літаратуры (літаратуры на беларускай мове) мае месца яшчэ адна — быццам і беларуская, але ж на рускай мове. Назваць яе "беларускай" — нібыта і некарэктна, таму што без істотных удакладненняў тут не абысціся; назваць "рускай" — таксама нацяжка, бо яна спецыфічна руская, беларуска-руская. Што рабіць з беларускай літаратурай, якая адначасова з'яўляецца рускай (рускамоўнай)?



Руская літаратура Беларусі

Відавочна, што яе дваісты, маргінальны культурны статус самым непасрэдным чынам адбіваецца на грамадскім бытаванні і на рэпутацыі: гэтая пакуль безыменная літаратура, якую невядома як і назваць, каб нікога не пакрыўдзіць, асуджаная быць вечна другой і ў літаратуры беларускай, і ў рускай. У абодвух кантэкстах яна нібыта чужая, не на сто працэнтаў свая, падазроная і — што асабліва цешыць рупліўцаў адназначнасці і катэгарычнасці — безабаронная.

Перадусім трэба дакладна акрэсліць сур'ёзны прадмет сур'ёзнай размовы, феномен, што аб'ектыўна існуе, але не мае пакуль агульнапрынятага наймення. Ёсць корпус тэкстаў, ёсць паэты, празаікі і драматургі, якія пішуць на рускай мове, але жывуць у Беларусі. Ці з'яўляецца плён іх творчасці часткай літаратуры беларускай?

Безумоўна. Беларуская літаратура — гэта не толькі літаратура на беларускай мове, але яшчэ і літаратура Беларусі, краіны еўрапейскай, дзе суіснуюць многія мовы і культуры. Частку беларускай літаратуры на рускай мове цалкам карэктна называць ***рускамоўнай***.

Непараўнальна больш праблем паўстае ў стасунках рускамоўнай літаратуры Беларусі з літаратурай рускай. Ці можна лічыць беларускую літаратуру на рускай мове адгалінаваннем рускай літаратуры?

Для апошняй акрэсленая сітуацыя сама па сабе даволі тыповая: тыя, хто піша па-руску, жывуць не толькі ў Расіі, аднак гэта не перашкаджае ім быць залічаным да кагорты рускіх пісьменнікаў. Пішаш па-руску, жывеш у прасторы рускай культуры — адпаведна, ты рускі пісьменнік.

Руская літаратура Беларусі — гэта, як ні дзіўна, праблема ў большай ступені Беларусі, чым Расіі. Ці лічыць "нашых" пісьменнікаў адначасова "не нашымі"?

У Беларусі тыповая для рускай культуры сітуацыя набывае унікальныя рысы. Да распаду Савецкага Саюза практычна ўсё, што выходзіла ў Беларусі на рускай мове, уцягвалася ў рускую, рускамоўную культурную прастору, і беларускай літаратурай лічылася літаратура на беларускай мове. Усё зразумела і адназначна. Са з'яўленнем дзяржавы Рэспубліка Беларусь, дзе статус дзяржаўных сёння маюць дзве мовы, сітуацыя карэнным чынам памянялася. Напісанае ў Беларусі на рускай мове становіцца ўжо не толькі рускім, але і беларускім. Вось гэты амбівалентны статус ***рускай літаратуры Беларусі*** і мусіць быць зафіксаваны ў формуле, якая рэпрэзентавала б сутнасць з'явы.

Такім чынам, існуюць дзве базавыя класіфікацыйныя мадэлі, якія па-рознаму інтэрпрэтуюць наяўную сітуацыю: "руская літаратура Беларусі" — і "рускамоўная літаратура Беларусі". У абодвух выпадках амбівалентнасць "аб'екта" бярэцца пад увагу, аднак вынік атрымліваецца розны. І ставіць пытанне як "ці — ці", ці адна мадэль — ці другая, значыць — у гэтым я глыбока пераканаць — чыніць гвалт над рэчаіснасцю. Ёсць рускамоўная літаратура — і руская літаратура Беларусі.

У выпадку з "рускамоўнай літаратурай" размова ідзе пра беларускую літаратуру, пра частку цэлага. Рускамоўная — гэта "складнік" беларускай літаратуры, які транслюе модус беларускай ментальнасці.

У другім выпадку мы маем справу не з рускамоўнай літаратурай Беларусі, не з беларускай літаратурай на рускай мове; гаворка не пра тых, хто піша на рускай мове, не пра ўраджэнцаў Беларусі, якія пішуць па-руску і жывуць дзе заўгодна, толькі не ў Беларусі, не пра беларускіх пісьменнікаў, што пішуць па-руску, — а менавіта пра літаратуру, што мае дачыненне адначасова і да рускага, і да беларускага прыгожага пісьменства.

Руская літаратура Беларусі — гэта адначасовая разгорнутасць у бок розных культурных парадыгм. Два ў адным. Так здарылася, такая рэальнасць.

Ёсць пісьменнікі, творчасць якіх без усялякіх нацяжак укладваецца ў формулу "рускамоўная літаратура Беларусі": самы яскравы прыклад — Алесь Адамовіч; з дзейсных пісьменнікаў адноснага памежжа стагоддзяў можна назваць Валянціна Тараса, Аляксандра Дракахруста. Аднак жа ёсць пісьменнікі, якія не ўкладваюцца ў сэнсавыя межы згаданай формулы: з'яўляючыся рускамоўнымі пісьменнікамі Беларусі, яны адначасова і рускія пісьменнікі. Да іх ліку належаць паэты Веніямін Блажэнны, Анатоль Аўруцін, Канстанцін Міхееў, Юрый Сапажкоў, Любоў Турбіна, Дзмітрый Строцаў, Ізяслаў Катляроў, Юрый Фатнеў, Уладзімір Карпаў і многія іншыя; з празаікаў значная (магчыма — большая) частка тых, хто піша па-руску, усведамляе сябе прадстаўнікамі рускай літаратуры Беларусі (у дадзеным выпадку мушу спасылацца на вопыт асабістых стасункаў).

Дарэчы, санкцыі Беларусі ці Расіі на падобнага кшталту культурную ідэнтыфікацыю не патрабуецца: размова ідзе найперш пра культурную з'яву, а не пра грамадзянства. Неабходныя дапамога і разуменне, а калі не дапамога, дык хаця б актыўная воля не чыніць перашкод.

Асабіста я выступаю за сумяшчэнне дзвюх прадстаўленых формул, за дакладнае, адэкватнае і, так бы мовіць, далікатнае іх прымяненне. Але калі гаварыць пра тэндэнцыю, пра колькасную і, што значна важней, якасную перавагу пісьменнікаў "рускай" ці "рускамоўнай" арыентацыі, дык сёння адказ, які дае сама рэальнасць, мне бачыцца такім: *рускамоўная літаратура Беларусі з'яўляецца ў пераважнай ступені рускай літаратурай Беларусі.* Каб не заблытацца самім і не ўводзіць у зман грамадскасць, больш карэктным было б папулярызаваць формулу "руская літаратура Беларусі" (маючы на ўвазе, што там, дзе неабходна, варта карыстацца паняццем "рускамоўная літаратура Беларусі").

Відавочна, пытанне пра беларускі і рускі складнікі культуры Беларусі паўстала не сёння. У гістарычнай рэтраспектыве кропкай адліку рускай літаратуры Беларусі ў пэўным сэнсе можна назваць усё тое ж універсальнае, усім караным карэннае "Слова пра паход Ігаравы", творчасць Сімяона Полацкага і г.д. Аднак гэта ўсё гістарычныя канструкцыі і рэканструкцыі, не больш. Яны маюць права на існаванне, маюць лагічныя і культурныя абгрунтаванні, але нічога не прасвятляюць адносна сутнасці сённяшняга разумення формулы "руская літаратура Беларусі". Адна справа, калі Беларусь была часткаю Расійскай дзяржавы, і зусім іншая — працэс фарміравання мультыкультурнай прасторы, частка якой угрунтаваная ў рускай мове. Сённяшняя руская літаратура Беларусі немагчымая без традыцый рускай літаратуры (па-за гэтым кантэкстам рускай літаратуры Беларусі проста не існуе), і ў той жа час у рускай літаратуры Беларусі пачынаюць прысутнічаць традыцыі і кантэкст, якіх не было, няма і не можа быць у літаратуры рускай. Гэта жывы і супярэчлівы працэс, што вымагае напружанага і бесперапыннага асэнсавання і даследавання. Аналітычнае "абслугоўванне" такога працэсу — задача літаратурнай крытыкі, якой не было і, на жаль, зараз практычна няма ў дачыненні да рускай літаратуры Беларусі.

У сувязі з гэтым адзначым яшчэ адну спецыфічную і надзвычай цікавую асаблівасць, якая характарызуе сітуацыю, што склалася вакол рускай літаратуры Беларусі: літаратура ёсць, а крытыкі няма, значыць, літаратуры таксама нібыта няма. Што за літаратура, пра якую "не гавораць"?

Яе не замоўчваюць, удакладнім дзеля ісціны, пра яе менавіта не гавораць — у сілу, трэба думаць, "відавочнай" другараднасці "рускамоўнага матэрыялу" (вось вам яшчэ адно семантычнае адценне слова "рускамоўны").

Ёсць паэты, ёсць празаікі, драматургі, але няма ***літаратурнага працэсу*** (складнікі якога — крытыка, устойлівая цікавасць літаратуразнаўства, вывучэнне твораў у школах і ВНУ, наяўнасць літаратурна-мастацкіх выданняў, сістэмы прадуманых культурных мерапрыемстваў і г.д.), і як вынік — няма "прапіскі" ў грамадскай свядомасці, дзе руская літаратура Беларусі займала б належнае месца, сваё месца, а не чужое.

Спецыфічнасць сітуацыі заключаецца таксама ў тым, што феномен "руская літаратура Беларусі", што не ўсведамляецца ў якасці пэўнай цэласнасці, самадастатковага працэсу, не прадстаўлены калі не класікамі, дык хаця б знакавымі постацямі; фігуры, вартыя паводле свайго творчага патэнцыялу такога гонару, магчыма, існуюць, але яны не матэрыялізаваліся ў грамадскай свядомасці ў якасці "культавых". Праблема "асоба для гісторыі ці гісторыя для асобы" ў поўнай меры актуальная і для літаратуры. Скажам больш пэўна: літаратуры без значных творчых асоб проста не бывае. Калі "зоркі" не запальваюць, значыць, гэта нікому не патрэбна? У пералічаных мною паэтаў, выдатных і розных, жывых і ўжо спачылых, маецца пераважна прафесійная рэпутацыя, але адсутнічае рэпутацыя грамадская. Асоба як персаніфікацыя феномена — вось чаго так не хапае сёння рускай літаратуры Беларусі. Гэта праблема не ўласна літаратурная, але грамадска-культурная. Са з'яўленнем шэрага сімвалічных постацяў (неабавязкова, дарэчы, "жывых класікаў": ва ўсім павінна быць мера) адбываецца і легалізацыя самой культурнай формулы "руская літаратура Беларусі", і ўкараняецца яе статус у грамадскай свядомасці.

Што ж ёсць, калі няма буйных творчых асоб "з рэпутацыяй", калі нават адсутнічае шэраг важнейшых атрыбутаў літаратурна-грамадскага працэсу?

Як ні дзіўна, пры дэфіцыце яркіх, знакавых постацяў маем у наяўнасці даволі заўважныя творы. Пісьменнікаў як фігур грамадска і літаратурна значных і прызнаных (у нас, тут, у Беларусі прызнаных) — словам, бясспрэчных, якія маюць статус, калі хочаце, мясцовых класікаў, — такіх постацяў пакуль няма, але асобныя творы, якіх назбіраецца на ладную бібліятэчку, ёсць. Гэта таксама спецыфіка рускай літаратуры Беларусі на сённяшнім этапе яе станаўлення. У гэтым няма нічога страшнага ці жахлівага, гэта абсалютна натуральна.

Варта адзначыць і тое, што ўзровень паэзіі на рускай мове ў Беларусі вышэй за ўзровень мастацкай прозы. І гэта, хутчэй, сведчыць не пра унікальнасць сітуацыі, але пра заканамернасць, што мае дачыненне да працэсу станаўлення літаратур: мастацкая проза, асабліва раманы — найбольш прэстыжны і значны жанр літаратуры, і росквіт рамана, жанру па вызначэнні "канцэптуальнага", — гэта ў пэўным сэнсе падвядзенне папярэдніх вынікаў ці, прынамсі, завяршэнне поўнага цыкла. Вялікай літаратуры без вялікіх раманаў не бывае — гэта з аднаго боку; з другога ж — літаратура пачынаецца з паэзіі. Таму пазначаны вышэй дысбаланс у суадносінах паэзія—проза відавочны. Правільнай дарогай ідзем.

Такім чынам, ужо сама наяўнасць літаратурных праблем сведчыць пра тое, што "незразумела якая" літаратура, якая прыжылася ў "незразумела якой культурнай прасторы", усё ж існуе і развіваецца па класічных законах, уласцівых любой літаратуры свету.

Час рускай літаратуры Беларусі вызначыцца з найменнем — адпаведна, і з арыгінальным культурным статусам.

Анатоль АНДРЭЕЎ

In LiveJournal veritas*

Калі перафразіраваць барадаты жарт, можна сказаць, што Зямля круціцца, бо яе рухаюць вялікія пісьменнікі, якія варочаюцца ў дамавінах, даведаўшыся пра змест зборніка, прысвечанага стагоддзю "Нашай нівы".

Завецца зборнік "In Вільня veritas", але мне падаецца, што ісціна насамрэч не зусім там. Творы фіналістаў конкурсу маладых літаратараў, з якіх складаецца гэтая кніга, нагадваюць, перш за ўсё, опусы на старонках Жывога Часопіса (LiveJournal) — бясплатнага інтэрнет-сервіса для вядзення дзённікаў. Такія дзённікі ёсць амаль у кожнага другога ва ўзросце да 30 — 35 гадоў. Што там змяшчаюць людзі? Большай часткай — гэта трывіяльныя апісанні падзей асабістага жыцця, трэба адзначыць, падчас дастаткова прымітыўныя, кшталту "Сёння зранку я быў у гуморы. Мабыць, таму што мне ўсміхнулася дзяўчына на прыпынку, а мо, што сонейка ласкава свяціла". Аднак ёсць сегмент ЖЧ, які ствараюць дасведчаны, адукаваны маладняк, для іх інтэрнет-дзённік — плацдарм для рэалізацыі сваіх літаратурных амбіцый. Яны публікуюць на сваіх старонках вершы і прозу, чакаюць каментарыяў, дыскутуюць, лаюцца, усё болей і болей прызвычайваючыся да думкі, што ўся гэтая "творчасць" даволі неблагая, каб выйсці па-за межы ЖЧ. І яна выходзіць. І з'яўляюцца зборнікі, кшталту "In Вільня veritas", чытаючы якія часам забываешся, ці то фрэнд-стужка ў ЖЧ, то ці то зборнік, прысвечаны стагоддзю "Нашай нівы".

Я буду зусім не аб'ектыўная, калі скажу, што зборнік цалкам нецікавы. Здань таленту раз-пораз блукае ў тэкстах. Трэба адзначыць, што шматлікія аўтары змясцілі і прозу, і вершы адначасова, і вершы часцей больш уражваюць (выключэнне складае Віктар ЫВаноў, проза якога мне спадабалася значна болей, чым яго вершы).

У прадмове да кнігі Ганна Кісліцына кажа, "што ў нас з вамі ёсць перспектыва", што гэтыя маладыя літаратары "ўражваюць не толькі сваім яркім талентам, але, у першую чаргу, сваімі чалавечымі якасцямі". І яна мае рацыю. Сапраўды, перш-наперш усе яны — цікавыя і разумныя дзяўчаты і хлопцы, якія неўзабаве стануць дарослымі, выгадуюць разумных дзетак, будуць весці дасведчаныя размовы і ўсё жыццё мысліць у правільным накірунку. У гэтым сэнсе перспектыва ў нашай краіны ёсць. А ці ёсць перспектыва ў беларускай літаратуры? І я, нягледзячы на ўвесь мой папярэдні скепсіс, скажу — так, ёсць. Бо калі тры-чатыры аўтары з амаль што дваццаці вартыя таго, каб іх назвалі пайменна — гэта ўжо шанец для нашай літаратуры. Хацелася б адзначыць вершы Віталя Рыжкова, Юліі Арцёмавай, Сержука Мядзведзева — гэта насамрэч густоўна, таленавіта, чула.

Але твораў, якія б выклікалі падобныя азначэнні, няшмат; усё больш волкага і недарэчнага. Ёсць "шэдэўры", якія ўвогуле выклікаюць толькі поціск плячыма, напрыклад, "Йопыты двух маладых нелюдзяў", напісаныя на так званай "мове падонкаў". Пра сэнс і змест гэтага твора я казаць не буду, выконваючы "ветлую і дасціпную" просьбу аўтараў, змешчаную ў выглядзе пастскрыптума ў іх біяграфіі.

Дарэчы, пра мацюкі, што тутака-тамака выхоплівае вока. Ганна Кісліцына кажа, што ўсе гэтыя маладыя пісьменнікі "не схільныя да эпатажу", але для мяне вялікая колькасць ненарматыўнай лексікі і натуралістычных падрабязнасцей — першы аргумент на карысць таго, што ў галовах і душах юных літаратараў квітнее схільнасць да эпатажу, максімалізм і нігілізм. Акрамя таго, чаму такога кшталту словы выглядаюць брудна, штучна і пахабна на старонках гэтага зборніка і трапна, ёмісты — на старонках кніг, да прыкладу, рускага сучаснага пісьменніка Віктара Пелевіна? З-за недахопу ў маладых аўтараў таленту, досведу і густу.

Алеся СЯНЧУК

*Ісціна ў ЖЧ.

Свята бібліятэкі

“Нам — 75 год !" — так сустракалі гасцей супрацоўнікі сталічнай бібліятэкі № 3 імя У. Маякоўскага ў Дзень адчыненых дзвярэй. Госці мелі цудоўную магчымасць бліжэй пазнаёміцца з гісторыяй бібліятэкі, з выставамі, падрыхтаванымі да свята. Асаблівую цікавасць выклікала выстава “Старонкі гісторыі", на якой былі прадстаўлены архіўныя дакументы гісторыі бібліятэкі амаль з 1932 года, фотаздымкі з розных мерапрыемстваў, праведзеных за доўгія гады працы.

“У чытальнай зале госці з задавальненнем пазнаёміліся з выставамі “Самая, самая" (выстава — сюрпрыз, дзе чытачы мелі магчымасць убачыць самую старую, самую вялікую і самую малую кнігі з фонду бібліятэкі), “Лаўрэаты залатога фаліянта" (прадстаўлены некаторыя кнігі-пераможцы конкурсу “Мастацтва кнігі-2007"), “Кніга, якая ведае ўсё" (новыя энцыклапедычныя выданні). Парадавалі гасцей і выставы абаненцкай залы: “Шчодры дар чытачоў" (кнігі, прынятыя ў дар ад чытачоў бібліятэкі), “Для вас, разумнікі", “Свет тваіх захапленняў" (літаратура па гісторыі, а таксама з серыі “Усё пра ўсё" і шмат іншых выданняў). Усмешку ў гасцей выклікала незвычайна аформленая выстава “Шар-жарт" (уся бібліятэка была ўпрыгожана шарамі з заклікамі “Усміхніся з намі" і жартамі-выказваннямі).

Загадчыца бібліятэкі Лідзія Гарохавік правяла з вучнямі ўрок — знаёмства “Дзе жыве царыца ведаў", віктарыну “Рэкорды кніжнага свету", дзе юныя эрудыты паказалі добрыя веды па гісторыі Беларусі і кніжнай справе.

Кульмінацыяй свята стала віншавальная гасцёўня “Дом, дзе акрыляецца душа". Бібліятэкары Святлана Краўцова і Жана Маслякова падкрэслілі значнасць сваёй прафесіі:

— Быў час, калі не было ні бібліятэк, ні кніг, ні чытачоў. І толькі ў перыяд рабаўладальніцтва егіпецкіх фараонаў упершыню з`явіліся бібліятэкары — супрацоўнікі “аптэкі для душы". Бібліятэчная справа на тую пару адрознівалася “адсталасцю": уваход у бібліятэку быў аздоблены золатам, а бібліятэкары адначасова былі і пісарамі, за што атрымоўвалі і двайны заробак. З тых часоў шмат чаго змянілася, адно засталося нязменным — бібліятэка для многіх па-ранейшаму з`яўляецца “аптэкай для душы".

У гасцёўню былі запрошаны людзі, якіх па праве можна назваць ветэранамі бібліятэчнай справы — Таццяна Усціновіч (былая загадчыца бібліятэкі, а цяпер — супрацоўнік філіяла), Лідзія Калганава. Ім былі прысвечаны віншавальныя радкі і падораны кветкі.

Падлічана, што за год кожнаму супрацоўніку прыходзіцца пераносіць дзесяць-дванаццаць тон кніг. А колькі такту, павагі патрабуе ад бібліятэкара абслугоўванне чытачоў!

Падчас свята было праведзена шмат віктарын і конкурсаў з удзелам гасцей. А потым па рашэнні супрацоўнікоў бібліятэкі былі ўзнагароджаны лепшыя чытачы ў наступных намінацыях:

Старэйшы чытач бібліятэкі — Любоў Лебедзева;

Мадам-дэтэктыў — Надзея Фаміна і Ніна Сімаш;

Міс-чараванне — Юлія Сакалова, Вераніка Брожкіна, Валянціна Дзегцярова;

Містэр-дапытлівасць — Андрэй Брожкін;

Ледзі-раман — Алеся Дегцярова, Тамара Брожкіна;

Мадам-эрудыт — Таццяна Грамыка, Таццяна Усціновіч;

Міс-разумніца — Аксана Сакалова;

Міс-рукадзельніца — Наталля Лапчык, Алена Сайкова, Марына Жукоўская.

Анатоль ВАЛАХАНОВІЧ

Першыя музейныя калекцыі ў Беларусі, як і ва ўсім свеце, збіраліся ў манастырах, храмах, у рэзідэнцыях феадалаў. Найбольш вядомымі ўладальнікамі асабістых музейных калекцый на тэрыторыі Беларусі ў XVI—XVII ст. з'яўляліся Радзівілы і Сапегі. На рубяжы XVIII—XIX ст. з'яўляюцца першыя ўстановы — пераважна ў вышэйшых і сярэдніх навучальных установах Полацка, Гродна і іншых гарадоў.

Цудоўная кніга гісторыі

Пасля ўзнікнення пытання аб адкрыцці музея ў Слуцку, была створана спецыяльная падкамісія, якая ў выніку сваёй дзейнасці сабрала найбольш каштоўныя рэчы: партрэты князёў Алелькавых, рукапіснае евангелле XVI ст., кальвінская біблія берасцейскага выдання, епітрахіль, посах і срэбраная рыза XVI ст. і інш. Усе помнікі былі сабраныя ў тры аддзелы: культурна-гістарычны, грамадска-эканамічны і прыродна-геаграфічны. Пры музеі была бібліятэка, а ў ёй — каштоўныя старасвецкія кнігі. Але ўсе гэтыя рэчы пазней, пасля закрыцця музея, апынуліся ў Мінску.

У верасні 1923 г. створана Слуцкае павятовае таварыства краязнаўства. Зацверджаны статут, праца значна ажывілася, але ненадоўга, бо многія члены камісіі, у тым ліку і загадчык музея ў лістападзе 1923г., пакінулі Слуцк.

У 1925 годзе аднавілася праца цяпер ужо Слуцкага раённага таварыства краязнаўства. З поспехам працавала таварыства, пашыраў сваю працу музей. У музейную секцыю запісалася 32 чалавекі, пераважна моладзь. Праца была распачата энергічна: набыта памяшканне пад музей, у якое перавезены рэшткі музейнага і кніжнага матэрыялаў. У гэты ж час апрацоўваліся гербарыі, прыводзілася ў парадак бібліятэка, складаліся каталогі. За гэты час фонды музея павялічыліся на 468 прадметаў і 630 кніг.

З 1927 года праўленнем таварыства былі асігнаваны грошы на музейнае абсталяванне: вітрыны, скрыні, шчыты і іншую мэблю. Такім чынам і да 28 сакавіка, да дня акруговага з'езду Саветаў, музей быў адчынены спачатку для агляду дэлегатаў, а потым і для грамады. З гэтага часу ён рэгулярна адчыняецца па два разы на тыдзень для агульнага агляду, праца секцыі не спыняецца, паступленне музейных прадметаў пашыраецца. У 1928 годзе музей налічваў 1766 экспанатаў, якія былі размешчаны па трох аддзелах: культурна-гістарычным, прыродна-геаграфічным, грамадска-эканамічным. Бібліятэка складвалася з 1354 кніг, сярод якіх было 260 старадрукаў. Таксама мелася некаторая колькасць рукапісаў X—XVII стст.. Пры музеі былі прэсы для сушкі раслін, компас і іншыя прылады. З перыядычных выданняў выпісваліся “Наш край" і газета “Савецкая Беларусь".

Але ў гэты перыяд у краіне адбываліся змены не толькі ў галіне гаспадаркі, але і культуры, у тым ліку і музейнай справе. У 1929 годзе пачаўся наступ на музеі, іх “мабілізавалі" на ўдзел у шматлікіх кампаніях па прапагандзе калектывізацыі, індустрыялізацыі, атэізму і г.д. У баку пачалі заставацца вывучэнне і захаванне помнікаў гісторыі і культуры — галоўнае ў існаванні любога музея.

1952 год. Менавіта з гэтага перыяду вядзе сваё летазлічэнне Слуцкі музей. У пастанове Савета Міністраў загадана некаторым гарвыканкамам, у тым ліку і Слуцкаму, забяспечыць стварэнне і адкрыццё краязнаўчага музея. У рашэнні выканкама Слуцкага гарадскога Савета дэпутатаў адзначана: “В связи с тем, что в городе Слуцке организован краеведческий музей, исполком Слуцкого городского Совета депутатов трудящихся решил: «Утвердить на должность директора Слуцкого краеведческого музея Ильенко Ивана Потаповича.»" Так нанава пачынаецца гісторыя Слуцкага краязнаўчага музея. Плошча яго была невялікая — два пакойчыкі ў гарадскім Доме культуры. Сярод першых экспанатаў — газета “Звязда" 1942 года выдання, лістоўкі падпольнай партызанскай друкарні, прадметы побыту, нацыянальнае аддзенне і інш.

У 1966 г. у сувязі са святкаваннем 850-годдзя горада пад экспазіцыю і фонды музея быў перададзены будынак былога дваранскага сходу, помнік архітэктуры канца XVIII стагоддзя. Менавіта з гэтага часу і пачынаецца развіццё музейнай справы на Случчыне пад кіраўніцтвам дырэктара Т. Савановіча, супрацоўнікаў Л. Шубы, Т. Кузьміцкай. У той час былі прывезены з Львова першыя фрагменты слуцкіх паясоў. У фондах музея з'явіліся старадаўнія дакументы, узнагароды розных часоў, драўляны і медны посуд мясцовых умельцаў і майстроў, фотаздымкі цікавых падзей Случчыны.

У 2001 годзе ў жыцці музея адбылася значная падзея. Наяўнасць у фондах музея багатай калекцыі “Этнаграфія" стала падставай для адкрыцця філіяла «Побыт сялян. XIX — пач. XX стагоддзя». На невялікай плошчы супрацоўнікі гэтага філіяла ў год наладжваюць 5—6 выстаў, на якіх можна пабачыць не толькі музейныя экспанаты, але і прадметы з асабістых калекцый народных майстроў Случчыны. У сувязі з вялікай выставачнай і навукова-асветніцкай працай з 2006 года філіял носіць назву “Музей этнаграфіі".

Міналі гады. Мяняліся дырэктары і супрацоўнікі. Кожны з іх уносіў свой уклад у папаўненне музейных фондаў.

У 1982 годзе дырэктарам Слуцкага краязнаўчага музея была назначана Валянціна Відлога, якая працавала на гэтай пасадзе звыш 20 гадоў. Пад яе кіраўніцтвам адбыўся капітальны рамонт будынка, поўнасцю замянілі экспазіцыю. Асаблівая ўвага ў гэты час надавалася камплектаванню фондаў. Супрацоўнікі музея на чале з дырэктарам выязджалі ў экспедыцыі па Слуцкім раёне. Дзякуючы гэтаму пачалі пашырацца калекцыі: дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, этнаграфіі, перспектыўнае развіццё атрымала калекцыя рэчаўных помнікаў, што паспрыяла вылучэнню з яе і ўзнікненню новых калекцый — шкла і фарфору, гадзіннікаў, самавараў і інш. У фондах музея з'явіліся новыя цікавыя музейныя прадметы — вырабы са шкла XVII — XIX стст., фарфор вядомых расійскіх фабрык Кузняцова, Барміна, Гарднера, Імператарскага завода ў Пецярбургу, саксонскі і мэйсанскі (Германія). Падчас правядзення археалагічных раскопак у фонды музея паступілі рэдкія знаходкі: унікальныя касцяныя і драўляныя шахматныя фігуркі, брытва XII ст, бронзавы наканечнік булавы, гіра кісцяня. У тыя часы, дзякуючы сувязям з вядомымі людзьмі — ураджэнцамі Случчыны ці іх роднымі, музейныя фонды папоўніліся матэрыяламі вучоных С. Косберга, А.Красоўскага і іншых.

У 80—90 гады работнікі музея наладзілі цеснае супрацоўніцтва з мастакамі, ураджэнцамі Случчыны — братамі У. Басалыгам і М. Басалыгам, Г. Скрыпнічэнкам, І. Пратасеняй, У. Вітко і іншымі. Менавіта ў пачатку дзевяностых гадоў В. Відлога і мастакі-землякі пачынаюць марыць аб адкрыцці ў родным Слуцку карціннай галерэі. Паралельна з камплектаваннем калекцыі “Жывапіс. Графіка" ў гэты час музей актыўна вёў збор твораў іканапісу.

У 2001 годзе ў жыцці музея адбылася значная падзея. Наяўнасць у фондах музея багатай калекцыі “Этнаграфія" стала падставай для адкрыцця філіяла «Побыт сялян. XIX — пач. XX стагоддзя». На невялікай плошчы супрацоўнікі гэтага філіяла ў год наладжваюць 5—6 выстаў, на якіх можна пабачыць не толькі музейныя экспанаты, але і прадметы з асабістых калекцый народных майстроў Случчыны. У сувязі з вялікай выставачнай і навукова-асветніцкай працай з 2006 года філіял носіць назву “Музей этнаграфіі".

Два гады таму збылася мара музейных супрацоўнікаў і мастакоў Случчыны. Напярэдадні святкавання ў Слуцку рэспубліканскага фестывалю-кірмашу «Дажынкі-2005" было прынята рашэнне аб адкрыцці яшчэ аднаго філіяла «Галерэя мастацтваў». З яго адкрыццём у краязнаўчага музея з'явілася магчымасць праводзіць адначасова некалькі выстаў твораў беларускіх мастакоў і фондавых калекцый.

Дзейнасць музея з кожным годам пашыраецца, папаўняюцца фонды ў сярэднім на 700—750 адзінак. На сучасны момант яны складаюць больш як 35 000 адзінак. Калектывам праводзіцца і вялікая навукова-асветніцкая работа. Супрацоўнікамі музея чытаюцца лекцыі (звыш 80), праводзяцца экскурсіі (прыкладна 700 у год), масавыя мерапрыемствы (40—50). Штогадова праходзяць цыклы сустрэч з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, з воінамі-інтэрнацыяналістамі.

У 2007г. дзяржаўная ўстанова “Слуцкі краязнаўчы музей" адзначае сваё 55-годдзе. У рамках святкавання калектыў музея на працягу года рэалізоўвае новыя выставачныя праекты, наладжвае цікавыя перасоўныя выставы, арганізуе творчыя сустрэчы з вядомымі людзьмі Случчыны.

Пра музеі кажуць, што яны падобны на вялікую цудоўную кнігу. І гэта сапраўды так. Творчы калектыў дзяржаўнай установы “Слуцкі краязнаўчы музей" імкнецца рабіць гэту кнігу такой, каб яна чыталася цікава і лёгка і перачытвалася па некалькі разоў.

Наталля СЕРЫК,
дырэктар
дзяржаўнай установы
“Слуцкі краязнаўчы музей"

У многіх мастакоў яго пакалення пачатак творчай дарогі падобны: дзіцячае памкненне маляваць, своечасова заахвочанае дарослымі; Рэспубліканская школа-інтэрнат па музыцы і выяўленчым мастацтве; наступныя пяць гадоў — навучанне ў Беларускім дзяржаўным тэатральна-мастацкім інстытуце... Гэты інстытут, які Уладзімір Крываблоцкі скончыў у 1976 годзе, цяпер завецца акадэміяй. І майстры, пад кіраўніцтвам якіх ён спасцігаў асновы сваёй унікальнай прафесіі — а вучыцца пашчасціла ў Гаўрылы Вашчанкі, Уладзіміра Стальмашонка, Анатоля Бараноўскага — захоплена сочаць за творчасцю свайго колішняга студэнта, ужо сталага калегі, старшыні секцыі манументальнага жывапісу Беларускага саюза мастакоў.

Моц зямлі, дух нябёсаў

Работы Уладзіміра Крываблоцкага здатныя глыбока ўразіць — нават узрушыць! — і спанатраных прафесіяналаў, і аматараў выяўленчага мастацтва. У гэтым пераканаліся наведнікі яго нядаўняй персанальнай выстаўкі, зладкаванай у сталічным Палацы мастацтва з нагоды 55-годдзя майстра і 30-годдзя яго творчай дзейнасці.

Выбітнай падзеяй стаўся ўжо сам факт правядзення такой выстаўкі. У беларускай арт-прасторы вернісажы манументалістаў — вялікая рэдкасць. Плён іх маштабнай арыгінальнай працы проста не ўпісваецца ў параметры традыцыйных экспазіцый выяўленчага мастацтва і перадаецца, можна сказаць, праз пасрэднікаў: эскізы роспісаў, фотаздымкі мазаічнага аздаблення будынкаў, вітражоў у інтэр'ерах... Думаю, далёка не кожны нават з нашых чытачоў, спанатраных у культуры, назаве імёны таленавітых айчынных прадстаўнікоў гэтага жанру. Аднак імя Уладзіміра Крываблоцкага апошнім часам на слыху: ён удзельнік і кіраўнік аўтарскага калектыву, які займаўся афармленнем знакамітага будынка Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

Безумоўна, у юбілейнай экспазіцыі адлюстравалася і гэтая старонка творчасці мастака, і яго ранейшыя манументальныя работы: роспіс "У імя жыцця на зямлі" ва Ушачах, мазаіка "Дрэва жыцця" на жылым доме ў Салігорску, вітраж "Песня пра Беларусь" у Мсціславе, мазаіка на фасадзе манастыра ў Жыровічах, сграфіта "Паэзія прыроды" ў Баранавічах... Але ў прасторы выставачнай залы стракатая і, вядома, па-свойму ўражлівая чарада фотарэпрадукцый выглядала сціплым дадаткам да магутных жывых палотнаў, энергіі якіх (і філасофіі якіх!), здавалася, было цесна ў сценах палаца.

Над прыступкамі лесвіцы, што вядзе на другі, галоўны паверх галерэі, быў прымацаваны амаль незаўважны плакат выстаўкі: з назвай-лозунгам "Захаваем мір на зямлі" ды каляровай выявай "Аўтапартрэта з дачкой", у якім (калі паглядзіш арыгінал) адчуваецца праніслівае абагульненне, натхнёнае хрысціянскай ісцінай і старажытнымі, магчыма, візантыйскімі, традыцыямі іканапісу. Плакат мог нейкім чынам настроіць на тэму прапанаванага мастацкага відовішча, але ці мог падрыхтаваць гледача да моцы ўздзеяння раскутага і актыўнага духу творцы! Мускулістыя постаці, звышчалавечыя пачуцці. Антычныя героі, тытаны, кентаўры, сімвалічныя птушкі, біблейскія анёлы... Незваротны рух "Кола часу", маўклівы філасофскі "Дыялог", шчымлівы одум "Анёла з вянком"... Трагічны немы крык "Рэквіема", распрасцёртага на цэнтральнай сцяне залы серыяй манументальных палотнаў: "Анёл жальбы", "Спаленыя ненароджаныя", "Азарычы. Сакавік 1944", "Генацыд"...

Глыбіня і маштабнасць вобразаў, шчодрасць духу і тэмперамент Уладзіміра Крываблоцкага, яго майстэрскі жывапіс — гэта ўражанні "навырост", крыніца тэм для роздуму і размоў.

Да арганізацыі выстаўкі спрычыніліся Міністэрства культуры краіны, Беларускі саюз мастакоў, Саюз музычных дзеячаў (мінская арганізацыя), а таксама Беларускі рэспубліканскі фонд "Узаемаразуменне і прымірэнне" ды ЗАТ "Трастбанк".

Святлана БЕРАСЦЕНЬ

На здымках: У. Крываблоцкі, яго работы і гледачы; сярод уражаных калег — Г. Вашчанка ды І. Міско.

Фота Кастуся Дробава

З ПОШТЫ «ЛіМа»

Слонімскія сустрэчы

Цёплым восеньскім днём дэлегацыя пісьменнікаў наведала старажытны Слонім, каб выступіць перад вайскоўцамі мясцовага гарнізона. Сёлета студыя ваенных пісьменнікаў і студыя ваенных мастакоў Цэнтральнага Дома афіцэраў Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь ужо наведалі каля дваццаці ваенных гарнізонаў: вайскоўцы чакаюць творцаў.

Слонімская сустрэча мела на мэце знаёмства з вайскоўцамі 11-й асобнай гвардзейскай Прыкарпацка-Берлінскай, Чырванасцяжнай механізіраванай брыгады. Наша творчая група ў складзе кіраўніка студыі ваенных мастакоў Мікалая Апіёка, пісьменнікаў Рыгора Сакалоўскага і Мікалая Іванова, бібліёграфа Ганны Плавінскай, атрымала "шчырую падзяку за вялікі ўклад у культурна-эстэтычнае і духоўна-маральнае выхаванне асабовага складу брыгады".

Час знаёмства з ваенным гарадком праляцеў непрыкметна. Мы даведаліся аб гісторыі стварэння 11-й мехбрыгады: спадкаемец 11-га гвардзейскага танкавага корпусу, які прайшоў слаўны баявы шлях ад Масквы да Берліна. Пачулі пра тое, што вайскоўцы вельмі ганарацца сваім гвардзейскім званнем і практычна штогод, удзельнічаючы ў буйных вайсковых вучэннях, паказваюць выдатную баявую вывучку.

А ў клубнай зале, дзе праходзіла сустрэча, сабралася больш як дзвесці, ваеннаслужачых. Пачаў сустрэчу ўступным словам намеснік камандзіра па ідэалагічнай рабоце палкоўнік Анатоль Русак. Мы, творцы, расказвалі, як сустракаем 90-годдзе Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, пазнаёмілі са сваімі творамі, прысвечанымі вайсковай тэме. Асабліва было прыемна бачыць на сустрэчы кадзетаў мясцовай школы: хлапчукі ў прыгожай форме не хавалі свайго захаплення, калі выступаў ветэран Вялікай Айчыннай вайны, паэт Мікалай Іваноў: перад імі, гатовымі ўсё жыццё прысвяціць вайсковай службе, быў сапраўдны франтавік, той, хто абараняў Радзіму ад ворага ў грозныя саракавыя!.. Ужо потым, калі закончылася творчая сустрэча, адзін з кадзетаў — Вадзім Мішукевіч, падышоў да нас і ўрачыста заверыў, што пасля школы будзе паступаць у ваенную акадэмію.

Яўген КАРШУКОЎ,
кіраўнік ваенна-мастацкай студыі пісьменнікаў

Духоўны храм

У выставачнай зале Лагойскага музея наладжана экспазіцыя іканапісных работ маладзечанскай мастачкі Ядвігі Сянько. З 1997 года Ядвіга Іванаўна супрацоўнічае з ЗАТ "Хрысціянская ініцыятыва" і стварае праваслаўныя абразы па бласлаўленні Мітрапаліта Філарэта. Піша яна таксама каталіцкія абразы і карціны на біблейскія тэмы.

"Аршанская Божая Маці", "Мінская Божая Маці", "Святая Таццяна", "Святы Панцеляймон"... — усе гэтыя вобразы ўзнёслыя, яскравыя, напоўненыя светлынёй і духоўнасцю. Выстаўка ікон Я. Сянько аб'ехала практычна ўсю краіну: цяпер яе чарговае экспанаванне па гарадах Міншчыны.

Ядвіга Сянько — прызнаны майстар стылю. Яе работы знаходзяцца ў прыватных калекцыях у Італіі, Германіі, Францыі, Расіі, краінах Балтыі.

Вольга ВЕЧАР

Дзве кнігі — дзве прэзентацыі

У Валожынскім раёне прайшоў абласны семінар дырэктараў школ Міншчыны па ландшафтным дызайне. Яго ўдзельнікі наведалі шэраг навучальных устаноў, на месцах азнаёміліся з добраўпарадкаваннем школьных тэрыторый, укараненнем на іх сучасных ландшафтных распрацовак. Шмат увагі на семінары было ўдзелена экалагічнаму выхаванню падрастаючага пакалення. Кіраўнікі школ і арганізатары прыродазнаўчай работы сярод школьнікаў вобласці паглядзелі, як гэтая справа наладжана на Валожыншчыне, падзяліліся ўласным вопытам.

На падагульняючым пасяджэнні ў Ракаўскай сярэдняй школе ў праграму семінара была ўключана і прэзентацыя "Чырвонай кнігі ў казках і вершах", якую нядаўна выпусціла ў свет рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва". З ёй прысутных пазнаёміў адзін з аўтараў зборніка пісьменнік Анатоль Зэкаў.

А праз колькі дзён у СШ № 157 г. Мінска ён прэзентаваў ужо выдадзеную згаданай установай уласную кнігу — чытанку-маляванку ў рыбацкіх скорагаворках "Мянтуз сярод мядуз". Вучні 3—4-ых класаў не толькі з задавальненнем слухалі госця, а і набылі прэзентуемую кнігу з яго аўтографам. Як, зрэшты, і дзесяцікласнікі гэтай школы, з якімі Анатоль Зэкаў сустрэўся ў той жа дзень. Праўда, апошнія прасілі аўтара падпісаць кнігу "Мянтуз сярод мядуз" сваім малодшым брацікам і сястрычкам.

Наталля АЛЯКСАНДРАВА

Стылёвая разнастайнасць

Днямі ў Гальшанскім архітэктурным комплексе XVIII стагоддзя адкрылася выстаўка творчых работ навучэнцаў аддзялення дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Маладзечанскай музычнай вучэльні імя Агінскага. У экспазіцыі — вучэбныя, курсавыя і дыпломныя работы, выкананыя ў розных кірунках: выцінанка, аплікацыя саломкай, разьба па дрэве, эксперыментальны тэкстыль і г.д.

Характэрнай асаблівасцю ўсіх твораў з'яўляецца тое, што яны маюць адзіныя стылёвыя рысы, што сведчыць пра сталую школу майстэрства. Прыкладам, сімвалічныя і выразныя выцінанкі Алесі Клемантовіч "Сусветнае дрэва", "Птушка шчасця", "Язычніцкія багі"...

Максім СТАЯН

Лім

Выходзіць з 1932 года
У 1982 годзе газета ўзнагароджана ордэнам Дружбы народаў

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі"

РВУ "Літаратура і Мастацтва"

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР
Анатоль КАЗЛОЎ

Рэдакцыйная рада:

Святлана БЕРАСЦЕНЬ
Леанід ГАЛУБОВІЧ
Віктар КАВАЛЁЎ
Янка ЛАЙКОЎ
Жана МАЛЕВІЧ
(адказны сакратар)
Мікола СТАНКЕВІЧ
(намеснік галоўнага рэдактара)
Ірына ШАЎЛЯКОВА

Адрас рэдакцыі:
220034, Мінск,
вул. Захарава, 19

Тэлефоны:
галоўны рэдактар — 284-66-73
намеснік галоўнага рэдактара — 284-66-73

Аддзелы:
публіцыстыкі — 284-66-71
пісьмаў і грамадскай думкі — 284-66-71
літаратурнага жыцця, крытыкі і бібліяграфіі — 284-44-04
прозы і паэзіі— 284-44-04
музыкі, тэатра, кіно і выяўленчага мастацтва — 284-82-04
бухгалтэрыя — 284-66-72
Тэл./факс — 284-66-73

E-mail: lim_new@mail.ru

Адрас у Інтэрнэце: www.lim.by

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.
Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра РВУ "Літаратура і Мастацтва".

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва".

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку"
г. Мінск,
пр. Незалежнасці, 79.

Індэкс 63856
Наклад 3417
Умоўна друк. арк. 3,72
Нумар падпісаны ў друк 21.11.2007 у 11.00

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715
Заказ — 6291

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ISSN 0024-4686